Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 СТУДЗЕНЯ 2009 г.
СУБОТА
№ 13
(26371)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дзеячам навукі, работнікам навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём беларускай навукі.

Наша краіна па праву ганарыцца вялікім адукацыйным і інтэлектуальным патэнцыялам. Вынікі адухоўленай творчай працы беларускіх даследчыкаў, дасягненні айчынных навуковых школ атрымалі шырокае прызнанне ў свеце.

У сучасных умовах навука і інавацыі асабліва патрэбныя нашаму грамадству. Толькі на іх аснове магчымае паспяховае вырашэнне маштабных задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, якія мы перад сабой паставілі.

Дзяржава чакае ад вас наватарскіх ідэй і эфектыўных распрацовак прарыўных інавацыйных тэхналогій ва ўсіх галінах народнагаспадарчага комплексу, засваення новых відаў прадукцыі, глыбокіх даследаванняў у сацыяльных і гуманітарных навуках.

Упэўнены, што і надалей вы будзеце пастаянна імкнуцца да дасягнення высокіх навуковых вынікаў, плённа працаваць на карысць любімай Радзімы.

Ад усёй душы жадаю вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, нязгаснай энергіі, няспыннага творчага пошуку, значных здзяйсненняў і адкрыццяў, поспехаў, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Калектыву Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Дарагія сябры!

Ад усёй душы віншую вас са знамянальным юбілеем — 80-годдзем з дня заснавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Разам з краінай ваша старэйшая навуковая ўстанова прайшла вялікі і слаўны шлях. За гады сваёй гісторыі акадэмія ператварылася ў буйны інтэлектуальны і гуманітарны цэнтр, унесла вялікі ўклад у развіццё айчыннай эканомікі, навукі і культуры. У яе сценах сфарміравалася плеяда выдатных вучоных, якія праславілі Беларусь.

Сёння акадэмія займае лідзіруючыя пазіцыі на многіх прыярытэтных напрамках даследаванняў, пашырае сувязь навукі з вытворчасцю. Мы па праву ганарымся дасягненнямі беларускіх вучоных, цэнім іх прафесіяналізм, творчую энергію і адданасць свайму прызванню.

Няхай ваш цудоўны калектыў і ў далейшым працуе з такім жа натхненнем і самаддачай, садзейнічаючы ўмацаванню Беларусі ў сусветнай супольнасці і прымнажэнню духоўных багаццяў нашага народа.

Жадаю вам моцнага здароўя, новых навуковых дасягненняў і яркіх адкрыццяў, шчасця і поспехаў у працы на карысць Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Новыя магчымасці для эканамічнага росту Беларусь звязвае з інтэнсіфікацыяй навуковай дзейнасці

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прадстаўнікамі айчыннай і замежнай навуковай грамадскасці.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што менавіта па гэтай прычыне айчынная навука ўсебакова падтрымліваецца дзяржавай. За апошнія 6 гадоў фінансавыя ўкладанні ў гэту сферу павялічыліся ў тры разы, дзейнічае сістэма падатковых ільгот для высокатэхналагічных і інавацыйных вытворчасцяў.

Прэзідэнт падкрэсліў, што прысутнасць на сустрэчы выдатных вучоных сучаснасці, прадстаўнікоў сусветнай і інтэлектуальнай эліты з 21 краіны свету сведчыць аб высокім міжнародным аўтарытэце беларускіх навуковых школ і ўзаемнай зацікаўленасці ў развіцці супрацоўніцтва.

У мерапрыемстве прымаюць удзел вучоныя з Расіі, Кітая, Румыніі, Чарнагорыі, Чэхіі, Літвы, Эстоніі, Балгарыі, Турцыі, ФРГ, ЗША, Францыі і іншых краін.

Кіраўнік дзяржавы лічыць беларускую навуку магутнай інтэлектуальнай індустрыяй, якая развіваецца перш за ўсё з прыцэлам на практыку, на ўкараненне вынікаў даследаванняў і распрацовак у вытворчасць і вучэбны працэс. У краіне сёння 340 навукова-даследчых арганізацый і амаль 25 тыс. навуковых работнікаў, аспірантаў і дактарантаў.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, у рэспубліцы створаны эфектыўныя механізмы стымулявання працы вучоных. Гэта прэзідэнцкія стыпендыі для паспяховых аспірантаў і таленавітых маладых вучоных, персанальныя надбаўкі ў памеры 12-разовай тарыфнай стаўкі першага разраду лепшым работнікам навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры, даплаты за акадэмічныя званні, надбаўкі за вучоныя ступені і званні. Акрамя таго, кіраўнікам навуковых арганізацый і ВНУ прадастаўлена права накіроўваць да 40 працэнтаў планавага фонду зарплаты на надбаўкі супрацоўнікам. На думку Прэзідэнта, усё гэта дае станоўчыя вынікі як у амаладжэнні кадраў, прытоку маладых, так і ў актывізацыі навуковых даследаванняў. Ён таксама дадаў, што стратэгія развіцця беларускай навукі была адобрана на Першым з'ездзе вучоных у лістападзе 2007 года, у рабоце якога прымалі ўдзел і многія з прысутных сёння вучоных.

У Беларусі эфектыўнасць навуковай дзейнасці павышаецца. Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем канстатаваў, што даследаванні ўсё больш арыентуюцца на канкрэтныя запатрабаванні прамысловасці і іншых галін эканомікі.

«Рэкамендацыі вучоных ляглі ў аснову важнейшых нацыянальных праграм апошняга дзесяцігоддзя: па атамнай энергетыцы (яе вянцом будзе будаўніцтва атамнай станцыі), касмасу, развіцці вёскі, малых і сярэдніх гарадоў, стварэнні рэсурсазберагальных тэхналогій», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт канстатаваў, што фундамент для пераходу да эканомікі ведаў закладзены ў Дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Дакумент прадугледжвае адкрыццё больш як 100 новых і мадэрнізацыю больш як 600 дзеючых прадпрыемстваў, стварэнне каля 400 сучасных вытворчасцяў.

Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што ў Беларусі ганарацца бясцэнным навуковым патэнцыялам, які ўдалося прымножыць за гады незалежнасці. У якасці сведчання ўзросшага грамадскага статусу навукі ў Беларусі Аляксандр Лукашэнка прывёў той факт, што ніводнае стратэгічнае рашэнне ў дзяржаве не прымаецца без рэкамендацый і заключэння вучоных. Акадэмія навук стала інтэлектуальным і экспертным цэнтрам, які адыгрывае важную ролю ў вызначэнні напрамкаў і канкрэтных шляхоў развіцця краіны, ядром сучаснай сістэмы генерацыі ведаў і інавацый, перакананы беларускі лідар.

Укараненне біятэхналогій, распрацоўка нанаматэрыялаў і элементаў сонечнай энергетыкі, развіццё інфармацыйных і аэракасмічных тэхналогій з'яўляюцца важнейшымі напрамкамі навуковай дзейнасці ў Беларусі.

Прэзідэнт выказаў перакананасць у тым, што ключом да вырашэння многіх праблем, якія стаяць перад чалавецтвам, з'яўляецца аб'яднанне намаганняў, творчых і тэхналагічных магчымасцяў беларускіх і замежных вучоных.

Партнёрамі Нацыянальнай акадэміі навук з'яўляюцца навуковыя цэнтры з 40 дзяржаў. У прыватнасці, сумесна з Расійскай акадэміяй навук ствараецца шматфункцыянальная касмічная сістэма спадарожнікаў новага пакалення, распрацоўваюцца і іншыя перспектыўныя навуковыя напрамкі. Шматгадовае цеснае супрацоўніцтва звязвае НАН з Нацыянальнай акадэміяй навук Украіны. Беларускія вучоныя наладзілі прадукцыйныя кантакты з акадэмічнымі структурамі ўсіх дзяржаў СНД, з навуковымі цэнтрамі Кітая, Францыі, Германіі і ЗША.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што сумесныя праекты належаць да найбольш актуальных і запатрабаваных на сусветным рынку галін. Па шэрагу міжнародных праектаў айчынныя вучоныя працуюць над праблемамі знішчэння небяспечных хімічных рэчываў з выкарыстаннем нізкатэмпературнай плазмы. «Гэта істотна знізіць рызыкі заражэння тэрыторый еўрапейскіх і іншых краін небяспечнымі хімічнымі рэчывамі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Навука павінна больш актыўна ўключацца ў вырашэнне праблем сусветнага крызісу. Кіраўнік дзяржавы выказаў думку, што сусветны крызіс пройдзе хутка, і Беларусь павінна прапанаваць сусветнай супольнасці той прадукт, без якога людзі ў свеце не абыдуцца. У сувязі з гэтым, паводле слоў Прэзідэнта, у шмат разоў узрастае роля вучоных.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь заўсёды жыла выключна за кошт сваіх рэсурсаў, працавітасці, мадэлі, якую выпрацавала. Паводле яго слоў, мадэль развіцця Беларусі адабраюць сёння і ў ЗША, і многія бяруць яе на ўзбраенне.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка выказаў незадавальненне вынікамі дзейнасці вучоных. «Мне хацелася б большага ад дзейнасці вучоных. Хацелася б большай дынамікі, своечасовых адказаў на выклікі сучаснасці. Напрыклад, выбухнуў сусветны фінансавы, а затым і эканамічны крызісы. Што сказалі і што могуць сёння сказаць пра яго вучоныя: глыбіня крызісу, наступствы, тэрміны. Вучоныя так і не сказалі тут сваё слова», — адзначыў Прэзідэнт.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Андрэй КАБЯКОЎ:

«МАСАВЫХ СКАРАЧЭННЯЎ І ЗВАЛЬНЕННЯЎ НЕ БУДЗЕ...»

Дастаткова стабільнай, але нясімметрычна прастой назваў сітуацыю ў айчыннай эканоміцы **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ** на сустрэчы з журналістамі ў Мінску. Паводле яго слоў, яна і не можа быць простай, калі ў іншых краінах ёсць складанасці. «Тым не менш, — запэўніў віцэ-прэм'ер, — мы разумеем, як у гэтай сітуацыі змагацца з праблемамі, якія рабіць захады з тым, каб наша эканоміка развівалася і не губляла сваёй сацыяльнай арыентацыі».

Пры ацэнцы сённяшняй сітуацыі, падкрэсліў Андрэй Кабякоў, трэба ўлічваць, што эканоміка Беларусі з'яўляецца вельмі адкрытай і інтэграванай у сістэму сусветных гаспадарчых сувязяў. Таму крызісныя з'явы, што сталі развівацца вакол нас, закранаюць і рэспубліку. У нашай эканоміцы яны пачалі праяўляцца літаральна ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада мінулага года, у іншых краінах СНД, якія актыўна працавалі на замежных рынках каштоўных папер — з восені 2007 года.

Аналізуючы леташнія вынікі развіцця беларускай эканомікі, Андрэй Кабякоў зазначыў, што запас трываласці ў яе дастаткова добры. «Эканоміка ў 2008 годзе развівалася вельмі дынамічна. Паводле папярэдніх звестак, рост ВУП склаў 110 працэнтаў, прамысловасць вырасла на 110,8 працэнта, сельская гаспадарка — на 108,9, інвестыцыі — на 123,1 працэнта. Жылля мы пабудавалі амаль па верхняй мяжы прагнозу (прагноз на год — 4700—5200 тысяч кв.м) — 5146 тысяч кв.м». Што ж датычыцца пачатку гэтага года, то чакаецца, што тэмпы росту эканомікі крыху запаволяцца. Зараз, паведаміў віцэ-прэм'ер, ацэньваецца глыбіня гэтага запавольвання. «Тым больш, — заўважыў Андрэй Кабякоў, — што ацэнка заснаваная не толькі на ацэнцы айчынных вытворчасцяў, але і на ацэнцы магчымасцяў нашых асноўных эканамічных партнёраў. Пакуль падстаў для перагляду гадавых паказчыкаў прагнозу няма, мы сёлета забяспечым рост эканомікі».

Закранаючы праблемныя моманты, вырашэннем якіх сёння вымушаны займацца ў краіне, Андрэй Кабякоў згадаў аб тым, што ў свеце цяпер адбываецца не толькі падзенне попыту на прадукцыю, але і падзенне цэнаў. З аднаго боку, калі цэны зніжаюцца, што тут дрэннага?.. З іншага — для вытворцаў гэта не заўсёды прыводзіць да добрых вынікаў. Паводле слоў Андрэя Кабякова, у рэспубліцы большасць прадпрыемстваў набывалі сыравіну і матэрыялы, рабілі вытворчыя запасы ў той час, калі цэны былі адносна высокімі. Цяпер жа цэны на сыравіну, прадукцыю ўпалі, а затраты засталіся пакуль ранейшымі. «Неабходна зрабіць па меншай меры 2-3 гандлёвыя абароты, каб прадаць сваю прадукцыю па цэнах, магчыма, ніжэйшых за сабекошт, сфарміраваным са старых цэнаў з тым, каб набыць сыравіну і матэрыялы па новых нізкіх цэнах і забяспечыць нармальны ўзнаўленчы цыкл», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Андрэй Кабякоў распавёў таксама аб асноўных напрамках работы, якая вядзецца ў рэспубліцы па пераадоленні негатыўных наступстваў фінансава-эканамічнага крызісу. Па-першае, яшчэ летась напачатку лістапада была выпрацавана сістэма захадаў, якія павінны забяспечваць эканамічную бяспеку краіны ва ўмовах фінансавага крызісу. Пры Урадзе, міністэрствах, у рэгіёнах і валаўтвараль-ных прадпрыемствах створаны рабочыя групы, якія займаюцца маніторынгам сітуацыі на ўнутраным і знешніх рынках і пастаянна прашэння ўмоў вядзення бізнэсу. Тут шэраг мераў было прынята ў 2007 годзе і летась. А ў снежні падпісана чарговая сістэма захадаў для паляпшэння ўмоў вядзення бізнэсу і лібералізацыю эканомікі, якая практычна рэалізаваная. Акрамя таго, 13 студзеня Урад і Адміністрацыя Прэзідэнта з удзелам Нацыянальнага банка распрацавалі

Фота БЕЛТА.

дуцыруюць прыняцце рашэнняў, што дазваляюць адаптаваць эканоміку да цяперашніх умоў. Таксама быў прыняты шэраг першачарговых захадаў, у прыватнасці, рашэнне па гарантаванні ўкладаў насельніцтва, па павелічэнні статутных фондаў дзяржаўных сістэмаўтваральных банкаў, зроблены непапулярны, але вымушаны крок па абмежаванні на ажыццяўленне авансавых плацяжоў па імпарце. Між іншым, гаворачы пра гэты крок, Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што ў Беларусі не такая вялікая эканоміка, каб крэдытаваць усіх суседзяў, якія з намі гандлююць.

Другі напрамак — захады па забеспячэнні стабільнасці працы валаўтвараль-ных і іншых арганізацый рэальнага сектара эканомікі. Тут пры распрацоўцы захадаў быў уліч-аны, акрамя ўсяго, і вопыт антыкрызісных рашэнняў, прынятых апошнім часам Расіяй, Казахстанам, іншымі краінамі. Прынятыя захады перш за ўсё накіраваныя на стымуляванне росту аб'ёму продажаў, на забеспячэнне рэальнага сектара эканомікі крэдытнымі рэсурсамі, на падтрымку і развіццё тавараправодных сетак за мяжой, на аптымізацыю затрат і аказанне дзяржаўнай падтрымкі. У межах апошняй, напрыклад, кампенсацыя за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі і інш.

Лібералізацыя ўмоў ажыццяўлення дзейнасці на тэрыторыі нашай рэспублікі — яшчэ адзін напрамак, па якім вядзецца сістэмная праца. Прычым, запэўніў Андрэй Кабякоў, лібералізацыя — гэта не нейкая кампанейшчына: працай па гэтым напрамку ў рэспубліцы займаюцца з восені 2007 года, калі ўпершыню была пастаўлена задача аб неабходнасці паляпчарговы план першачарговых захадаў па лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці ў гэтым годзе («Звязда» падрабязна пра гэта інфармавала ў № 9 за 20.01.2009 г.).

Андрэй Кабякоў пацвердзіў інфармацыю наконт таго, што на некаторых прадпрыемствах краіны сёння адзначаецца няпоўная занятасць работнікаў. Паводле яго слоў, гэта адзін са спосабаў, якія могуць цяпер выкарыстоўваць прадпрыемствы, што трапілі ў цяжкае становішча. Разам з тым, частковую занятасць ён назваў часовым варыянтам, які магчымы толькі ў тым выпадку, калі кіраўніцтва прадпрыемства дакладна бачыць і іншыя шляхі выхаду з крызісу, з прымяненнем усіх інструментаў, у тым ліку і з выкарыстаннем падтрымкі дзяржавы, каб узнавіць нармальны рэжым працы. Віцэ-прэм'ер упэўнены, што масавых скарачэнняў і звальненняў у нас не будзе, таму што ў краіне сацыяльна арыентаваная эканоміка, і людзі ніколі не заставаліся без падтрымкі.

Развенчваючы апасенні наконт таго, што беларускі рубель будзе дэвальвавацца ўслед за расійскім, віцэ-прэм'ер паведаміў, што курс хістання нацыянальнай валюты, як і запланавана, застанецца на працягу года ў межах плюс/мінус 5 працэнтаў да валютнага кошыка. Ён нагадаў, што курс беларускага рубля прывязаны да трох валют у роўных далях, і калі адбудзецца на сусветных валютных рынках рост адной з іх, то адпаведна курс іншай будзе зніжацца. А вось стаўку, якую насельніцтва робіць менавіта на рост курсу долара, віцэ-прэм'ер лічыць не зусім апраўданай. «Сёння ён расце, а потым можа ўпасці, — лічыць ён. — Не думаю, што пасля таго, як Барак Абама прыступіў да выканання сваіх абавязкаў, прыдумаюць іншыя механізмы, акрамя ўліванне дадатковых грошай у эканоміку, каб выратаваць сваю фінансавую сістэму. А любое ўліванне прывядзіць да абясцэнівання таго, што ўліваецца».

Каментуючы пытанне пра цэны для Беларусі на газ, Андрэй Кабякоў заўважыў, што ў краіне цэнаўтварэнне на «блакітнае паліва» ажыццяўляецца па рынкавай формуле, якая прывязана да цэнаў на нафтапрадукты. З улікам таго, што, паводле прагнозаў, цана нафты ў сярэднім па годзе складзе не больш за 50 долараў за барэль, цана на газ для айчынных суб'ектаў гаспадарання сёлета можа скласці 175 долараў за тысячу кубаметраў. Сярэдняя ж цана расійскага газу для Беларусі на 2009 год ацэньваецца ў 148 долараў за 1 тысячу кубічных метраў.

Яшчэ адна добрая навіна, якую агучыў віцэ-прэм'ер, — атрыманне ў лютым нашай краінай другой траншы крэдыту з Расіі на 1 млрд долараў: РФ пацвердзіла сваю гатоўнасць зрабіць гэта. «Учора мы з А. Кудрыным абмяркоўвалі падрыхтоўку адпаведнага крэдытнага пагаднення па атрыманні другога мільярда долараў у лютым. Ёсць адпаведнае пацвярджэнне нашых партнёраў з працягам супрацоўніцтва, аб якім мы дамовіліся раней», — паведаміў Андрэй Кабякоў. Акрамя таго, працягваюцца і перамовы аб прадстаўленні Расіяй крэдыту на 100 мільярдаў расійскіх рублёў. Як падкрэсліў віцэ-прэм'ер, размова не ідзе аб крэдытаванні дэфіцыту плацежнага балансу, паколькі наша краіна ўжо рэалізуе захады па стварэнні неабходнай «падушкі бяспекі». Гэтыя грошы разглядаюцца як укладанне ў пашырэнне альбо як мінімум утрыманне ўзаемнага гандлю з Расіяй. «Гэтыя сродкі патрэбныя, каб падтрымаць суб'екты гаспадарання нашых краін, якія зацікаўленыя ў супрацоўніцтве, але на сённяшні дзень не могуць атрымаць крэдыт па прымальных стаўках», — патлумачыў Андрэй Кабякоў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Грып «прычапіўся» праз заходнія межы

Ліда і Гродна сталі першымі гарадамі ў нашай краіне, якія здаліся эпідэміі грыпу. Трохразовае перавышэнне эпідпарога рэгістравалася ў гэтых гарадах з 19 па 21 студзеня, таму 22 студзеня там была афіцыйна аб'яўлена эпідэмія грыпу і пачаў разгортвацца комплекс процізэпідэмічных мераў. Да таго ж эпідэміяй ужо ахоплены чатыры раёны: Шаркоўшчынскі, Навагрудскі, Лідскі і Гродзенскі. Вучэбны працэс спынены ў 28 школах: у Гродзенскім раёне на вымушаныя канікулы адправіліся вучні 6 школ, у Шаркоўшчынскім — 7, Драгічынскім — 4. Па 3 школы закрыліся ў Пастаўскім і Навагрудскім раёнах, 2 — у Пухавіцкім раёне і па адной — у Браслаўскім, Гомельскім і Іўеўскім раёнах. Вучэбны працэс спыняецца, калі колькасць захварэлых перавышае 30 працэнтаў ад агульнага кантынгенту. Затое на гэтым тыдні аднавіліся заняткі ў адной школе, размешчанай на тэрыторыі Пінскага раёна, вучні якой загрыпавалі раней.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Доктар адкажа

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

26 студзеня — галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Віктарыя Пятроўна ВАЙЦЯХОВІЧ.

27 студзеня — галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Алена Уладзіміраўна ГЛУШАНІНА.

28 студзеня — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Яўген Іванавіч НОВІКАЎ.

29 студзеня — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі Людміла Антонаўна ПАШКЕВІЧ.

30 студзеня — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гематалогіі і трансфузіялогіі Сяргей Пятровіч ЛЯШЧУК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

З НАЖОМ НА ДЗЯЦЕЙ

Пяць чалавек загінулі ў выніку панажоўшчыны ў бельгійскім дзіцячым садку.

Трагедыя адбылася ў фламандскім горадзе Дэндэрмонд, што ў 30 кіламетрах на захадзе ад сталіцы Бельгіі. Там узброены нажом мужчына ўварваўся ў адзін з дзіцячых садкоў. Паводле папярэдніх звестак, зламыснік забіў двух дарослых і траіх дзяцей. Яшчэ 20 малых былі параненыя. Невядомы спрабаваў уцячы на веласіпедзе, але быў затрыманы паліцыяй.

БРЫТАНСКІЯ СЕМ'І ПАЗБАЎЛЯЮЦЦА ЖЫЛЛЯ З-ЗА ДАЎГОЎ ПА ІПАТЭЦЫ

Колькасць выпадкаў адчужэння нерухомасці ў разлік пагашэння запазычанасці па іпатэцы ў Вялікабрытаніі на працягу мінулага года павялічыўся на 92 працэнты.

Статыстыка паказвае, што сёння кожныя дзесяць хвілін адна брытанская сям'я пазбаўляецца сваёй нерухомасці. Толькі ў трэцім квартале 2008 года банкі адабралі за даўгі больш 13,1 тысячы дамоў. Пры гэтым усе эканамічныя паказчыкі сведчаць пра тое, што ў будучыні сітуацыя будзе толькі пагаршацца. Сёння пратэрміноўку выплат па сваім іпатэчным крэдыце маюць 340 тысяч брытанскіх пазычальнікаў. Пры гэтым памер даўгоў 75 тысяч сем'яў настолькі вялікі, што банкі могуць запатрабаваць закладзенае па крэдыце жыллё ўжо ў 2009 годзе. Асноўнай прычынай такой сітуацыі сталі рэкордныя тэмпы росту беспрацоўя ў краіне — кожны дзень аб сваім закрыцці аб'яўляюць 85 брытанскіх фірмаў.

ЗВАЛЬНЕННІ ВЫКЛІКАЮЦЬ КРАДЗЯЖЫ

Звольненыя ў сувязі з эканамічным крызісам супрацоўнікі, якія работадаўцы часцяком пакідаюць без прызначаных выплат па скарачэнні, у адплату нярэдка забіраюць з офісаў прыналежныя кампаніі рэчы.

Як высветліла падчас апытання газета «Труд», пакінутыя без працы людзі прысвойваюць камп'ютары і кнігі, а часам не грэбуюць нават канцтаварамі. Напрыклад, менеджар Андрэй прызнаўся, што ў апошні дзень вынес з працы ноўтбук, супрацоўнік банка Алена расказала, што знесла з офіса пачак паперы для ксеракса, а скратарка Аліна забрала з офіса ўсе канцтавары, даверху напакаваўшы багажнік свайго аўтамабіля ўсякімі арганайзерамі, папкамі і штодзённікамі, не дзеля выгады, а таму што пакрыўдзілася на начальніка за звальненне, праўда, зараз яна не ведае, куды іх падзець. Некаторыя выкрадаюць у былых работадаўцаў «вечныя каштоўнасці», так, праграміст Яўген пажывіўся ў начальніка на працы двума тамамі сачыненняў Джэка Лондана.

БЫЛЫ ВЯЗЕНЬ УЗНАЧАЛІЎ «АЛЬ-КАЕДУ»

Былы зняволены турмы Гуантанама саудавец Саід Алі аль-Шыхіры пасля таго, як у 2007 годзе выйшаў на волю, узначаліў аддзяленне «Аль-Каеды» у Емене.

Больш за тое, паводле некаторых звестак, узначаліўшы гэта аддзяленне, ён стаў адным з галоўных арганізатараў тэрактаў, якія адбыліся ў верасні 2008 года каля амерыканскага пасольства ў Сане, у выніку якіх загінулі 16 чалавек. Як адзначае The New York Times, выпадак з Саідам Алі аль-Шыхіры можа стаць дадатковай падставай для крытыкаў прэзідэнта Барака Абамы, які 22 студзеня падпісаў указ аб закрыцці турмы для падазраваных у тэрарызме на базе ў Гуантанама.

ПАСВЕДЧАННЕ ДЛЯ СМІ

Перарэгістрацыя ўсіх мас-медыя на працягу гэтага года абавязковая і бясплатная

Новыя правілы гульні для мас-медыя пачнуць дзейнічаць ужо ў лютым, калі адзін з самых гучных дакументаў мінулага года ўступіць у сілу. «Ужо прынятыя неабходныя падзаконныя акты. Мы гатовы да работы ва ўмовах новага заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі», — запэўніў міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ падчас пасяджэння калегіі міністэрства.

Ён заўважыў, што закон меў шырокі рэзананс у грамадстве. «У нас шмат апанентаў. Мы гатовы да дыскусій і бачым, што падчас гэтых абмеркаванняў прымаюцца ўзаемапрымальныя рашэнні». У якасці прыкладу міністр прывёў пытанне аб рэгуляванні ў сферы інтэрнэту, па якім доўга вяліся дыскусіі, у прыватнасці, з еўрапейскімі партнёрамі. «Аб здані, якая блукала тут — магчымым рэгуляванні, рэгістраванні — трэба забыць. У пытаннях узаемаадносінаў з інтэрнэт — сродкамі масавай інфармацыі мы будзем кіравацца агульнаеўрапейскімі нормамі», — рэзюмаваў Уладзімір Русакевіч. Літаральна ўчора падпісаная ім пастанова аб парадку перарэгістрацыі СМІ прадугледжвае бясплатнае правядзенне працэдуры. Заснавальніку дастаткова даслаць па пошце ў Міністэрства інфармацыі запоўненую анкету, каб на працягу трох дзён атрымаць новае пасведчанне. Нагадаем, што працэдуру давядзецца прайсці ў абавязковым парадку ўсім масмедыя — так прадугледжана ў новым законе.

Ацэньваючы работу ў розных кірунках галіны, міністр інфармацыі са шкадаваннем канстатаваў, што выданне беларускамоўнай літаратуры ў Беларусі зніжаецца. Так, летась выпушчана 879 найменняў кніг і брашур трохмільённым тыражом. Звяртаючыся да калег, Уладзімір Русакевіч падкрэсліў: «Наша задача — рабіць усё, каб чыталі літаратуру на беларускай мове!». Ён прыгадаў, што іншы раз «трэба пад пугай прымушаць выпускаць каляндар на беларускай мове». «Трэба патрыятызму больш», — дадаў выступоўца.

Ала МАЧАЛАВА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению ЧПУП «Борисовский комбинат текстильных материалов Белкоопсоюза»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складского комплекса в составе: здания склада общ. пл. 9929,8 кв.м (заходит внутрь ж/д ветка), административно-бытовой корпус 798 кв.м, мехмастерская складских помещений 125 кв.м, насосная складских помещений 84 кв.м, подстанция складских помещений 50 кв.м, трасформаторная подстанция 28 кв.м, водонапорная башня складских помещений 7,3 кв.м, проходная 23 кв.м расположенного по адресу: Борисовский р-н, в районе д. Ланковщина (автотрасса Москва–Брест, ст. Новосады). Имеется ж/д ветка. Начальная цена с НДС – 5 428 000 000 бел. руб. Задаток 250 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Продажа здания склада осуществляется под контролем судебного исполнителя в рамках исполнительного производства. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект производится в следующие сроки: 50 % от стоимости объекта — в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи, остальные 50 % — в течение 60 календарных дней с указанной даты. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению Борисовского райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **24.02.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.02.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015.

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже двухкомнатной квартиры № 127, расположенной по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь – 46,9 кв. м, жилая площадь – 26,8 кв. м).

Начальная цена 191 819 420 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 19 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Аукцион состоится **10 февраля 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **09 февраля 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017)227 48 36.

УНП 190398583.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.01.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 695,00
1 еўра	3460,92
1 латвійскі лат	4911,16
1 літоўскі літ	1 002,16
1 чэшская крона	122,94
1 польскі злоты	788,17
1 расійскі рубель	81,93
1 украінская грыўня	343,09

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	32,8926
10 UAH	41,8747
1000 BYR	12,2459
EUR	42,3986

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Новыя магчымасці для эканамічнага росту Беларусь звязвае з інтэнсіфікацыяй навуковай дзейнасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле яго слоў, сёння ў свеце загаварылі, што з сярэдзіны гэтага года — студзеня будучага пачнецца ўздым. «Ніхто не ведае глыбіні крызісу. Чаму мы яго не прадбачылі? Чаму эканамісты, фінансісты, вучоныя, у тым ліку і Нацыянальнай акадэміі навук, гэтага не прадбачылі, не папярэдзілі і, галоўнае, што яны цяпер ніякіх рэкамендацый не даюць. І мы вымушаны дзейнічаць наўгад», — звярнуўся да вучоных кіраўнік дзяржавы. Ён таксама дадаў, што ў Беларусі ёсць праблемныя пытанні, па якіх хацелася б большай рэзультатыўнасці і дынамікі ад Акадэміі навук і, у прыватнасці, ад вучоных. «Хацелася б больш сучасных новых ідэй», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У Беларусі падтрымаюць ініцыятывы беларускіх і расійскіх вучоных, запатрабаваныя эканомікай і грамадствам.

«Мы гатовы падтрымліваць праграмы, якія сёння патрэбны, асабліва запатрабаваныя і грамадствам, і эканомікай. Мы можам прапанаваць расійскім вучоным удзел у беларускіх праграмах, забяспечым фінансаванне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Як было адзначана вучонымі ў час сустрэчы, навуковыя колы Сібіры рыхтуюць беларускаму і расійскаму кіраўніцтву прапановы ў сферы энергетыкі і выкарыстання мясцовых энергетычных рэсурсаў, якія могуць садзейнічаць вырашэнню многіх праблем.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі навука — «гэта адна з асноў дзяржавы і дзяржаўнасці». «Навука ў нашай рэспубліцы адыгрывае значную ролю, і мы ў яе укладаем сродкі. У Беларусі няма тых прыродных рэсурсаў, які маюць іншыя дзяржавы, мы заўсёды рабілі ўпор на інтэлект нацыі і працавітасць людзей», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды вучоным з Расіі, Украіны і Кітая, якім належыць асаблівая роля ў развіцці супрацоўніцтва з беларускімі навуковымі арганізацыямі.

Уручаючы ордэн Дружбы народаў лаўрэату Нобелеўскай прэміі, віцэ-прэзідэнту Расійскай акадэміі навук акадэміку Жарэсу Алфёраву, кіраўнік дзяржавы адзначыў яго вялікі ўклад не толькі ў развіццё навуковых сувязяў Расіі і Беларусі, але і садзейнічанне ўсебаковаму супрацоўніцтву і яднанню двух народаў.

У сваю чаргу Жарэс Алфёраў звярнуў увагу на вялікія дасягненні беларускай навукі і падкрэсліў, што супрацоўніцтва з беларускімі вучонымі, з прадпрыемствамі рэальна становіцца ўзаемавыгаднym для навукова-тэхнічнай супольнасці многіх краін. На яго думку, беларуская навука сёння мае самае важнае: яна запатрабавана эканомікай і грамадствам. І сёння ў часы сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу выхад з гэтай сітуацыі толькі ў развіцці навукі, навукова-тэхнічнага патэнцыялу, у развіцці эканомікі, заснаванай на высокіх тэхналогіях, лічыць ён.

Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокую ўдзячнасць прэзідэнту Нацыянальнай акадэміі навук Украіны акадэміку Барысу Патону, які таксама ўдастоены ордэна Дружбы народаў.

Выступаючы са словам у адказ, акадэмік Барыс Патон адзначыў вялікі ўклад беларускай дзяржавы ў падтрымку і развіццё навукі. Ён лічыць вялікім дасягненнем, што Беларусь захавала Акадэмію навук, развівае яе, захаваўшы многія напрамкі, якія з'яўляюцца вельмі важнымі для ўсёй навукі, эканомікі і сацыяльнай сферы, у прыватнасці, электроніку, машынабудаванне, нанатэхналогіі, агракомплекс і г.д.

За вялікі ўклад у распрацоўку сумесных беларуска-расійскіх навукаёмістых вытворчасцяў медаль Францыска Скарыны ўручана і дырэктару Інстытута каталізу Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук акадэміку Валянціну Пармону.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў медаль Францыска Скарыны прэзідэнту Акадэміі навук правінцыі Шаньдун Лі Хайцзяню, які адыграў вызначальную ролю ў пабудове стратэгічнага навукова-тэхнічнага партнёрства Беларусі і Кітая.

Лі Хайцзянь адзначыў вялікую рэзультатыўнасць супрацоўніцтва кітайскай правінцыі Шаньдун і Беларусі. Паводле яго слоў, сусветны крызіс у нейкай ступені падштурхнуў да аб'яднання намаганняў вучоных і пошуку новых ідэй, дадаўшы, што вучоныя ўжо абмяркоўвалі, як праз навуковыя распрацоўкі можна процістаяць крызісу. Ён таксама высока ацаніў праграму інавацыйнага развіцця Беларусі.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Прамысловасць Беларусі павінна скарыстаць новыя магчымасці на рынку

Прамысловасць Беларусі павінна выкарыстаць новыя магчымасці, якія адкрыліся на рынку ў сувязі з уплывам сусветнага фінансавага крызісу. Аб гэтым заявіў у Мінску прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі пры наведванні ААТ «Беларускія шпалеры», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік урада адзначыў, што «выраблянь трэба столькі, колькі можам прадаць, а прадаць сёння мы можам больш, чым раней».

Беларусь як невялікая кампактная дзяржава з экспартаарыентаванай эканомікай павінна цяпер адчуць сваю перавагу ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу. «Калі мы бачым, як у іншых краінах закрываюцца прадпрыемствы, мы можам і павінны выкарыстаць гэту сітуацыю», — сказаў Сяргей Сідорскі. Для гэтага неабходна агрэсіўная экспартная стратэгія. Прадпрыемствы павінны мець надзейную збытавую сетку за мяжой, у тым ліку і ўласную са стопрацэнтным капіталам. Пры гэтым нельга забываць і аб унутраным рынку. Ва ўмовах, калі закрыліся замежныя прадпрыемствы, што раней пастаўлялі нам свае прадукцыю, нашы вытворцы маюць магчымасць цяпер запоўніць гэту нішу, падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Такім шляхам можа вырашацца і праблема імпартазамяшчэння. Знаёмячыся з работай ААТ «Беларускія шпалеры», прэм'ер-міністр запатрабаваў павялічыць пастаўкі на ўнутраны рынак. У мінулым годзе ў Беларусь было пастаўлена шпалер на $30 млн. Гэту долю неабходна пацясніць айчыннай прадукцыяй, пакідаючы пры гэтым шырокі выбар для спажыўцоў. Пакуль жа, паводле ацэнкі прэм'ера, айчынныя вытворцы шпалер «на сваім рынку не гандлююць», іх выцясняюць замежныя кампаніі.

Для павелічэння экспарту прынцыпова важна пашырэнне ўласнай тавараправоднай сеткі. «Галоўнае, каб гэта былі нашы прадстаўніцтвы за мяжой і каб яны гандлявалі нашай прадукцыяй. Тады будуць вынікі», — адзначыў прэм'ер. Паводле яго слоў, «мы можам сёння прысутнічаць са сваімі аб'ёмамі на знешніх рынках, калі выбудуем стратэгію продажаў».

Вытворцы не павінны спасылацца на тое, што іх прадукцыю не купляюць у сувязі з крызісам. «Значыць, няправільна працуеце, няма ў прадпрыемстваў стратэгіі. Няма дыверсіфікацыі экспарту: калі ў адным месцы здарыўся правал, трэба выкарыстоўваць іншую нішу. І такіх ніш павінна быць шмат, тады будзе канкурэнцыя», — адзначыў Сяргей Сідорскі. Кіраўнік урада таксама падкрэсліў, што ўсю гэту работу трэба правесці хутка, на працягу першага квартала.

ЗАРОБКІ ПАВЯЛІЧАЦЦА?

Мінфін лічыць захаванне ўзроўню даходаў у бюджэтным сектары адной з прыярытэтных задач

Бюджэтны кодэкс уступіў у сілу з першага дня новага года, так што беларусы ўжо амаль месяц жывуць ва ўмовах сучаснага этапа бюджэтнай палітыкі. Дакумент прадугледжвае фарміраванне сярэднетэрміновага фінансавага прагнозу, праграмна-мэтавы метад бюджэтнага планавання, замацоўвае выразную сістэму размеркавання даходаў паміж узроўнямі бюджэту, размежавання расходных абавязкаў усіх узроўняў бюджэту і даходных паўнамоцтваў. Адбудзецца і ўмацаванне кантролю за эфектыўным выкарыстаннем бюджэтных сродкаў. І як адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі **Максім ЕРМАЛОВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Беларусі,** бюджэт 2010 года будзе фарміравацца ў адпаведнасці з тымі падыходамі, якія закладзены ў кодэксе. «Бюджэт 2009 года рэалізаваў шэраг мераў, накіраваных на зніжэнне падатковай нагрузкі. Зніжэнне беспрэцэдэнтнае, мы за ўсю папярэднюю гісторыю на такую істотную велічыню — больш як адзін працэнт ВУП — падатковую нагрузку не зніжалі», — падкрэсліў чыноўнік. — «Зніжана стаўка збору ў фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі (з двух да аднаго працэнта). Актыўная частка асноўных вытворчых фондаў выведзена з абкладання падаткам на нерухомасць. Рэалізаваны комплекс мерапрыемстваў па пераходзе на лінейную адзіную шкалу падаходнага падатку ды іншыя меры, напрыклад, падатак на набыццё аўтатранспартных сродкаў зніжаны. Гэта сумарна дазваляе знізіць больш чым на два трыльёны рублёў падатковую нагрузку — і на насельніцтва, і на нашы прадпрыемствы, у цэлым на эканоміку. Акрамя таго, рэалізаваны комплекс мерапрыемстваў па спрашчэнні падатковага заканадаўства. Гэтыя меры ў сённяшніх эканамічных умовах найбольш актуальныя. Мы ва ўмовах нарастання і развіцця сусветнага фінансавага крызісу не адмаўляемся ад падтрымкі сваіх прадпрыемстваў, а наадварот, яе нарошчваем і прымаем дадатковыя рашэнні для таго, каб падтрымаць эканоміку ў тых абставінах, якія складваюцца».

У сувязі з прынятым рашэннем аб бездэфіцытнасці сёлетняга бюджэту, ураду давядзецца яго перагледзець. Нагадаем, што ў зацверджаным дагэтуль законе быў закладзены дэфіцыт у 2,8 трлн рублёў. Бездэфіцытны бюджэт, як патлумачыў Максім Ермаловіч, выкліканы неабходнасцю ўмацавання жорсткасці бюджэтнай палітыкі. «Ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу ўзмацняецца жорсткасць бюджэтнай палітыкі ва ўсіх краінах. Мы не выключэнне. А дэфіцыт бюджэту — гэта мяккая бюджэтная палітыка», — патлумачыў спецыяліст. «Сёння мы пераглядаем бюджэт, урад рыхтуе прапановы па забеспячэнні збалансаванасці рэспубліканскага бюджэту, з тым каб у 2009 годзе прафінансаваць усе першачарговыя расходы рэспубліканскага бюджэту і аптымізаваць іншыя расходы». Бюджэт, паводле слоў спецыяліста, будзе перагледжаны як па даходах, так і па расходах. Магчымыя вектары перамен аналіць пакуль цяжка — вельмі шырокі прагноз спецыялістаў у дачыненні да таго, як будзе развівацца эканоміка. «Вялікага аптымізму пры фарміраванні бюджэту мы не будзем закладваць у дачыненні росту эканомікі. Гэта распаўсюджаная практыка, калі бюджэт фарміруецца, зыходзячы з песімістычнага прагнозу росту», — падкрэсліў Максім Ермаловіч. Ён дадаў, што змены курсу валют, безумоўна, паўплываюць на бюджэт. «Ёсць прамыя затраты бюджэту, звязаныя з абслугоўваннем дзяржаўнай пазыкі, з міжнароднымі плацяжамі, і змяненне курсу долара ўвядзе адпаведна павелічэнне гэтых расходаў». Пры гэтым Максім Ермаловіч запэўніў, што перагляд дзяржаўнага бюджэту не паўплывае на Саюзны бюджэт: «Міністэрства фінансаў з поўнай адказнасцю адносіцца да сваіх міжнародных абавязкаў».

А як наконт абавязкаў унутраных — дзе канкрэтна давядзецца «зацягнуць паясы»? Гэта вострае пытанне ўсё яшчэ застаецца адкрытым. *«У сакавіку мы ўнясём праект указа на разгляд урада. Тады можна будзе больш прадметна і грунтоўна пагаварыць аб тым, што будзе скарачацца, а што не», — паведаміў спадар Ермаловіч і адразу ж супакоіў: «Адзінае, скажу, што мы ўсё ж такі маем намер павялічыць заробкі ў бюджэтнай сферы. Якое будзе павелічэнне — гэта пытанне развіцця эканамічных умоў. Тым не менш, Міністэрства фінансаў зыходзіць з неабходнасці захавання ўзроўню даходаў у рэальным выражэнні ў бюджэтным сектары і лічыць гэта адной з прыярытэтных задач. Акрамя таго, будзе захаваны сацыяльны блок расходаў. Калі спатрэбіцца, то мы павялічым адрасную сацыяльную падтрымку насельніцтва. Гэта вельмі важна. Мы дэманстравалі ў апошнія гады самы высокі ўзровень дзяржаўных інвестыцый у параўнанні з усімі нашымі суседзямі і з дзяржавамі на такім жа ўзроўні эканамічнага развіцця. Мы развіваліся вельмі хуткімі тэмпамі, эканоміка таксама расла высокімі тэмпамі. Сёння дзяржаўныя інвестыцыі, магчыма, павінны быць перагледжаны, і мабыць, давядзецца зрабіць пэўную паўзу ў аб'ёмах дзяржаўных інвестыцый. Гэта значыць, не нарошчваць іх тымі ж тэмпамі, як мы збіраліся ў папярэднія гады, а захаваць іх на нейкім дасягнутым узроўні».*

Урад таксама праводзіць інвентарызацыю дзяржаўных праграм. Паводле слоў спадара Ермаловіча, па нейкіх з іх давядзецца павялічыць тэрміны выканання, на пэўны час скарациць выдаткі, а нейкія, наадварот, узмацніць — каб падтрымаць эканоміку. Пра магчымыя змены казаць пакуль дачасна, аднак сваім меркаваннем Максім Ермаловіч падзяліўся. Экспарт, жыллё і харчаванне ён назваў прыярытэтамі, якія набываюць «узрастаючы інтарэс і неабходнасць забеспячэння рэсурсамі». Чыноўнік адзначыў таксама, што ў наяўных умовах кожная бюджэтная арганізацыя павінна максімальна скараціць свае расходы — «пачынаючы ад сашчэпкі і заканчваючы капітальнымі расходамі».

Ала МАЧАЛАВА.

«МАСАВЫХ СКАРАЧЭННЯЎ І ЗВАЛЬНЕННЯЎ НЕ БУДЗЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Віцэ-прэм'ер пацвердзіў той факт, што Беларусь зацікаўлена ў рэалізацыі любых праектаў, што звязаныя з удзелам у сусветных транзітных патоках. Адзін з іх, у якім зацікаўлена наша краіна, — праект «Ямал-Еўропа-2». Як лічыць Андрэй Кабякоў, пастаўка расійскага газу ў Еўропу па другой нітцы газаправоду была б найбольш эфектыўнай і з мінімальнымі затратамі. Аднак як пастаўляць свой газ — канчатковае рашэнне за расійскім бокам. Расіяне ж пакуль, паводле слоў віцэ-прэм'ера, аддаюць перавагу балтыйскаму напрамку, па дне мора. Аднак ён не выключае таго, што ў далейшым па гэтым пытанні могуць адбыцца нейкія змены. І нагадаў, што беларускі бок у чарговы раз пацвердзіў гатоўнасць да пракладкі другой ніткі газаправоду.

А вось **міністр эканомікі Мікалай ЗАЙЧАНКА,** каментуючы адно з найбольш злабадзённых пытанняў, якое апошнім часам на слыху, — неабгрунтаваны рост цэнаў, падкрэсліў, што сёлета кантроль за цэнамі будзе ажыццяўляцца ў рамках антыманапольнага заканадаўства. «Калі будзе ўстаноўлены факт змовы пастаўшчыкоў, то санкцыі будуць надзвычай жорсткімі», — заўважыў міністр. У прыватнасці, ён заявіў пра тое, што парушальнікаў будуць пазбаўляць ліцэнзій.

Таксама Мікалай Зайчанка паведаміў пра тое, што ў рэспубліцы на 10 працэнтаў павышаны цэны на цыгарэты. «Я падпісаў адпаведную пастанову, — праінфармаваў міністр. — У ёй прадугледжана павышэнне цэнаў прыкладна на 10 працэнтаў, якое кампенсуе рост акцызаў, а таксама вытворцам падараванне сыравіны з улікам дэвальвацыі. Мая пазіцыя, што гэта не той тавар, дзе неабходна стрымліваць рост цэнаў».

Першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел КАЛАУР, характарызуючы аб'ём наяўнай валюты, якую беларусы сёння трымаюць у «панчохах», зазначыў, што, паводле ацэнак галоўнага банка краіны, размова ідзе аб 1,5-2 млрд долараў ЗША. Між іншым, зараз спецыялістамі распрацоўваецца праграма развіцця фінансавага сектару, што, магчыма, дазволіць і людзям выцягнуць свае сродкі з-пад «падушкі», каб з выгадай імі распарадзіцца. У прыватнасці, будуць з'яўляцца новыя інструменты на рынку каштоўных папер, іншыя аналагічныя інструменты, якія ёсць у суседніх краінах. Павел Калаур падкрэсліў, што зараз уносяцца змены ў заканадаўства, якія неабходныя для стварэння даверных фондаў, каб насельніцтва магло карыстацца і такім інструментам фінансавага рынку.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Абзац

■ На аднаго жыхара Беларусі, па звестках Нацбанка краіны на 1 студзеня 2009 года, у сярэднім прыходзіцца Br1402 тыс. зберажэнняў, размешчаных у банкаўскіх укладах.

■ **Пракуратура Савецкага раёна Мінска праводзіць праверку па факце гібелі на прадпрыемстве «Амкадор» рабочага. Паводле папярэдніх звестак, у трэцюю змену пры правядзенні такарных работ адзенне рабочага зацягнула ў станок, а потым пацярпела і цела. На выратаванне прыехалі супрацоўнікі МНС і медыкі, апошнія канстатавалі смерць рабочага 1988 г.н. Як мяркуецца, няшчаснае здарэнне адбылося з-за ўласнай неасцярожнасці.**

■ Жанчына ў Жлобінскім раёне загінула пад завалам навеса, дах якога абваліўся. Трагедыя адбылася ў вёсцы Рэкта на прыватным падвор'і. Дах навеса для дроў абваліўся на 55-гадовую жанчыну. Праз некаторы час яе пад абломкамі знайшлі суседзі. «Хуткая дапамога», што прыйшла па выкліку, канстатавала смерць. Папярэдняй прычынай абвалу стала нетрываласць навеса, пабудаванага яшчэ ў 1985 г. Паспрыяў трагедыі і мокры снег, што сабраўся на даху.

■ **Згодна са звесткамі Саюза цукравытворцаў, за першыя тры тыдні гэтага года аптовыя цэны на белы цукар у Расіі выраслі больш чым на 25 працэнтаў. Вытворцы і імпарцёры тлумачаць гэта хістаннямі валютных курсаў, біржавымі індыкатарамі і сезоннымі пошлінамі. Беларусь экспартуе ў Расію цукар з бурачнай сыравіны. Сёлета плануецца паставіць не менш за 150 тыс. тон.**

■ Дырэктар дзіцячага цэнтра «Артэк» аб'явіў галадоўку. Кіраўніцтва міжнароднага дзіцячага цэнтра ў Крыме звярнулася да кіраўнікоў краіны з просьбай выратаваць комплекс ад банкруцтва і захаваць працоўныя месцы. У лагеры ўпершыню адмянілі зімовыя змены, работнікі не атрымліваюць зарплату, гаворыцца ў звароце. Дырэктар комплексу дапускае, што «Артэк» даводзяць да банкруцтва спецыяльна, «бо кошт зямлі там можна параўнаць з цэнамі на зямлю ў Манака». Пачаць галадоўку кіраўніка комплексу прымусіла абыякавасць, з якой ставіцца кіраўніцтва краіны да праблем унікальнага дзіцячага цэнтра.

■ **Рэйс авіякампаніі S7 Airlines з Новасібірска ў в'етнамскі Хашэмін двойчы вяртаўся ў аэрапорт вылету з-за аварый. Пасажырам не дапамагло нават тое, што пасля першага звароту самалёт замянілі. Другі напраткаў той жа лёс. У першым выпадку спрацавала аварыйная сігналізацыя, ніхто не пацярпеў. Але экіпаж вырашыў вярнуцца. Праз некалькі гадзін кампанія падала іншы самалёт, аднак у раёне мяжы з Манголіяй паступіла інфармацыя аб няспраўнасці генератара, і самалёт зноў павярнуў у новасібірскі аэрапорт. Па маршруце пальцеў трэці борт. На борце знаходзілася 119 пасажыраў, у тым ліку дзеці.**

Поўны абзац

■ Жыхарка амерыканскага штата Пенсільванія абвінавачана ў жорсткім абыходжанні з жывёламі за продаж кацянят з пірсінгам. 34-гадовую «сабачую» цырульніцу абвінавачваюць у тым, што яна пракалола чорным кацянятам вушы, шыі і хвасты. Жывёлінак прадавалі праз інтэрнэт. У суд на жанчыну падала арганізацыя абаронцаў жывёлаў. Між тым цырульніца не бачыць нічога жорсткага ў пірсінгу, які яна, па яе словах, робіць акуратна, з захаваннем усіх правілаў бяспекі. Усе кацяняты накормленыя і добра выхаваныя.

■ **Сям'і з акругі Емтланд у Швецыі забаранілі зваць свайго сына літарай «кью» (Q). Апеляцыйны суд загадаў бацькам абраць для дзіцяці нармальнае імя, пацвердзіўшы такім чынам папярэдняе рашэнне іншага суда, які заключыў, што літара «кью» не адпавядае лінгвістычным патрабаванням да імя і не можа служыць такім. Самі бацькі настойваюць на сваім выбары, сцвярджаючы, што іх сын з малых гадоў носіць імя Кью і ўсё прывыклі звать хлопчыка менавіта так.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

НЕ ПАЗЫЧЫЛА І...

Да пенсіянеркі з в. Альшаны Столінскага раёна прыйшоў 34-гадовы аднавясковец і папрасіў пазычыць грошай. Гаспадыня адмовіла. Тады мужчына 6 разоў ударыў пенсіянерку малатком па галаве, прыхапіў 400 тыс. рублёў і пакінуў хату.

З траўмай галаўнога мозгу, пераломамі патыліцы, цемені, ілба і скроневай косці жанчыну даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне Давыд-Гарадка.

Рабаўніка затрымалі, але амаль палову ўкрадзеных грошай ён паспеў спусціць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Міхаіл ФІНБЕРГ: «ДЗЕЛЯ ГЭТЫХ МАЛЕНЬКІХ ЗОРАЧАК ТРЭБА ІСЦІ НАПЕРАД...»

«Заслаўе-2009»

Ужо стала добрай традыцыяй, што старажытнае Заслаўе адкрывае серыю асветніцкіх імпрэзаў, якія ладзіць Нацыянальны аркестр Беларусі пры падтрымцы дзяржавы. Гэта цэлае свята музыкі, якое кожны раз дорыць гледачам новыя ўражанні, імёны і творы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Не верыцца, але і сапраўды ўжо ў дзявяты раз мы сустракаемся ў Заслаўі, у вельмі цікавым гістарычным цэнтры, дарагім для нас горадзе, які палюбіў прафесійнае майстэрства, цёпла нас прымае, дзе гараджане радуюцца сустрэчы з мастацтвам і дзе падрастае ўжо новае пакаленне слухачоў, узгадаваных на прафесійнай музыцы, — падзяліўся **мастацкі кіраўнік свята і кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Саюзнай дзяржавы, прафесар Міхаіл ФІНБЕРГ.**

Кожны фестываль у горадзе Заслаўе прысвячаецца вялікаму імені — гэта заўсёды аўтарскі вечар вядомага кампазітара, які шмат унёс у развіццё беларускай музычнай школы. На гэты раз першы дзень фестывалю быў упершыню ў Беларусі прысвечаны выдатнаму аўтару — Мячыславу Карловічу. На другі дзень гледачоў чакала знаёмства з творчасцю Генрыха Вагнера.

Як сказаў Міхаіл Якаўлевіч, галоўная мэта фестываляў, што ладзяцца ў малых гарадах — асветніцкая. Людзі, якія прыходзяць на іх, нешта адкрываюць для сябе новае, нечаму вучацца.

У дзень адкрыцця фэсту вучні дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў Міншчыны прадэманстравалі свае творчыя дасягненні ў канцэрце «Беларускі альбом».

— Свята пачалося з цікавай падзеі: мы правялі конкурс на лепшае выкананне беларускіх твораў навучэнцамі музычных школ Мінскай вобласці, — расказаў Міхаіл Фінберг. — Якое было маё здзіўленне, калі я пабачыў вялікую колькасць таленавітых скрыпачоў, віяланчэлістаў, баяністаў, флейтыстаў, выканаўцаў твораў на цымбалах, фартэпіяна! Гэта пераможцы музычных спаборніцтваў у сваіх гарадах. Я не паверыў сваім вачам і вушам, калі выйшаў ансамбль скрыпачоў з 16 чалавек! Тое, што сёння гэтыя дзеці выконваюць рэдкія музычныя творы, дарагога варта. Я ўзначальваў журы, і калі прыйшоў час падводзіць вынікі, лепшага мы так і не вызначылі: усе былі прызнаныя лаўрэатамі. Дзеці паехалі з цудоўным настроем дадому. Такое мерапрыемства адбылося ўпершыню. Дзеля гэтых маленькіх зорачак і трэба ісці наперад, працягваць справу, якую мы пачалі.

Фестываль у Заслаўі — толькі пачатак творчага года аркестра, але не першая яго падзея. Ужо адбыўся канцэрт «Музыка беларускага кіно», дзе было згадана ўсё, што створана ў кіно за 80 гадоў. Хутка канцэрт з'явіцца на беларускім тэлебачанні. Дзеля таго, каб такая падзея адбылася, два гады толькі адшукваліся творы, многія давялося аднаўляць.

27 студзеня на радзіме беларускага паэта Адама Русака пройдзе канцэрт, прысвечаны яго творчасці. Сёлета яму споўнілася б 105 гадоў. Адначасова там адбудзецца сустрэча з беларускімі кампазітарамі і паэтамі, а таксама святочны канцэрт, дзе прагучаць як творы, якія сталі ўжо класічнымі для Беларусі, так і новыя творы на тэксты паэта.

— Я вельмі ганаруся, што мне удалося зрабіць гэтую праграму, — прызнаецца Міхаіл Фінберг, — бо марыў пра яе 5 гадоў.

Ужо распачаўся тур па аграгарадках. Адбыліся канцэрты ў Магілёўскай, Віцебскай абласцях, на чарзе — гарады Міншчыны. Усяго ў тур увойдзе 50 канцэртаў.

У 20-ты раз 10—12 лютага пройдзе фестываль, прысвечаны 70-годдзю беларускага джаза. Чакаюцца госці з Амерыкі і Францыі.

У сакавіку ў Мінску ў другі раз адбудзецца вялікае свята — «Шлягер на ўсе часы», фестываль, які прысвечаны асобам. Так, запланаваныя канцэрты ў гонар Ганны Герман, паэта-франтавіка Міхаіла Таніча. Акрамя таго, пройдуць святы «Легенды Бітлз», а таксама «Ад Масквы да Брэста», прысвечанае 65-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дарэчы, увесь канцэртны сезон аркестр прысвяціў гэтай даце. Да яе падрыхтавана таксама спецыяльная праграма. Яна будзе адрозніваца ад усіх, якія былі раней: там будуць гучаць песні, напісаныя сучаснымі кампазітарамі. Гэта погляд на вайну чалавека, які быў народжаны пасля Перамогі.

Шмат чакаецца юбілейных падзеяў: да 80-годдзя Яўгена Глебава падрыхтавана новая эстрадная праграма і завяршаецца падрыхтоўка да камернага канцэрта. Яшчэ ў 2009 годзе будзе святкавацца юбілей сяброў аркестра — Аляксандры Пахмутавай і Мікалая Дабранравава.

— Сёлета мы рыхтуем таксама сустрэчу на фестывалі беларускай паэзіі і песні ў Маладзечне, дзе аркестр праводзіць конкурс маладых выканаўцаў і канцэрт беларускай песні, — паведаміў Міхаіл Якаўлевіч. — Адначасова мы ўжо пачалі падрыхтоўку да Славянскага базару.

Запланаваны музычныя святы ў Міры, Нясвіжы, Іванаве, Тураве, Чачэрску, Мсціславе, Пінску, Жлобіне, праекты з беларускім тэлебачаннем, шмат сольных праектаў.

— Як бачыце, планы ў нас грандыёзныя, — заўважыў кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра. — Разам з тым мы ўвесь час павышаем свой прафесійны ўзровень. Штогод кожны музыкант робіць творчую справаздачу. Гэта самастойнае сольнае выступленне перад сваімі калегамі і мастацкім саветам аркестра. Пасля ён атэстуецца на працяг кантракту. Такая работа вядзецца 20 гадоў, але я кажу пра гэта ўпершыню.

Міхаіл Якаўлевіч падкрэсліў, што ў сваёй канцэртнай дзейнасці аддае перавагу малым гарадам. У Мінску за год даецца толькі 7 канцэртаў, а ў сярэднім іх ладзіцца больш за сотню. Летась гэты калектыў зарабіў 1,5 мрд беларускіх рублёў.

Пра значнасць фестывалю «Заслаўе-2009» для раёна сказаў **Сяргей Сцяпанавіч КУДЗІН, начальнік аддзела культуры Мінрайвыканкама:**

— Мы вельмі рады сустракаць такое свята. Для тых дзяцей, што займаюцца ў музычных школах, гэта вялікі стымул для творчасці, штуршок наперад. І мясцовыя жыхары вельмі любяць і чакаюць канцэрты. У апошнія дні ў мяне ўсе тэлефоны абарвалі: прасілі лішні білецік. Але, на жаль, мне даводзілася адмаўляць.

Апроч іншага, фестываль у Заслаўі — добры ўрок патрыятызму. Ён адкрывае яркія імёны, малавядомыя старонкі нашай гісторыі. Мясцовыя ўлады сёння заклапочаны тым, каб у найбліжэйшай будучыні ў горадзе з'явіўся ўласны палац, які мог бы на высокім узроўні сустракаць такі фестываль, каб на канцэрты можна было запрасіць больш слухачоў.

Завершыць двухдзённае свята ў Заслаўі гала-канцэрт сучаснай папулярнай музыкі.

Марына ЛЯВОШКА.

КОЛЬКАСЦЬ «НОВЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ» ПАВЯЛІЧЫЦЦА БОЛЬШ ЧЫМ НА 13 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК

Сёлета колькасць грамадзян краіны, якія выйдуць на пенсію, перавысіць колькасць моладзі, што дасягне 16-гадовага працаздольнага ўзросту. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Пагонышава.

Паводле ацэнак міністэрства, сёлета на пенсію па ўзросце могуць выйсці 108 тысяч грамадзян Беларусі. У 2008 годзе гэты паказчык быў значна ніжэйшы — 94,6 тысячы чалавек. Разам з тым 16-гадовага ўзросту дасягнуць толькі 114 тысяч беларусаў — апошні паказчык сёлета, наадварот, зменшыцца ў сувязі з рэзкім скарачэннем нараджальнасці ў 1990-х гадах. Дарэчы, заўважыла Таццяна Пагонышава, прагнозы паказваюць, што надалей дэмаграфічная сітуацыя будзе пагаршацца, пры гэтым з кожным годам колькасць «новых пенсіянераў» усё больш будзе перавышаць паказчыкі папаўнення рынку працы за кошт моладзі.

Сяргей ГРЫБ.

ЗАСО «Промтрансинвест» просит считать недействительными страховой сертификат по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих за пределы РБ (страховой сертификат «Зеленая карта») серии BY/07 № 1397206, страховой полис по добровольному имущественному страхованию формы 2РП серии ПИ № 0020514, страховые полисы универсальные формы 2РН серии ПУ № 0012471, № 0013474, № 0006276, страховой полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу; по добровольному страхованию от внезапных заболеваний и несчастных случаев иностранных граждан, временно находящихся на территории РБ, формы 2РН, 2РП серии ТК № 003670.
УНП 100357923

У суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Гульвакова Сяргея Міхайлавіча,** 3 студзеня 1979 года нараджэння, ураджэнца горада Нікалаеўска Валгаградскай вобласці Расійскай Федэрацыі, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання (жнівень 2006 г.): Касцюковіцкі раён, пасёлак Муравілле, д. 418, кв. 2, які ў жніўні 2006 г. выехаў на заробкі ў г. Калінінград, з той пары звестак пра яго няма.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра С.М. Гульвакова, паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

БРАТ НА БРАТА...

22 студзеня ў Крычаўскую раённую бальніцу быў дастаўлены 45-гадовы мужчына з множнымі сечанымі ранамі на цемені. Праз некалькі гадзін ён памёр. Міліцыя высветліла, што напярэдадні ўначы малодшы брат, 41-гадовы мужчына, кінуўся на старэйшага з малатком. Яны жылі разам у адной кватэры, але ў іх даўно склаліся непрыязныя адносіны. Што стала канкрэтнай прычынай для смяротнага канфлікту — высветліць следства, а Крычаўская раённая пракуратура распачала крымінальную справу па артыкуле «Забойства».

А ў Пастаўскім раёне 38-гадовую рабочую забіў яе малодшы брат. Трагедыя адбылася раніцай — каля 11 гадзін. Следчыя пад кіраўніцтвам начальніка РАУС і пракурор раёна высветлілі, што жанчына і яе 33—гадовы брат дома разам ужывалі спіртное. Пасварыліся. Брат некалькі разоў ударыў яе кулаком па галаве. Сястра ўдарылася аб сцяну і памерла. Узбуджана крымінальная справа.

Алена КАЗЛОВА, Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Работу па вяртанні нацыянальных культурных каштоўнасцяў у Беларусь сістэматызуе камісія пры Саўміне

Работу па вяртанні нацыянальных культурных каштоўнасцяў у Беларусь сістэматызуе створаная камісія пры Савеце Міністраў па пошуку, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія апынуліся за межамі Беларусі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Ігар Чарняўскі.

Па розных прычынах у розны час многія беларускія культурныя каштоўнасці апынуліся за межамі рэспублікі — у Расіі, Украіне, Польшчы, іншых краінах. У выніку аб багатых культурных гістарычных традыцыях беларусам даводзіцца расказваць «на пальцах». Так, нялёгка ідуць стварэнне экспазіцыі будучага музея гісторыі Беларусі, насычэнне арыгінальнымі прадметамі залаў Мірскага і Нясвіжскага замкаў. Важна абагульніць інфармацыю аб каштоўнасцях

Лінія жыцця

Жанчына з крычаўскай глыбінкі летась прадала дзяржаве 34 тоны малака. Яе гаспадарка — невялікі калгас з фермай. А лёс Таццяны Драздовай можа стаць асновай для сюжэта галівудскай кінастужкі.

«Я САМА!»

Жывёльны свет

...Дом на ўскраіне вёскі Дарлівая. Патрыярхальны выгляд вясковай вуліцы парушаюць толькі спадарожнікавыя талеркі, усталяваныя на хаце Драздовых.

Стройная жанчына з яркімі блакітнымі вачыма адразу запрашае на экскурсію па падворку, дзе радасна брэша сабака Рэкс (яшчэ двух зачынілі загадзя, каб яны гасцям пяткі не паадрывалі), важна ходзяць укормленыя качкі і з хлява выглядае прыгожы казёл з доўгай белай воўнай.

Азнаямленне з гаспадаркай зацягваецца: склад з мукой і збожжам — «маё багацце», пяць кароў ды тры рамонтныя цёлкі — «цяпер даю дзве каровы і здаю 80 літраў малака праз дзень», котныя авечкі — «да лета будзе ўсіх паўсотні», курынае седала — «дробную птушку не лічу», кабан, бык, коні ды козы...

Таццяна Фёдараўна задаволена ўсміхаецца: «Я люблю, калі шмат жывёлы». Праўда, гэта любоў вымагае працы: штодня яна падымаецца каля 4 раніцы і топчацца да 11 увечары, выхадных дзён не назірае, Крым бачыла толькі на фоташпалерах ва ўласным пакоі, а адвярнуцца ад гаспадаркі можа на ежу і любімы тэлесерыял пра «Жанчыну без мінулага».

У працу з галавой

А ўсё яе мінулае — як на далоні. Таццяна нарадзілася ў вёсцы і з маленства дапамагала маці, якая працавала даяркай на мясцовай ферме. Жанчына беражліва захоўвае ва ўласным архіве пажаўцелы нумар раённай газеты за 1973 год, дзе яна, 4-класніца, сфатаграфаваная з маці і даільным апаратам на ферме. Цяпер падобны апарат яна мае ва ўласнай гаспадарцы.

Жыццё маладой сялянкі ішло па накатанай: дзяўчына скончыла сельскагаспадарчы тэхнікум, пайшла замуж, нарадзіла двух сыноў. Але хутка яна засталася адна: муж загінуў у аварыі.

— Так у 20 гадоў я стала ўдавой і з тых часоў ваюю сама, — распавядае Таццяна Фёдараўна. — Я не здрадзіла сваёй сям'і і не пайшла зноў замуж. Чужыя дзеці нікому не патрэбныя. Старэйшаму было 2 гады, а малодшаму — толькі 4 месяцы. Мне трэба было паставіць хлопцаў на ногі. І я вырашыла наноў пачаць жыццё і кінулася з галавой у працу.

Яна працавала даяркай і даглядала сваю гаспадарку. Здавала жывёлу і назапашвала грошы, каб даць сваім сынам вышэйшую адукацыю. Праўда, зноў не пашанцавала: 5 тысяч савецкіх рублёў згінулі ў віры 1990-х. Аднак Таццяна Фёдараўна ніколі не кідалася ў істэрыку — не было часу за працай, ды і цвёрда ведала: гаспадарка дасць магчымасць пракарміцца ў любыя часіны. «Усе будуць сытыя!» — і сёння запэўнівае Драздова.

Натуральнае жыццё

— У мяне яшчэ тры гектары зямлі, — паказвае яна. — У агародзе вырошчваем усё, што можна. У краме я набываю толькі хлеб, муку, соль і цукар. А так харчуемся толькі сваім, таму і не хварэем.

Харчы з гаспадаркі на Крычаўшчыне вельмі цэняць сваякі Драздовых з Масквы. Паспяховыя людзі пры пасадах і пагонах з ахвотай прымаюць у падарунак кошык часнаку, вядро буракоў, мех бульбы, каструлю яек, слоікі варэння.

Дарэчы, самі сваякі аднойчы запрасілі Таццяну Фёдараўну пабываць у Маскве з візітам у адказ: яна раніцай прыбыла ў расійскую сталіцу, за дзень паспела падзівіцца на Крэмль і пакатацца па Маскве-рацэ. А ўвечары замест мюзікла нечакана адправілася на Беларускі вакзал і паспяшалася ў родную Дарлівую.

— У Маскве папросту няма паветра, і я не разумею, як там людзі жывуць, — паскардзілася аднадзённая турыстка. — Аўтамабілі, загазаванасць. У мяне галаву сплюшчыла, ціск зашкаліў. Гарады мне ўвогуле не падабаюцца. У нас жа тут чыстае паветра і прыгажосць. Улетку ўсё зялёнае, ягадку з'еў, яйка. А там усё трэба набыць і невядома, адкуль тыя харчы. Я прызвычаілася да сваёй вёскі і нікуды адсюль не хачу!

Няма працы без прыбытку

У хаце Таццяны Фёдараўны, як і звонку, патрыярхальнае сумяшчаецца з сучасным. Печка і просты сялянскі «дызайн» суседнічаюць з камп'ютарам ці, напрыклад, энергазберагальнымі лямпачкамі.

Лепшы падарунак для маці ад тэхнічна прасунутых сыноў — гэта чарговы мабільны тэлефон. Яна «як Цэзар» любіць рабіць дзве справы адначасова: даіць кароў і з хлява размаўляць па тэлефоне са знаёмымі і сваякамі.

Таццяна Фёдараўна выхоўвала сваіх дзяцей у працы. Сямейныя байкі сведчаць, што сыны дапамагаюць па гаспадарцы з таго часу, як пачалі хадзіць. Вова ў два гады меў такую адказнасць: даручаную карову падчас даення трымаў за хвост. А Лёню трэба было сядзець у градах і адганяць курэй. Аднойчы малому так надакучыла гэта справа, што ён стаў крычаць: «Кыш! Каб вы падохлі...»

— Я ніколі дзецям не хлусіла і грошы ад іх не хавала, — распавядае свой рэцэпт выхавання Драздова. — Я ім паказвала: маўляў, вось нашы даходы. Калі што хочам набыць — трэба папрацаваць і зарабіць.

Сёння Леаніду 26 гадоў, і ён працуе прадпрымальнікам у Маскве. Малодшы Уладзімір заканчвае ў Віцебскай акадэміі вучобу на ветэрынара і з цікавасцю пашырае матчыну гаспадарку.

— Трэба, каб заўсёды ад працы была аддача, — вучыць Драздова новае пакаленне працаўнікоў на зямлі. — Мая навука такая: альбо трэба мець вынікі і грошы, альбо зусім не пачынаць справу. Кажуць, ад прыбытку галава не баліць. І хоць вельмі вялікіх грошай працай на зямлі не заробіш, але грошы я не пазычаю, нам хапае.

Гаспадарка — лепшая фізкультура

Аўтамабіля ў Таццяны Фёдараўны няма: яна аддае перавагу фурманцы, запрэжанай вялізным чорным канём Бэндзікам, альбо веласіпеду. Яна, старааста вёскі і актыўны дэпутат Касцюшкавіцкага сельскага Савета, звычайна на веласіпедзе ездзіць на сесіі і пасяджэнні ў Крычаў ці цэнтр сельсавета за 12 кіламетраў. Кажа, што гэта вельмі карысна. Затое якая талія і ўвогуле фігура ў 45-гадовай Драздовай! Усе аматкі дыет і фітнэсу адпачываюць. Усе навамодныя сістэмы аздараўлення і пахудзення саступаюць па выніку штодзённым клопатам па гаспадарцы.

Прыхільніца вясковага здаровага ладу жыцця зусім не ўжывае алкаголь: яна супрацьпастаўляе сваю прынцыповую пазіцыю небяспечнаму захапленню вяскоўцаў. Яна ўпэўненая, што п'янства — гэта сорамна, ды і працы перашкаджае. І не збіраецца выдаткоўваць грошы на тое, ад чаго назаўтра баліць галава!

У хаце гаспадыня трымае карысныя расліны: на шафах стаяць гаршкі з алоэ (па-народнаму, сталетнікам), а на сцяне вісіць вялізная вязанка часнаку. Таццяна Фёдараўна вырашыла, што надышоў час шчыльна заняцца здароўем і вызваліць арганізм ад шлакаў. Для гэтага яна скарыстала таямнічы рэцэпт на аснове часнаку з брашуры савецкіх часоў пра тайны тыбецкай медыцыны.

— Гэта я проста страхуюся па ўзросце і амалоджваю арганізм, — усміхаецца гаспадыня. — Акрамя настойкі часнаку, штодня ўжываю карысны аліўкавы алей.

За клопатамі Таццяна Фёдараўна часам забываецца, ела сама альбо ўсё ж такі не. Але калі яна накрывае стол, то вочы разбягаюцца ад хатніх прысмакаў. Вяленая паляндвіца, пальцам піханая каўбаса, кіслая капуста, бульба, грыбы. Фірмовая страва называецца рулетам: падчаровак са свайго парася, пасолены і прыпраўлены, трэба скруціць, заматаць у фольгу і запякаць у печы некалькі гадзін. Нават паху ад гэтага рулета дастаткова для салідарнасці з маскоўскімі сваякамі, якія любяць сталавацца ў Драздовай.

Страхоўка ад крызісу

— Маё галоўнае пажаданне ўсім людзям — здароўя! — кажа Таццяна Фёдараўна. — А для гэтага трэба рухацца, працаваць. Ведаеце, шмат хваробаў ад нерваў: таго няма ці гэтага, грошай нестае, есці ахвота... Але праўду кажуць: як патопаеш, так і палопаеш!

Гаспадыня з Дарлівай няшмат ведае пра крызіс, які ахапіў свет. Але з таго, што прачытала ў газетах, зрабіла сваю выснову: «Няма чаго крызісаваць!» І ўсе дэвальвацыі і страсенні на рынках Драздову не хвалююць.

— Мой ашчадны банк — каровы ды авечкі! — усміхаецца яна. — Таму крызіс да нашых хлявоў не дабярэцца. У вёсцы скардзіцца на жыццё і крызіс толькі лянівы, а хто працуе — атрымлівае грошы і задавальненне.

Старшыня Касцюшкавіцкага сельскага Савета Міхаіл Барычэўскі кажа, што староста Дарлівай — асаблівы чалавек, працаўніца ад Бога.

— Я ніколі не хварэю, таму што праца не дае мне такой магчымасці, — проста тлумачыць яна. — Такая ў мяне адказнасць: што б ні здарылася, раніцай падняцца і пайсці да жывёлы. Затое ў мяне ўсё ёсць. І я мяркую, што мой час адпачываць яшчэ прыйдзе.

У доказ апошняй высновы Таццяна Фёдараўна паказвае выхадное адзенне і футры. Маўляў, спатрэбіцца, калі можна будзе для сябе пажыць. Але гэта — потым. Спачатку трэба прыняць нявестак, даглядзець унукаў, падтрымаць матэрыяльна маладыя сем'і. А значыць — працаваць і даіць малака болей за сярэднюю ферму. І ўсё гэта — сама!

— Я ўжо прызвычаілася адна, — спакойна кажа жанчына. — І ў гэтым няма нічога цяжкага. Усё лёгка. Мае сыны і мая гаспадарка — гэта радасць.

Што ж, у Галівудзе любяць добрыя фіналы. Шчаслівыя ва ўсіх сэнсах. Таццяна Фёдараўна аб'явіла мужчын закрытай тэмай, лічыць за лепшае гэта не варушыць і на моцную палову чалавецтва не звяртае ўвагі. Можа, гэта і не мая справа, але ўсё ж такі хочацца верыць, што яна яшчэ знойдзе сваё жаночае шчасце, якое расквеціць жыццё гэтай выбіўной працаўніцы. І на яе звыклае «Я сама!» нехта адкажа: «Давай дапамагу, мая гаспадыня...»

Ілона ІВАНОВА.

Крычаўскі раён.

ФАЛЬВАРАК НА ВОЛМЕ

Ці ўдасца аднавіць сядзібу апошняга гаспадара Івянца?

Нярэдка здараецца, што ў беларускіх паселішчах ёсць гістарычныя аб'екты, якія на працягу доўгіх гадоў сталі іх сапраўднымі «брэндамі». Гэтыя адметнасці прываблiваюць шматлікіх турыстаў і госці са здзіўленнем адкрываюць для сябе і іншыя адметнасці мясцінаў, куды яны завіталі. Не стаў выключэннем і Івянец, які ўваходзіць у шэраг цікавых маршрутаў. Афіцыйна лічыцца, што мястэчка налічвае не менш чым шэсць стагоддзяў. Аднак магчыма, што Івянец мае значна большую гісторыю. Некалькі гадоў таму тут праводзіліся раскопкі, падчас археалагічных даследаванняў было знойдзена рытуальнае вогнішча. Гэта сведчанне таго, што паселішча існавала яшчэ з паганскіх часоў. Жыла тут літва — племя ўгра-фінскага паходжання, адсюль і пайшлі ўсім вядомыя ліцвіны. Івянец знаходзіцца на сапраўдным сумежжы цэнтральнай Беларусі і Панямоння, таму акумулюе лепшыя здабыткі гэтых гісторыка-этнаграфічных тэрыторый. Як адзначаюць спецыялісты, можна весці гаворку пра сапраўдны феномен Івянецкага рэгіёна, які фарміраваўся на працягу доўгага часу.

Зруйнаваны маёнтак — сумнае відовішча.

Ва ўсе часы гэта была сапраўдная зямля майстроў. Славіліся тутэйшыя ганчары, да якіх прыязджалі вучыцца не толькі з усёй Беларусі. Напрыканцы XIX стагоддзя тут працавалі 17 майстэрняў — невялічкіх заводзікаў, дзе выраблялася самая разнастайная кераміка. Вялікі клас мелі кавалі, разьбяры па дрэве. Зараз у Івянецкім музеі традыцыйнай культуры (які наведваюць разам з вядомымі касцёламі) імкнуцца адрадзіць рамяство. Цяпер гэта цэлы комплекс, дзе ў тым ліку ёсць свая ганчарня, ткацкі цэх, кузня, майстэрня мастацкай апрацоўкі драўніны. Колькі адметных аб'ектаў размясціліся ў гаспадарчых пабудовах апошняга гаспадара Івянца — пана Драгунцава. Ён меў вялікія плошчы зямлі (каля 2,5 тысячы гектараў), у тым ліку валодаў і даволі вялікім мястэчкам.

— Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II выдзеліла ў гэтых мясцінах зямельныя ўчасткі сваім ваярам, — кажа дырэктар Івянецкага музея традыцыйнай культуры Алег Раманоўскі. — Сядзібна-паркавы комплекс быў адбудаваны напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Дом пана быў даволі цікавай пабудовай. Меў тры паверхі, прычым адзін з іх размяшчаўся ніжэй за ўзровень зямлі, у падвале. Абагравацца вялікі сядзібны дом з дапамогай... адной печкі. Справа ў тым, што ў сценах былі праробленыя спецыяльныя адтуліны, па якіх праходзіла цёплае паветра.

Алег РАМАНОЎСКІ знаёміць з аздабленнем карчмы.

Панскі маёнтак пяражыў цяжкія часы. Падчас Першай сусветнай вайны тут размяшчаўся штаб. Вядома, што ў будынку пэўны час была кантора дрэваапрацоўчага камбіната, пасля нават жылі людзі. Колькі гадоў дом Драгунцава стаяў пусты і пакрысе прыходзіў у заняпад. Пакуль у 2000-м тут не здарыўся пажар — агнём былі знішчаны ўсе драўляныя часткі, засталіся толькі цагляныя сцены.

Зруйнаваны маёнтак — відовішча сумнае. Аднак рупліўцы не губляюць надзеі на адраджэнне сядзібнага комплексу Драгунцава. І пэўныя крокі на гэтым нялёгкім шляху ўжо зроблены.

— Амаль адразу пасля пажару нам перадалі гэтыя будынкі, — узгадвае Алег Раманоўскі. — Магчыма, калі б мы атрымалі комплекс раней, то ўдалося б усё зрабіць меншымі намаганнямі. Тым не менш аднаўленне пачалося. Побач з маёнткам — шэраг будынкаў гаспадарчага прызначэння. Гэта быў сапраўдны фальварак, дзе займаліся вытворчасцю.

У былой стайні зрабілі кузню і майстэрню мастацкай апрацоўкі дрэва. Наведвальнікі могуць не толькі паназіраць за працэсам, але і паўдзельнічаць. Выдатныя майстры ў Івянцы, на шчасце, пакуль яшчэ ёсць. З іх дапамогай захоўваюцца сакрэты старажытных рамёстваў. Да прыкладу, вядома, што ў Івянцы напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя налічвалася каля 20 кузняў. Іх вырабы карысталіся вялікім попытам не толькі ў мясцовых жыхароў, але і ва ўсім даволі вялікім рэгіёне. Цяпер захавалася толькі некалькі прыватных кузняў з абсталяваннем і рыштункам, якія, праўда, не выкарыстоўваюцца па прызначэнні. Супрацоўнікі музея карпатліва збіраюць прылады працы і вырабы майстроў-рамеснікаў. Нягледзячы на тое, што ў беларускіх паселішчах ёсць гістарычныя аб'екты, якія на працягу доўгіх гадоў сталі іх сапраўднымі «брэндамі». Гэтыя адметнасці прываблiваюць шматлікіх турыстаў і госці са здзіўленнем адкрываюць для сябе і іншыя адметнасці мясцінаў, куды яны завіталі. Не стаў выключэннем і Івянец, які ўваходзіць у шэраг цікавых маршрутаў. Афіцыйна лічыцца, што мястэчка налічвае не менш чым шэсць стагоддзяў. Аднак магчыма, што Івянец мае значна большую гісторыю. Некалькі гадоў таму тут праводзіліся раскопкі, падчас археалагічных даследаванняў было знойдзена рытуальнае вогнішча. Гэта сведчанне таго, што паселішча існавала яшчэ з паганскіх часоў. Жыла тут літва — племя ўгра-фінскага паходжання, адсюль і пайшлі ўсім вядомыя ліцвіны. Івянец знаходзіцца на сапраўдным сумежжы цэнтральнай Беларусі і Панямоння, таму акумулюе лепшыя здабыткі гэтых гісторыка-этнаграфічных тэрыторый. Як адзначаюць спецыялісты, можна весці гаворку пра сапраўдны феномен Івянецкага рэгіёна, які фарміраваўся на працягу доўгага часу.

Ва ўсе часы гэта была сапраўдная зямля майстроў. Славіліся тутэйшыя ганчары, да якіх прыязджалі вучыцца не толькі з усёй Беларусі. Напрыканцы XIX стагоддзя тут працавалі 17 майстэрняў — невялічкіх заводзікаў, дзе выраблялася самая разнастайная кераміка. Вялікі клас мелі кавалі, разьбяры па дрэве. Зараз у Івянецкім музеі традыцыйнай культуры (які наведваюць разам з вядомымі касцёламі) імкнуцца адрадзіць рамяство. Цяпер гэта цэлы комплекс, дзе ў тым ліку ёсць свая ганчарня, ткацкі цэх, кузня, майстэрня мастацкай апрацоўкі драўніны. Колькі адметных аб'ектаў размясціліся ў гаспадарчых пабудовах апошняга гаспадара Івянца — пана Драгунцава. Ён меў вялікія плошчы зямлі (каля 2,5 тысячы гектараў), у тым ліку валодаў і даволі вялікім мястэчкам.

— Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II выдзеліла ў гэтых мясцінах зямельныя ўчасткі сваім ваярам, — кажа дырэктар Івянецкага музея традыцыйнай культуры Алег Раманоўскі. — Сядзібна-паркавы комплекс быў адбудаваны напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Дом пана быў даволі цікавай пабудовай. Меў тры паверхі, прычым адзін з іх размяшчаўся ніжэй за ўзровень зямлі, у падвале. Абагравацца вялікі сядзібны дом з дапамогай... адной печкі. Справа ў тым, што ў сценах былі праробленыя спецыяльныя адтуліны, па якіх праходзіла цёплае паветра.

Там, дзе ў апошняга гаспадара Івянца быў свіран, мяркуецца зрабіць аўтэнтычную карчму. Адразу на ўваходзе — камора, дзе, як і патрэбна, размешчаны ўсе прылады працы, каб гатаваць смачныя стравы і пасля частаваць імі наведвальнікаў. Тут таксама захоўваюцца неабходныя прадукты. Сярод усяго іншага выстаўлены нават невялікі «млынок» (малоць зерне ці каву), а таксама прылада, якая нагадвае... металічны шпрыц. Аказваецца, што раней з дапамогай гэтага апарата рабілі каўбасы. У шырокі цыліндр закладваўся фарш, які пасля з дапамогай поршня пхаўся ў вузкую адтуліну. Каўбаса атрымлівалася стандартнай па вазе і памеры.

Магчыма, ужо праз непрацяглы час такую смакату можна будзе замовіць у самага сапраўднага карчмара. Прынамсі, яго куток з мураванай «барнай стойкай» ужо аздабляецца. У наступнай зале плануецца размясціць столікі. Тут ужо ўсталяваны арыгінальны камін. Дарэчы, яго зрабіў тутэйшы майстра Генадзь Вількоцкі. Таксама ён вылепіў герб Івянца, іншыя дэталі цікавага інтэр'еру. У карчме ўжо падключана вада, каналізацыя, ацяпленне. Як справядліва заўважае Алег Раманоўскі, турыстам патрэбна сучасная інфраструктура, таму варта забяспечыць належныя ўмовы.

Пры гаспадарскім падыходзе фальварак на Волме (сядзібны комплекс на высокім узгорку акружаны вадой — наперадзе рэчка, а збоку — вялікі ручай) можа стаць надзвычай цікавым аб'ектам. І будзе здольны прыемна здзіўляць наведвальнікаў. Праўда, магчымасці мясцовага музея абмежаваныя. Аднавіць маёнтак — справа надта затратная. І з гэтай задачай ні гарпасёлку, ні раёну самастойна не справіцца.

— Цяпер шэраг прадпрымальнікаў пачалі ўкладваць сродкі ў адраджэнне гістарычнай спадчыны, — кажа Алег Раманоўскі. — Дзяржава выдзяляе грошы на рэстаўрацыю вялікіх аб'ектаў, а ў нашым выпадку да месца прыйшлася б фінансавая падтрымка прыватнікаў. Маёнтак магчыма адбудаваць і зрабіць у ім адметны гатэль ці што-небудзь іншае. Я ўпэўнены, што гэтая прапанова карысталася б вялікім попытам.

Такая ініцыятыва заўсёды знойдзе падтрымку ўладаў, перакананы намеснік старшыні Валожынскага райвыканкама Пётр Бібік. Так што спадзяванні на аднаўленне сядзібы апошняга гаспадара Івянца рэальныя.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Валожынскі раён.

Фота аўтара.

Актуальная тэма

Лілія МАРОЗ:

«Новы Кодэкс аб зямлі дапаможа ЭФЕКТЫЎНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ГЭТЫ АБМЕЖАВАНЫ РЭСУРС»

З 1 студзеня гэтага года ўступіў у сілу новы Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі. Асноўнай стратэгічнай яго мэтай з'яўляецца фарміраванне рынкавых адносінаў, паколькі зямля з'яўляецца асноўным і абмежаваным рэсурсам і таму ў дзяржаве павінна быць створана эфектыўная сістэма выкарыстання гэтага рэсурсу. Кодэкс аб зямлі, які прыняты 23 ліпеня 2008 года і ўступіў у сілу з пачатку гэтага, мае значныя і істотныя адрозненні ад Кодэкса 1998 года. Гэтыя адрозненні датычацца пытанняў перадачы зямельных участкаў з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную ўласнасць грамадзян, пытанняў адчужэння зямельных участкаў, якія належаць грамадзянам на правах прыватнай уласнасці, а таксама пытанняў атрымання ў спадчыну зямельных участкаў. Па просьбе рэдакцыі «Звязды» ўсе гэтыя нюансы падрабязна пракаментавала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, загадчык Першай Мінскай абласной дзяржаўнай натарыяльнай канторы Лілія Мароз. Нашы пытанні да суразмоўцы датычылі тых асноўных змяненняў, што былі ўнесены ў Кодэкс аб зямлі, і якія непасрэдна закраналі правы грамадзян у галіне зямельных праваадносінаў.

Новым Кодэксам уведзена пятае па ліку мэтавае прызначэнне і прадугледжана магчымасць афармлення правоў на зямельныя ўчасткі для абслугоўвання кватэры ў блакіраваным жылым доме.

Пра грашовы бок зямельнага пытання

— Магчыма, варта пачаць з таго, што, у адпаведнасці з палажэннямі Кодэкса аб зямлі, зямельныя ўчасткі будуць перадавацца з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную ўласнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь не па нарматыўнай цане, як было раней, а па іх кадастравым кошце. Іншымі словамі, выходзячы з разліковай грашовай сумы, якая адлюстроўвае каштоўнасць (карыснасць) зямельнага ўчастка пры выкарыстанні яго па наяўным мэтавым прызначэнні і ўключана ў рэгістр кошту зямельных участкаў дзяржаўнага зямельнага кадастра, — патлумачыла Лілія Францаўна. — Далей, калі прадоўжыць «цэнавае пытанне», трэба сказаць і наступнае. Згодна з палажэннямі раней дзейнага Кодэкса аб зямлі, пры продажы зямельных участкаў цана вызначалася па пагадненні бакоў. Умоўна кажучы, можна было дамовіцца аб цане ўчастка за 10 рублёў. Цяпер жа, у адпаведнасці з новым дзейным Кодэксам, кошт зямельных участкаў вызначаецца хоць і па ўзгодненні бакоў, але ён не можа быць ніжэйшым за кадастравы кошт на момант здзяйснення здзелкі. Напрыклад, вы хочаце набыць у суседа ў садаводчым таварыстве зямельны ўчастак за чыста сімвалічную плату. Але зрабіць гэтага не зможаце, бо кадастравы кошт гэтага зямельнага ўчастка значна вышэйшы за вашу дагаворную цану. Таму, перш чым аформіць здзелку, неабходна пацікавіцца кадастравым коштам зямельнага ўчастка, які вы хацелі б набыць.

У адпаведнасці з новым дзейным Кодэксам, кошт зямельных участкаў вызначаецца хоць і па ўзгодненні бакоў, але ён не можа быць ніжэйшым за кадастравы кошт на момант здзяйснення здзелкі.

Спрошчана і дадзена больш самастойнасці

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі 1998 года вызначаў чатыры мэтавыя прызначэнні зямельных участкаў, якія маглі знаходзіцца ў прыватнай уласнасці грамадзян Рэспублікі Беларусь. Гэта, па-першае, для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання жылога дома; па-другое, для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі; патрэцяе, калектыўнага садаводства; па-чацвёртае, дачнага будаўніцтва.

Але ў выпадку, калі жылы дом з'яўляўся блакіраваным і размешчаным ў ім кватэры належалі розным людзям, узнікалі цяжкасці з афармленнем правоў на адпаведныя зямельныя ўчасткі, выкліканыя тым, што асобныя ўласнікі жылога дома адмаўляліся звяртацца па атрыманне дакументаў на свае долі ў праве на зямельныя ўчасткі.

— Таму новым Кодэксам уведзена пятае па ліку мэтавае прызначэнне і прадугледжана магчымасць афармлення правоў на зямельныя ўчасткі для абслугоўвання кватэры ў блакіраваным жылым доме, — працягвае тлумачыць новаўвядзенні суразмоўца. — Пры гэтым такая кватэра павінна быць зарэгістравана арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. Такім чынам, з 1 студзеня зарэгістраваць свой кавалачак газона ў кватэры ў блакіраваным доме грамадзяне-ўласнікі змогуць самастойна.

Дарэчы, яшчэ крыху наконт самастойнасці, дакладней, спрашчэння чарговай працэдуры. Як зазначыла раней Лілія Францаўна, істотна змянілася норма, якая дыктавала форму для здзелак па адчужэнні зямельных участкаў. Раней вызначалася пісьмовая натарыяльна засведчаная форма заключэння такіх здзелак. З уступленнем у сілу новага Кодэкса выключана неабходнасць натарыяльнага засведчання. З-за гэтага здзелкі з зямельнымі ўчасткамі, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, павінны здзяйсняцца ў пісьмовай форме з абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыяй (прыгадайце колішняе БРТІ).

Уласнікі і спадчыннікі: што новага

Паводле раней дзейнага Кодэкса аб зямлі, у прыватнай уласнасці маглі знаходзіцца зямельныя ўчасткі, набытыя грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, што пастаянна пражывалі на тэрыторыі нашай краіны.

— У новым Кодэксе адсутнічае такая прывязка да пастаяннага пражывання грамадзян на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — тлумачыць далей Лілія Мароз. — Гэта азначае, што калі грамадзянін Рэспублікі Беларусь пастаянна ці часова пражывае на тэрыторыі іншай дзяржавы (скажам, у Расійскай Федэрацыі), гэта не перашкаджае яму мець права набыць ў прыватную ўласнасць зямельнага ўчастка на тэрыторыі Беларусі.

Істотна былі абноўлены і нормы, што рэгулююць парадак атрымання ў спадчыну зямельных участкаў.

Па-першае, разам з нашымі грамадзянамі цяпер замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, што з'яўляюцца спадчыннікамі, могуць атрымаць пасведчанне аб праве на спадчыну па законе, або па завяшчанні на зямельны ўчастак, які знаходзіцца ў прыватнай уласнасці спадчынадаўцы, але толькі ў тым выпадку, калі яны з'яўляюцца роднымі спадчынадаўцы. Напрыклад, маёмасць завешчана асобе, якая не з'яўляецца родным чалавекам завяшчальніку. У выпадку смерці апошняга, належны яму па праве ўласнасці зямельны ўчастак не пяройдзе па спадчыне спадчыннiку па завяшчанні, калі ён будзе з'яўляцца замежным грамадзянінам. Раней, скажам, калі памаралі бацькі, атрымаць памянёную спадчыну не магла і, напрыклад, дачка нябожчыкаў, што з'яўлялася на гэты момант замежнай грамадзянкай.

Па-другое, новым з'яўляецца і ўвядзенне нормы, што вызначае парадак атрымання ў спадчыну зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў пажыццёвым спадчынным валоданні. Цяпер атрыманне такіх участкаў можа ажыццяўляцца ў адпаведнасці з законам і па завяшчанні.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Факт

Браканьера выдаў след

Калі супрацоўнікам Салігорскай міжрайінспекцыі паведамілі пра незаконнае паляванне ва ўгоддзях, на месцы яны знайшлі след конных санных палазоў, па якіх прыйшлі ў вёску Ананчыцы.

У двары мясцовага жыхара яны і стаялі, а на іх — туша дзіка. Выкліканая следча-аператыўная група правяла агляд домаўладання, падчас якога былі знойдзены часткі тушы яшчэ аднаго дзіка, а таксама незарэгістраваная паляўнічая стрэльба і боепрыпасы да яе. Урон прыродным рэсурсам ацэнены ў асабліва буйным памеры — на суму 4,2 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У школу — не за ведамі

Зладзеі наведалі ноччу Мілейскую базавую школу, што ў Івацэвіцкім раёне — залезлі праз акно.

Узламаўшы замкі на кратах і дзвярах кабінета, выкралі адтуль камп'ютар, музычны цэнтр і тры пары тэлефонаў.

Следства выявіла, што зладзеі — мясцовыя хлопцы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Для прызначэння дапамогі трэба здаць у бухгалтэрыю даведку

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З Дзяржынскага раёна патэлефанавала жанчына, якая папрасіла дапамагчы разабрацца з сітуацыяй, у якую трапіла жонка яе пляменніка, што пражывае ў Стаўбцоўскім раёне. Потым, дарэчы, звярнулася да нас і сама гэтая жанчына. Сутнасць праблемы заключалася ў тым, што пасля нараджэння ў мінулым годзе другога дзіцяці маці дагэтуль не атрымала ні рубля дапамогі на яго, хоць, паводле слоў заяўнікаў, своечасова стала на ўлік па цяжарнасці (у тэрмін да 12 тыдняў). У далейшым звярталася ў бухгалтэрыю па месцы працы мужа, аднак і пасля гэтага дапамогу атрымліваць не пачала. Як казалі жанчыны, то быццам бы нейкіх даведак не хапала, то грошай у гаспадаркі не было.

Але высвятленне акалічнасцяў справы паказала, што ўсё было крыху інакш, чым выклаў рэдакцыі адзін бок. Таму па зразумелых прычынах дакладны адрас жыхарства і прозвішчы заяўнікаў мы называць не будзем. А меркаванне другога боку па нашай просьбе выклала начальнік управлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Стаўбцоўскага райвыканкама Наталля Лапко, якая папярэдне праверыла апісаную вышэй інфармацыю.

— Жанчына нарадзіла другое дзіця ў жніўні, аднак у бухгалтэрыю гаспадаркі, дзе працуе яе муж, упершыню асабіста з'явілася толькі 13 студзеня, як сказалі мне яе работнікі. Справа ў тым, што ў гэтым СВК маці не працавала раней і не працуе зараз, увогуле, пераехала ў вёску з Мінска. Таму, каб атрымліваць дапамогу на дзіця, нават не яна сама, а яе муж павінен быў звярнуцца па месцы працы ў камісію, што, як правіла, складаецца з супрацоўнікаў бухгалтэрыі. Каб была прызначана выплата дзіцячай дапамогі па месцы працы мужа, неабходна было ў абавязковым парадку здаць некалькі даведак, — патлумачыла Наталля Аляксандраўна. — Па-першае, даведку, што яна не працуе (з цэнтра занятасці, сельскага Савета, дадаткова пры неабходнасці падаўшы копію працоўнай кніжкі). Па-другое, даведку, што ніякіх выплат па лініі органаў сацыяльнай абароны ёй не прызначалася. У нашым выпадку гэтая папера павінна была быць дастаўлена з ранейшага месца жыхарства жанчыны. Менавіта гэтай даведкі ў маці і не было, яна здала толькі копіі пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей.

Як заўважыла далей Наталля Лапко — і гэта галоўнае — права на атрыманне дапамогі на дзіця па месцы працы мужа жанчына мае. Яно будзе захоўвацца за ёй яшчэ да ліпеня гэтага года. Але зноў жа — аформіць выплату дапамогі можна будзе толькі пры падачы пералічаных вышэй даведак. «Я параіла работнікам бухгалтэрыі не толькі на словах патлумачыць вашай заяўніцы, якія паперы патрэбныя, але і выслаць ёй афіцыйна гэты спіс — каб не ўзнікала пытанняў у далейшым».

Паводле слоў суразмоўцы, дапамогу на першае дзіця заяўніца афармляла праз райсабес па месцы ранейшага жыхарства ў Мінску. Магчыма, адсюль у яе і ўзнікла нейкае непаразуменне сітуацыі? Хоць, з іншага боку, высветлілася, што пры афармленні статуса маці-адзіночкі (тады заяўніца яшчэ не ўступіла ў шлюб), яе папярэдзілі: у выпадку змены сямейнага статусу яна абавязана папярэдзіць органы сацыяльнай абароны. Аднак гэтага патрабавання жанчына не выканала, і ёй было пераплачана 280 тысяч рублёў. Гэтыя сродкі, заўважыла Наталля Лапко, ёй давядзецца вярнуць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Падрабязнасці

МІЛІЦЭЙСКІЯ ПРЭМІІ З КРЫМІНАЛЬНЫМ «ПАХАМ»

атрымлівалі шэраг высокіх начальнікаў палка патрульна-паставой службы УУС Гомельскага аблвыканкама. Гэта інфармацыя стала вядома службе ўласнай бяспекі ўпраўлення. Пасля чаго пачаліся адпаведныя праверкі фактаў. Да іх падключыліся і супрацоўнікі абласной пракуратуры.

Па інфармацыі начальніка аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Уладзіміра Емяльянчанкі, узбуджана крымінальная справа па артыкуле «Перавышэнне службовых паўнамоцтваў». З 2004 па 2008 — у палку праводз

БОЛЬШАЯ ЧАСТКА ЛЕДНІКОЎ РАСТАЕ ПРАЗ 40 ГАДОЎ

Вялікая колькасць леднікоў на нашай планеце растае з такой хуткасцю, што ўжо да сярэдзіны гэтага стагоддзя яны могуць цалкам знікнуць, паведамляе брытанскае выданне The Guardian. Згодна са статыстыкай сусветнай службы назірання за леднікамі, зараз аб'ёмы гэтых утварэнняў дасягнулі крытычна нізкай адзнакі за многія тысячы гадоў.

Вядучыя эксперты гэтай службы паведамляюць, што, нават згодна з умеранымі мадэлямі працэсу глабальнага пацяплення, у маленькіх леднікоў няма шанцу на аднаўленне. Менавіта раставанне леднікоў можа стаць самай сур'ёзнай праблемай змянення клімату на планеце. Спецыялісты падлічылі, што хуткае раставанне леднікоў можа паставіць пад пагрозу якасць пітной вады для амаль 2 млрд чалавек.

Гаворка ідзе галоўным чынам аб невялікіх горных ледніках у Пірэнеях, Скалістых гарах, Альпах і інш. Вялікія леднікі на Алясцы і ў Гімалаях растаюць не так хутка, але таксама растаюць. Паводле прагнозаў экалагічнай камісіі ААН, толькі ў найбліжэйшыя 30 гадоў могуць растаць да 80 працэнтаў гімалайскіх леднікоў.

Сяргей ПАЛІНІН.

На слыху

«Прысмакталіся» да прадуктаправоду

Глыбокай ноччу паблізу вёскі Папкі Міёрскага раёна супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і аддзела крымінальнага вышуку мясцовага РАУС затрымалі двух прайдзісветаў, якія краліі дызельнае паліва.

40-гадовы вясковец з Браслаўскага раёна разам з 29-гадовым жыхаром Міёраў «здабывалі» паліва з нафтапрадуктаправоду прадпрыемства «Захад-Транснафтапрадукт» — ўрэзаліся ў трубу. Як высветлілася, падобны «бізнэс» для затрыманых не новы: несанкцыянаваны адбор дызельнага паліва яны ажыццяўлялі з верасня мінулага года. Такім чынам, паводле папярэдняй інфармацыі, крымінальны «дуэт» «высмактаў» за ўвесь час з прадуктаправоду каля 12 тон паліва на агульную суму 24 мільёны рублёў.

«Бізнэс» расіяніна

36-гадовы грамадзянін Расіі, якога раней ужо прыцягвалі да крымінальнай адказнасці за тое, што ён выкарыстоўваў жанчын для занятку прастытуцыяй і падрабляў дакументы, зноў злоўлены за руку: гэтым разам яго «спалілі» дзяўчаты з Віцебскай вобласці.

У снежні мінулага года яму ўдалося вывезці ў Маскву для гандлю сваім целам дзвюх жанчын — з Полацка і Міёрскага раёна. Абедзве «пратэжэ» гандляра — жанчыны 23 і 24 гадоў, нідзе не працавалі.

Ігар ГРЫШЫН.

«Пакахай мяне, бабуля...»

Вось так, прама ў лоб, і заявіў жыхарцы горада Калінкавічы малады чалавек, які добра «ўрэзаў» спіртнога. Бабуля ледзь не аслупянела ад такой нахабнай прапановы і пачала ў сваёй кватэры асцярожна вучыць-угаворваць нечаканага «ўхажора». Маўляў, мне ж, дзіцятка ты такое, ужо васьмідзясяты гадок пайшоў, а табе — толькі дзевятнаццаць. Ты па ўзросце ў праўнукі мне раўня. І гэтак далей у падобным плане.

Хлапец на хвіліну задумаўся. На хвіліну. Ды толькі ачмурэлы ад алкаголю розум павёў гэтага лайдака (ён нідзе не працаваў) і хулігана (раней зведаў лаву падсудных) па крымінальным кірунку. Без усялякіх слоў ён накінуўся на старую і пачаў яе лупцаваць так, што тая пазбавілася ўсіх сваіх сілаў, і нягоднік згвалтаваў яе.

Прыкладна тое ж самае здарылася і ў Гомелі, калі 25-гадовы хлопец прыйшоў у госці да сваёй знаёмай дзяўчыны, сілком «узяў» яе. У Лельчыцах у дзве гадзіны ночы 15-гадовая вучаніца (хто з бацькоў дазволіў ёй у такі час знаходзіцца на вуліцы?) двойчы была згвалтаваная спачатку ў пустым будынку, а затым у падвале аднаго з дамоў незнаёмцам, прыкметы якога запомніла. Дзяўчынка з абмарожанымі ступнямі была дастаўлена ў бальніцу.

Па ўсёй «праграме» вырашыў жыць у сваё задавальненне і адзін малады абібок, што пасяліўся ў вёсцы Новая Мільча Гомельскага раёна ў доме адной гаспадыні як кватарант. Якія ў яго былі планы наконт будучыні, вядома толькі яму. Але факт застаецца фактам: хлопец пачаў «падбіваць клінні» да ўладальніцы жылля і ўсяго яе багацця. А тая — ні гу-гу. Маўляў, і без цябе абыдуся. Тады, добра падпіўшы, «закаханы», вылучыўшы момант, у гадзіну ночы ўзброіўся нажом і пачаў, гуляючы-памахваючы ім перад жанчынай, выказваць ёй свае «атэлаўскія» пачуцці: маўляў, калі — не, дык... Задуманую справу па згвалтаванні сваёй ахвяры прайдзісвет не давёў да лагічнага канца па прычынах, што не залежалі ад яго.

Па ўсіх названых фактах узбуджаны крымінальныя справы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Ад аховы ўцячы не ўдалося

Грамадзянін адной з прыбалтыйскіх дзяржаў, знаходзячыся ў беларускай сталіцы, збіў у кавярні мясцовага жыхара і адабраў у яго кашалёк з грашыма.

Спрабуючы ўцячы са здабычай ад прыяцеляў пацярпелага, ён ускочыў у машыну свайго земляка, які яго чакаў. Група затрымання Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь на службовым аўтамабілі дагнала прыезджых і прымусіла іх спыніцца. А суд Ленінскага раёна Мінска «аценіў» непрыстойныя паводзіны замежнага госця ў 3 гады 5 месяцаў пазбаўленнем волі з адбыццём пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Валерый ДАШКОЎСКІ,
начальнік Ленінскага (г. Мінска) аддзела Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, маёр міліцыі.

Такая работа

У нашай краіне, дзякуй Богу, не бывае землятрусаў, ураганаў ці смерчаў, аднак ад непрадбачаных сітуацый ніхто не застрахаваны. Каб быць гатовымі вызваліць чалавека, скажам, з-пад зруйнаванага будынка, ведаць, як яму дапамагчы, працуе кіналагічная служба рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.

У рэспубліканскі дзіцячы рэабілітацыйны цэнтр прыехалі лабрадоры МНС.

Чатырохногім супрацоўнікам ужо даводзілася паказваць сваю падрыхтоўку да непрадбачаных сітуацый. Сваё першае баявое заданне яны выконвалі ў 2004 годзе, калі ў Краснаполлі Магілёўскай вобласці абваліўся дах школы.

— Сабакі былі тады яшчэ маладыя, толькі пачыналі сваё навучанне, але нічога, добра спрацавалі, — успамінае **начальнік кіналагічнай службы Ігар КРАКОЎСКІ.** — Выклікалі нас і ў Валожын, Слуцк, Калодзішчы.

У кожнага кінолага (іх у рэспубліканскім атрадзе спецыяльнага прызначэння тры) свой «уласны» сабака, якога спецыяліст даглядае, трэніруе. Лабрадоры кіналагічнай службы МНС вельмі запатрабаваныя. Іншы раз за справамі спецыялісты вымушаны адмаўляцца ад запрашэння прыняць удзел у чарговым спаборніцтве. Хацелася не «раздуваць» штат сваёй службы і ў той жа час мець навучаных сабак, таму нарадзілася ідэя стварыць валанцёрскі рух на Беларусі. Гэта ўжо шырока выкарыстоўваецца ў Расіі, ва Украіне, іншых краінах замежжа. Ідэя валанцёрскага руху такая. Людзі, у якіх дома жывуць сабакі і якія захочуць выкарыстаць здольнасці сваіх падапечных ратаваць людзей, могуць быць уключаны ў рэзерв пажарна-аварыйна-выратавальнага атрада, які функцыянуе ў кожнай вобласці і выклікаецца на самыя розныя здарэнні. Іншы раз патрэбна і дапамога навучанага сабакі. Мяркуецца, што валанцёры пройдуць пэўнага кшталту заняткі, тэсты, якія ўжо на першых этапах дазволяць выявіць, ці падыходзіць сабака і яго гаспадар для такой работы. Тых, хто прайшоў адбор, спачатку чакае падрыхтоўка па агульным курсе, потым — па спецыяльным. Калі чалавек і яго сабака ўсё гэта вытрымаюць і камісія прызнае іх годнымі, то яны будуць залічаныя ў рэзерв выратавальнага атрада. «Набор» ужо аб'явілі, людзі тэлефануюць, выказваюць жаданне прыняць удзел у незвычайнай «аперацыі».

А пачыналася ўсё пяць гадоў таму. У той час ужо існавала кіналагічная служба ў міністэрстве ўнутраных спраў, пагранічных войсках, міністэрстве абароны, а ў МНС яе не было. (Можа таму, што, на шчасце, надзвычайных сітуацый у нашай спакойнай Беларусі не так шмат.)

Першых шчанюкоў набылі ў кіналагічным цэнтры пагранічных войскаў у Смаргоні. І пачалося навучанне... Для сабак былі пабудаваны вальеры, дзе яны адпачывалі, і дрэскомплекс, дзе яны трэніраваліся. З дапамогай розных перашкод, падземных лабірынтаў, бар'ераў, хісткіх паверхняў і падвесных прыстасаванняў сабакі вучыліся пераадольваць свой страх, каардынаваць рухі, скакаць. Усе трэнажоры дрэскомплексу кінолагі для сваіх гадаванцаў рабілі самі. «Мысленчы працэс». На тэрыторыі дрэскомплексу лабрадоры праходзяць агульны курс дрэсіроўкі, затым іх чакае вучоба па спецыяльнай методыцы.

Але не кожны сабака падыдзе для працы ў кіналагічнай службе. Напрыклад, у міліцыю ці пагранічныя войскі набіраюцца «супрацоўнікі», якія павінны мець не толькі рабочыя якасці, неабходныя ў названых службах, але і валодаць агрэсіўным характарам. Толькі ў гэтым выпадку яны змогуць затрымаць і абязбройць злачынца. Гадаванцы ж кіналагічнай службы МНС ні ў якім разе не павінны праяўляць злосць да чалавека. І калі сабака па характары агрэсіўны, ён ратаваць людзей не можа і выбракоўваецца.

Яшчэ адна асаблівасць падрыхтоўкі лабрадораў. Напрыклад, у мытні, каб навучыць сабаку знаходзіць наркотыкі ці выбухоўку, гадаванца трэба прывучыць да гэтага паху. Ведаючы яго, сабака «пакажа», дзе знаходзіцца забароненае. А вось кіналагі-выратавальнікі вымушаныя падчас трэніровак увесь час «змяняць» пах «аб'екта», каб лабрадоры не прывыклі да яго.

Каб даць сваім падапечным зразумець, што людзі могуць пахнуць па-рознаму, знаёмілі спецыялісты сваіх лабрадораў і з рэзкімі пахамі бамжоў і п'яных. Сабака і такія пахі павінен трымаць у галаве, памятаць іх. А то, не давядзі Бог, дом абваліцца, а ў падвале — бомж. Тады сабака чмыхне і не стане шукаць чалавека.

Калі гадаванцы МНС набраліся вопыту, даказалі, што і яны не лыкам шытыя, разам з кінолагамі пачалі ўдзельнічаць у паказальных выступленнях, выязджаць на рознага кшталту спаборніцтвы за мяжу. Былі ўжо ў Расіі, Польшчы, Украіне. Акрамя спаборніцкага вопыту, гэтыя сустрэчы павышаюць прафесійны ўзровень сабак. Бо і падчас такіх несапраўдных, падманных... лячыць людзей. Тры гады таму, па ўласнай ініцыятыве, спецыялісты рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння распачалі праграму «Догатэрапія», вырашылі выкарыстаць асабліваго характару сваіх гадаванцаў для лячэння маленькіх пацыентаў Рэспубліканскага дзіцячага рэабілітацыйнага цэнтра. Гэта ідэя нарадзілася выпадкова.

— Неяк мы былі на семінары ў Польшчы, — успамінае Ігар Кракоўскі. — І там убачылі машыну з надпісам «Догатэрапія». Пасля размовы са спецыялістамі, высветлілася, што яны возяць сваіх гадаванцаў у дамы састарэлых. Кінолагі расказвалі, што аднойчы звазіўшы сваіх сабак да адзінокіх людзей і ўбачыўшы, колькі радасці ім прыносіць жвавая жывая істота, яны ўжо не змаглі спыніцца і пачалі ладзіць такія сустрэчы пастаянна. Старэнькім бабулі ці дзядулю, якія вядуць маларухомы лад жыцця, да якіх не так часта, як ім хацелася б, наведваюцца родныя, дастаткова было толькі кінуць мячык сабаку (а той, у сваю чаргу, лізне ў адказ), як у чалавека загараюцца вочы, і ўжо не такім непатрэбным здаецца жыццё. Ён бачыць, што і яго любяць, любяць проста так, бескарысліва.

Тады мы вырашылі зрабіць нешта падобнае ў нас, пачалі кантактаваць з кіраўніцтвам дзіцячага рэабілітацыйнага цэнтра і прапанавалі ім такую паслугу.

Першы раз, як расказаў Ігар Уладзіміравіч, да дзяцей было ехаць страшнавата, сваю боязь наконт сабак выказвалі таксама ўрачы Цэнтра. Але ўжо пасля першага візіту стала зразумела, што ўсе гэтыя страхі былі дарэмныя. Лабрадоры паказалі, што здольныя ісці на кантакт. З таго часу маленькія пацыенты з нецярпеннем чакаюць дня, калі зноў убачаць сваіх любімых «лекараў». А махнатыя «дактары» наведваюцца ў цэнтр два разы на тыдзень.

Для часцейшых візітаў не хапае часу, а менш прыязджаць — не мае сэнсу, — кажа начальнік кіналагічнай службы.

Станоўчы эфект ад такіх «працэдур» быў заўважаны ўжо пасля першых сеансаў догатэрапіі: палепшыўся псіхічны стан хворых. А дзе ж ён не палепшыцца, калі такая міленькая, ласкавая, добразычлівая істота так і круціцца каля дзіцяці. Хворыя, якія пакутавалі ад болю ў нагах, калі гулялі з лабрадорамі, забываліся пра боль і з вялікай радасцю пакідалі інвалідныя каляскі. А малым з хворымі ручкамі кінолагі прапаноўвалі проста пагладзіць сабачку, кінуць яму мячык. І гэтага бывае дастаткова для станоўчых вынікаў.

Вельмі многія бацькі, убачыўшы ўплыў, які робіць сабака на іх дзіця, паспяшаліся завесці хвастатага сябра дома. Ласкавая жывая істота, што ўвесь час з табой, не адвернецца і не пакіне цябе за тваёй немачы, а будзе заўсёды побач, здольная калі не вылечыць цалкам, дык палепшыць настрой.

— Калі я першы раз убачыў, як маленькая дзяўчынка ў інвалідным калясцы смяецца-заліваецца, пазіраючы на нашу Гарду, даў сабе слова, што зробім усё магчымае, каб такія сустрэчы адбываліся і далей, — дзеліцца Ігар Кракоўскі.

Акрамя бясспрэчнай карысці для дзяцей, у візітах ёсць карысць і для кіналагаў: іх гадаванцы адаптуюцца да людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Сабака прывыкае, што яго гладзяць не так, як заўсёды, не так, як заўсёды, гуляюць з ім. Ён пачынае разумець, што і такія людзі бываюць, «уключае» іх у сваё кола. Гэта вельмі важна, бо ніхто не ведае, на які выклік паедзе сабака ў наступны раз. Калі ён не будзе ведаць пра такіх людзей, то проста не зразумее, што і іх у выпадку няшчасця трэба шукаць.

У будні і святы, летам і зімой, днём і ноччу стаяць яны на варце. Ім не патрэбныя медалі і ўзнагароды, высокія пасады і гучныя словы. Толькі каб задаволены гаспадар ласкава пачасаў за вухам і сказаў: «Малайчына, справіўся!»

Марына ЛЯВОШКА.
Фота
з асабістага архіва
Ігара КРАКОЎСКАГА.

У ШЭРАГАХ КІНОЛАГАЎ З'ЯВІЦЦА ВАЛАНЦЁРЫ

Простая мова

Каб сказаць... І ПАЧУЛІ!

Усё, як ва ўсіх, ці ў многіх — раніца, прыпынак, газетны шапік, тралейбус...

Калі хочацца нешта змяніць — еду ў метро.

— Ты на трактарным садзілася? — даверліва пытае старэнькі дзядок.

— Ну...

— От там людзі добрыя!.. Ну скажы...

— Ды людзі, як людзі, — паціскаю плячыма, — розныя...

— Не, ты не ведаеш. Яны — добрыя! Такіх пашукаць яшчэ!.. Я ўчора ў краму туды паехаў. І собіла ж — пальчатку з кішэні вытрас. Так шкода было — проста ноч не спаў — цёплая, скураная, новая... Сёння паехаў — без надзеі, так, на ўсякі выпадак... Гляджу — на падваконні ляжыць. За вечар ніхто не ўзяў!.. Во якія людзі на трактарным!

...Пра іх — такіх сумленных, такіх прыстойных («ведама рабацягі!») — дзядок гаварыў досыць гучна. І доўга. Пасажыры — цярпліва зносілі — слухалі, усміхаліся.

І, дзякаваць Богу, ніхто з іх дзядку не сказаў, што разгадка тут простая, што пальчатка — адна — нікому не патрэбна.

Аблом

Леначка — маладзіца прыгожая. І вольная — у сэнсе — не замужам, хоць некалі і была (афіцыйна, здаецца, двойчы?). Не супраць сходзіць (нават выйсці!) яшчэ. Але каб за маладога, прыгожага, само сабой — непітушчага, дужага, багатага, інтэлігентнага...

Такія — Лена ведае ўжо — на дарозе не валяюцца, яны ў сем'ях жывуць і зімой (ёй дакладна гэта сказалі!) у санаторыі ездзяць.

Узяла пуцёўку і яна, прыехала.

— Як тут — наконт мужчын? — адразу спытала ў доктаркі.

— Ды як заўсёды — не зразумела тая, — лыжнікаў шмат...

— А на каторага ўвагу звярнуць? — загарэлася вока ў прыезджай.

— Гэта вы самі рашайце, — не ўзялася спрыяць ёй жанчына. Але дадала, — па той вунь сцежачцы яны ў сталоўку зараз будуць ісці. Усіх і ўбачыце.

Каб лепей было — ну, убачыць, разгледзець — Леначка, акуляры надзела, у шыбу ўткнулася: у сталоўку і насамрэч ішлі мужчыны — хто з адной палачкай, хто з дзюма.

Як сапраўдныя лыжнікі.

Інь і ян*

— Дзі-ма, дамоў! — на хвілінку адкрыўшы акно, гукае суседка.

— Мам, ну яшчэ паўгадзінкі?! — просіцца малы.

Адліга на дварэ — ён з сябрукамі крэпасць будуе. Падобна — за прараба там, а «праекта» няма. Значыць, і ў даўжыню яе можна цягнуць, аж пакуль не збрыдзее, і ў вышыню, пакуль, крый Божа, пуп не парвеш... Снегу — хоць адбаўляй, запалу ў дзяцей — таксама.

Зрэшты, у двары — не толькі яны: непадалёк хтось з дарослых шчыруе — мужчына. Малады. І дзяўчынка з ім — гадоў, мо, васьмі. Не іначай — бацька з дачкой? Бабу лепяць...

Паназіраць за гэтым працэсам часу, на жаль, не было. Але ж позна ўвечары хвілька нечакана знайшлася. І (пры таямнічым свеце ліхтароў) я ўбачыла вынік: крэпасць, як крэпасць, нічога асаблівага. А вось бабы (хай даруецца гэта слова!)... Адна — ладненькая, пышная, з прыгожым тварыкам і «вянком» на галаве (з травы, з сухіх кветак), другая...

Другая крыху паводдаль стаяла — з танюткім, «точаным» станам, з... роўнай (амаль што) спінкай, з рукамі як у Венеры Мілоскай, з дзвюма невялічкімі, акуратнымі грудкамі... З галавой. Без твару.

Тую, першую, без сумневу, ляпіла дзіця. Гэту — напэўна, бацька?

Цуду не будзе?

Сталіца, крама, чарга — ужо на выхадзе, каля касы, але не раздражняе (калі час ёсць). Напэўна, таму, што побач, на палічках, проста бязлік нейкай драбязы — можна паразглядаць, папрыцэньвацца, можна штось пакласці ў карзіну.

Бляшаначка вось — прыгожая, а ўжо надпіс на ёй (пачуйце!): «Чудовій чай...».

Не ўпэўнена, што ён і сапраўды такі ўжо «чудовій», але ўзяць — падмывае: назва «спрацоўвае»...

Акурат таксама ў нашай краіне, за межамі яе (асабліва за блізкімі) «працавалі б», напрыклад, «Цудоўныя цукеркі». Нашы. І насамрэч цудоўныя!

Калі б былі.

Без адказу

Некалі, выдаўшы ў Маскве чарговую кніжку і атрымаўшы ганарар, знаёмая пісьменніца купіла пад Мінскам дачу.

Цяпер, расказвала, каб кніжку выдаць, тую дачу трэба прадаць. Альбо — шукаць спонсараў. Альбо з кожнай пенсіі выкройваць нейкую капейчыну і (хай праз гады, хай тыражом у 50 ці 100 асобнікаў!), але ўсё ж надрукаваць — для сябе, для сяброў-прыяцеляў...

А што застанецца, можна і ў кнігарню потым занесці. Не сказаць, каб дужа ахвотна, але іх там бяруць — на камісію.

— Сколько вы хотите за 1 экземпляр? — прымаючы, спытала ў пісьменніцы прыгожая маладзіца.

— Ну, мо тысяч 8...

— Замечательно, — згадзілася дзеўка, яркімі «капцюркамі» пабарабаніла па лічбах калькулятара, сказала:

— Тогда в продаже она будет 15.

— Ды хто ж яе возьме за гэткія грошы?!.. — разгубілася пісьменніца.

— Не волнуйтесь: кому надо — возьмёт.

...Ні ёй, ні мне, ні вам ніхто, відаць, не адкажа на простае, як быццам пытанне: каму ўсё гэта «надо»?

Сіла слоў?

Зміцер — як Дзед Мароз — прыходзіць рэдка і з прысмакамі. Апошні раз ён быў летам, з булачкамі-пірожнымі, з апельсінамі і з ладнай бляшанкай зялёнага чаю. Дастаў, як цяпер гэта помню, гучна паставіў на стол, сказаў: во, маўляў, гэта я спецыяльна — каб вы мяне ўспаміналі.

Мог бы і не казаць, бо спрацоўвала штось міжволі — варта было захацець таго чаю, варта заварыць... А ўжо п'ючы ды кагось частуючы, дык нават расказаць кожны раз, і які гэта, і дзе ўзялі...

З месяц таму чай скончыўся, купілі новы. Але, заварваючы, усё роўна ўзгадваем той зялёны, стары — Зміцераў. І — адпаведна — яго.

Сіла слоў? Рэфлекс? Ці штось іншае?

Дым не сорам?

Будаваць навучыліся: не дом па суседстве, — карцінка, бо на пагорачку, на рагу дзвюх вуліц, «падкоўкаю», з аркай пасярэдзіне. Да таго ж — расфарбаваны. А ўжо абсаджаны — не нейкімі там бярозкамі-клёнамі, а прыгожымі туйкамі.

Праўда, «параслі» яны вельмі нядоўга — зніклі. Нехта казаў, што дачнікі скралі, нехта...

Каляжанка пісала: іх дом два гады «на капіталцы быў» — трубы-вокны мянялі, сцены ўцяплялі, бялілі...

Здаваць аб'ект высокаму начальству збіраліся. Таму, для паўнаты ўражанняў, вакол дома туй насадзілі — хай ведае, маўляў, які бачыць!

Аднак, планы ў начальства змяніліся — замест гэтага аб'екта, яно на іншы сабралася. А лішніх туй не было, таму дрэўцы... павыкопвалі і павезлі туды.

Так што і гэтыя, мо, не на дачах недзе растуць, мо, «працуюць» дзесь — дым у вочы пускаюць.

«Родна́я...» — не родная

...У той універсам мы, хоць зрэдку, але заязджалі, бо ён пры дарозе, лічы, дакладней — пры шашы. Відаць, ад яе ў гандлёвага пункта і назва была — «Гродна».

Колькі часу назад магазін зачынілі — здалёк яшчэ бачна было — на вялікі рамонт.

Не так даўно ён скончыўся, але чым — глядзець не хацелася. Шыльда ўразіла мякка кажучы. Нашы сімвалы пры ёй — буслік, буслянка. І назва — «Родная сторона».

Паводле задум «бацькоў-заснавальнікаў», гэта павінна лепей гучаць, чым «Родная старонка», «Родны кут», «Родны край»? Гэта — павінна прыцягваць, вабіць пакупніка...

За ўсіх не скажу. Мы — праязджаем міма.

Перад выбарам

Чорны вечар, белы снег. Валіць, як пух з парваній пярыны — шапкі-хусткі няма, парасона таксама. Прычым — не толькі ў мяне: лічы, усе на прыпынку пад астрэшак схаваліся. Скіравала туды, нават падбегла ўжо — хваляй (дыму, смароду... Кураць, здаецца, усе?!) «аднесла» назад, «паставіла» крыху паводдаль. І... перад выбарам: што рабіць — мокнуць? Ці ўсё ж схавацца і дыхаць, чым давядзецца?..

З дзвюх бедаў, як і варта было чакаць, выбрала меншую — гэта значыць, дыхала. А каб лягчэй было, сама сябе ўшчувала: бач, маўляў, якая прынцэса знайшлася — з курцамі ёй пастаяць «западло»... Нейкіх дзесяць хвілін — пакуль аўтобус прыйдзе. А нехта ж з імі ў адной хаце жыве, у адным ложку спіць...

Прывычка — страшная сіла. І шкодная. У поўным сэнсе гэтага слова.

Каб сказаць... І пачулі

Вечар. Гасцініца. Пакой, як добрай бабе сесці, але ўсё ў ім ё — і ложак, і стол, і крэсла ды што там — нават карціна, радыё! Прычым, знаёмае — дома калісь такое было. Прыемна пагладзіць (ды што там — нават пагладзіць!), прыемна павярнуць рычажок. І... аж сесці, пачуўшы адтуль даўно знаёмае, здаўна любімае, пранікнёна-пяшчотнае:

«Ты — моя мелодия,
Я твой преданный орфей...»

Магамаеў. Незабыўны, непаўторны голас. З таго свету, можна сказаць... Колькі ж гадоў, на гэтым, яго не чуваць было?!

...Для таго, каб зноў загучаць (хоць у запісах), для таго, каб свету — гэтаму — яшчэ раз «сказаць», кім ты быў і якім, трэба... памерці.

Не толькі артысту.

Валянціна ДОЎНАР.

*Паводле старажытнай кітайскай філасофіі, у прыродзе «інь» — жаночы пачатак, «ян» мужчынскі.

«Два полюсы»

ВАМПІРЫ – ЖОНКІ, МУЖЫ І КАЛЕГІ...

Сусветны фінансавы крызіс... Колькі іх было за гісторыю чалавецтва і колькі будзе? Пачынаюцца яны (па даследаваннях некаторых вучоных, прадказальна), завяршаюцца... Тэлевізар цяпер часта нагадвае энергетычнага вампіра. Між тым энергетычныя вампіры былі, ёсць і будуць, нягледзячы на фінансавыя і кліматычныя катаклізмы. Яны побач з намі. А мо і вы, я таксама — тыя самыя вампіры і ёсць?

Пасля сустрэчы з вампірамі міжволі адчуваеш, што сілы сыходзяць, нічога не хочацца рабіць, наогул нейкі час не цягне на стасункі з людзьмі. Кансультант па псіхалагічных пытаннях Канстанцін Яршоў тлумачыць, што так званы энергетычны вампір — чалавек, які без асаблівага жадання «выцягвае» энергетыку ў тых, хто знаходзіцца побач. Проста не можа добра сябе адчуваць без энергетыкі іншых. Многія нават не ведаюць пра тое, што яны «вампіры».

Цікава: ці перадаецца схільнасць да вампірызму ў спадчыну? Аказваецца, што так. Як кажуць, яблыка ад яблыні. Але калі яшчэ ў дзяцінстве чалавек пачынае духоўнае развіццё — наведвае царкву, прыслухоўваецца да парад разумных людзей (хоць, пагадзіцеся, у дзяцінстве самыя вялікія аўтарытэты — тыя ж бацькі), а ў юнацтве займаецца аўтатрэнінгам, каб не дазваляць адмоўным эмоцыям кантраляваць жыццё, можна «панізіць» патрэбу ў атрыманні энергіі ад іншых. Калі бацькі шчыра любяць дзіця, кажуць яму добрыя словы, не крычаць па дробязях, верагодна, не быць яму спажывецкім вампірам. У іншым выпадку — будзе. Такі сумны «дыягназ».

Хоць, безумоўна, калі ў садку, школе і дырэктар, і некаторыя настаўнікі — вампіры, ці не будзе яшчэ слабы ў энергетычным плане чалавек патроху сам такім станавіцца? Адкуль чэрпаць энергію?

Анекдотаў пра цешчу шмат. З пункту погляду нашага «энергетычнага» пытання, тая ж цешча можа быць вампірам. Асабліва калі яна сама не замужам, або муж «не такі...». Ну, не хапае ёй энергетыкі кахання. Міжволі «зайздросціць» дачцэ, якая атрымлівае энергетыку кахання ад мужа. Толькі, калі ласка, не думайце, што гэты, напэўна, даволі спрэчны артыкул датычыцца, напрыклад, усіх цешчаў. Асабіста я ведаю таварыша, цешча якога, як кажуць, залатая.

Вось ад розных спецыялістаў па парасіхалогіі, якой і сам займаўся, часта чуў парады — старацца не глядзець у вочы вампіра. Менавіта вочы — галоўны канал абмену энергіяй. А як жа гэта зрабіць? Калі вампір проста патрабуе — што ў вочы не глядзіш? Мяне тут што, няма, чаму не глядзіш? І наогул вампір зробіць усё, каб вы аддалі яму сваю энергію ў выніку размовы, а яшчэ лепей сваркі. Сам, напрыклад, нешта няправільнае зробіць і будзе абвінавачваць вас. Пачынаеце спрачацца, нервы вашы «ніякія» ў гэты момант, гнеў, вы абураныя — а вампіру гэта і трэба. Калі вы дзеліцеся набалелым, вампір можа задаваць дадатковыя пытанні, якія выклікаюць у вас яшчэ больш адмоўных эмоцый — «дэсерт» для вампіра. І ў сваю чаргу вампір можа расказаць вам нешта «інтымнае», і ваша разуменне, словы падтрымкі разам з адчуваннем віны за тое, што не можаце яго цалкам зразумець, дапамагчы — будуць «падмацоўваць» энергетыку вампіра. Чым больш у вас пазітыву, чым меней будзеце ўнікаць у нюансы чужой праблемы (як бы жорстка гэта ні гучала), тым болей у вас шанцаў «не высахнуць» пасля сустрэчы з вампірам. Прасіце яго падзяліцца радасцю. І наўрад ці ён будзе доўга вас «катаваць».

Праверэная на практыцы парада — у такія хвіліны неабходна альбо нешта прыемнае ўзгадваюць пра гэтага чалавека, альбо наогул прыемны факт (далі нечакана прэмію). Простая ўсмешка можа справакаваць вампіра на яшчэ больш актыўныя дзеянні. Яшчэ адзін эфектыўны спосаб — уявіць паміж вамі і вампірам вадаспад, раку, шкло, люстэрка вышынёй у рост, сцяну. Што вам прасцей! Рукі і ногі «крыжам». Заўважалі, як часта сядзяць людзі на пасяджэннях, там, дзе ім няўтульна?

Дарэчы, нярэдка начальнік — «першапачаткова вампір». А як жа яшчэ? Як дасць нейкае заданне (ён жа не разумее, што яно бязглуздае) і патрабуе выканаць яго не проста дакладна, а яшчэ і як можна хутчэй. А яшчэ нечакана хутка пытае: ну як, справіліся?

Што рабіць? Узгадаць адразу, што дзякуючы яму (ёй) вы атрымліваеце зарплату (часта нядрэнную), што знаёмы вось стаў беспрацоўным. Вельмі добрая простая парада — зразумейце, што начальнік і грошы атрымлівае за тое, што вас «прымушае працаваць», «ганяе». А ў яго ж ёсць і ягоны начальнік...

Добры спосаб абароны ад вампіра — уявіць, што ён дзіця. Не будзеце ж вы перажываць з-за таго, што нейкі хлопчык на вуліцы выпадкова ўдарыў вас мячом па галаве?

Калі каханая — вампір? Віншую! Памятаеце словы з верша Пушкіна? Прыкладна так: «...Без вас мне... а з вамі...». Відаць, энергіі у яго было шмат, а яна мела патрэбу «піць кроў». Дарэчы, лічыцца, што менавіта шлюбны саюз вампіра і донара — адзін з самых надзейных. Любы сэксапатолаг, верагодна, пацвердзіць, хоць ёсць і іншыя думкі ў некаторых навукоўцаў. А рэўнасць — вампірызм? Я думаю, што не. Эксперт — што так. Чуў я ад аднаго віцебскага «знаўцы», што калі чалавек не любіць гарачую ежу, гэта прыкмета вампірызму. Знаёмы доктар, наадварот, упэўнены, што, у прыватнасці, вельмі гарачы чай, каву шкодна піць. Наконт таго, што кветкі могуць завянуць, калі прыйдзе да вас у госці вампір. Праверана, факт спрэчны. Ёсць вампіры, якія вырошчваюць прыгожыя кветкі і ніяк не ўплываюць на чужыя.

Як аднавіць сілы пасля «ўплыву вампіра»? Добрыя фільм, музыка, віно... Ды проста паляжыце на ложку, пачытайце нешта цікавае. Толькі не дзяліцеся негатывам з блізкімі, калі яны... не вампіры.

Самае незразумелае — а як адначасова чалавек можа быць і донарам, і вампірам? Бывае такое. І ягоны энергетычны стан залежыць ад канкрэтнай сітуацыі, настрою. Яшчэ больш здзіўляе, калі вампіры даюць парады, як абараняцца ад іх жа. Амерыканскія навукоўцы ў выніку даследавання зрабілі адназначную выснову — вампіраў становіцца ўсё болей, а «донараў» не хапае. А вы кажаце пра фінансавы крызіс. Станоўчай энергетыкі не хапае ў людзей. Якую не аценіць грашыма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЭЦЭПТЫ СТРАЎ ДЛЯ ВАЎКАЛАКА

Сваячку, якая сёння выходзіць замуж, напярэдадні злавіла сяброўка.

— Самае галоўнае, не забудзь пад вясельнай сукенкай абвязацца чырвонай ніткай. А то сурочыць які-небудзь энергетычны вампір... І яшчэ: на кожнае шво сукенкі прыкалі па шпільцы. І не памыліся — галоўкай уніз.

Далей ішоў доўгі пералік таго, што павінна зрабіць маладая, каб ніхто з «добрых» людзей адмоўна не паўплываў на яе будучыню. Вольга сур'ёзна паслухала ўсе парады. Яе такту і пачуцця гумару хапіла, каб не спрачацца на гэты конт з вельмі пракакананай у сваёй праўдзе маладой жанчынай, якая сама нядаўна выходзіла замуж і ўжо напэўна мела рацыю. Праўда, выкананне ўсіх «правілаў» чамусьці не вельмі ёй самой дапамагала ў сямейным жыцці. Відаць, запамятавала яна нейкую САМУЮ галоўную прыкмету. А іх столькі!!! Але ж пераказваць забаконы — гэта ўсё роўна што іх мэтанакіравана распаўсюджваць. Заўсёды знойдуцца тыя, хто будзе іх выконваць.

Былая мая знаёмая энергетычных вампіраў бачыла паўсюль. Вій ў вобразе начальнікаў і падначаленых падключаліся да яе як да электраразеткі, каб патаемна цягнуць энергію. Я памятаю, якое задавальненне дастаўляла калегам праводзіць над ёй своеасаблівы псіхалагічны дослед. Эксперымент дзейнічаў бездакорна і на соты раз правядзення. Бралася купюра, пажадана замежная, не менш чым 50-доларавай вартасці. У момант, калі Марына заходзіла ў кабінет, трэба было яе разгарнуць, пашамацець і сказаць ўсё што-небудзь прыкладна такое: грошы ёсць, пайду я сёння абедаць у рэстаран. І да яе звярнуцца быццам бы незнарок: ты не складзеш мне кампанію? Трэба было бачыць, што з ёю, беднай, адбывалася: твар некалькі разоў змяняў колер. Яна проста не магла кантраляваць свае эмоцыі і кожны раз імкнулася высветліць, адкуль у калегі такія грошы, якіх у яе няма!!! З крыкам: «Вы ўсе — энергетычныя вампіры!», яна б

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 1 (45)

Літаратуры на роднай мове павінна быць больш

Апошнія пяць гадоў у кнігавыдавецкай справе назіраецца такая тэндэнцыя: асартымент кніжнай прадукцыі, што выпускаецца, пашыраецца, а тыражы памяншаюцца. Прычым гэта характэрна не толькі для Беларусі, але і іншых краін свету. Сёння, па словах намесніка міністра інфармацыі рэспублікі Беларусь Ігара Лапцёнка, звыштыражом лічыцца пяцітысячны, 3 тысячы асобнікаў — нармальная практыка для выдання кнігі.

Наогул, летась выдадзена 13 210 назваў кніг агульным тыражом 55,4 мільёна асобнікаў (пазалетась выпушчана 12 565 найменняў тыражом у 51 мільён). Атрымліваецца, што на кожнага жыхара краіны прыпадае 5,7 кнігі.

Найбольшым попытам карыстаюцца выданні, якія нясуць чытачу дакладную інфармацыю, звязаныя з адукацыяй: гэта энцыклапедыі, даведнікі, слоўнікі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі. Зразумела, такіх кніжак і больш выходзіць у свет (сярод выдадзенай літаратуры, яны займаюць каля 70 працэнтаў).

Кніжны рынак рэспублікі летась папоўніўся толькі на 879 выданняў на беларускай мове, агульным тыражом у тры з паловай мільёны. Літаратуры на роднай мове стала менш, а павінна быць — больш.

Каб зрабіць асобныя выданні больш даступнымі па сваім кошце, дзяржава выдае іх на льготных умовах. Чалавек, які набывае такія кнігі, толькі часткова аплачвае выдаткі на іх выхад у свет. Летась пад патранажам Міністэрства інфармацыі выйшла сацыяльна-значнай літаратуры ў колькасці 131 назвы агульным тыражом каля 230 тысяч. Сярод яе — зборнікі законаў, краязнаўчая літаратура. Частка такіх выданняў накіроўваецца ў бібліятэкі краіны.

Агульная ж лічба выдавецтваў дасягае сямі соцень, прынамсі, летась зарэгістравана каля 70 новых суб'ектаў гаспадарання.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ДЭПУТАТЫ МІНГАРСАВЕТА ВЫСТУПАЮЦЬ ЗА ЗНІЖЭННЕ ЎЗРОСТАВАГА ЦЭНЗУ ДЛЯ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Нацыянальная бібліятэка павінна стаць больш даступнай для школьнікаў. Дэпутаты Мінгарсавета прапаноўваюць знізіць узроставы цэнз наведвальнікаў з 16 да 14 гадоў. Як паведамілі карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» старшыня камісіі па маладзёжнай палітыцы і сувязях з грамадскімі арганізацыямі Мінгарсавета Юрый Чэчукевіч, дэпутаты звярнуліся з такой просьбай да кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі. Паводле яго слоў, гаворка ідзе пра тое, каб даць права карыстацца бібліятэкай тым школьнікам, якія рыхтуюцца да прадметных алімпіяд. Ініцыятыва аб зніжэнні ўзроставага цэнзу належыць Маладзёжнай палаце пры Мінгарсавеце.

Вікторыя МІХНЮК, «Мінск—Навіны».

АПОШНІЯ ДНІ ПАЛЯВАННЯ

З 26 студзеня закрываюцца сезоны палявання на андатру і іншыя пушныя віды паляўнічых жывёл стрэльбавым і бясстрэльбавым спосабамі.

Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, па 31 студзеня яшчэ будзе дазволена паляванне з падыходу і з засады на дзіка любога полу і ўзросту (акрамя свінаматак), а таксама на самцоў аленя трафейнай якасці і селекцыйных жывёлаў любога полу і ўзросту.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАЕЛІСЯ ДЗІЧЫНЫ...

Супрацоўнікі Пружанскага лясгасу затрымалі двух 25-гадовых браканьераў з в. Какошчыцы і в. Мельковічы Слонімскага раёна.

А 6-й гадзіне раніцы, у лесе каля г/п Ружаны, яны застрэлілі дзіка. У браканьераў канфіскавалі стрэльбы, але самае непрыемнае для іх напарадзе, бо страты нанесены дзяржаве ў памеры 16 млн 800 тыс. рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АДЗІН ДЫРЭКТАР ПАКВАПІЎСЯ НА ХАБАР

У прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама нам паведамілі аб тым, што кіраўнік адной з сельскагаспадарчых арганізацый Буда-Кашалёўскага раёна, які быў асуджаны ў 2007 годзе, «не супакоіўся на дасягнутым».

Ён вырашыў выкарыстаць службовае становішча ў інтарэсах ўласнага кашалька. З гэтай мэтай паставіў такія ўмовы перад прадстаўніком гомельскага таварыства з дадатковай адказнасцю, што той вымушаны даць яму «на лапу» мільён рублёў. А тут у самы цікавы момант перадачы хабару і міліцыя з'явілася...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Запрашальнік

Купляйце беларускае!

Выстава-продаж «Купляйце беларускае!» адкрыецца а 12-й гадзіне ў суботу 24 студзеня ў сталічным павільёне «БелЭкспа» (пр. Пераможцаў, 14). На ёй будуць прадстаўлены кандытарскія і хлебабулачныя вырабы, рыбная прадукцыя, лікёра-гарэлачныя вырабы, мёд, трыкатажныя і дывановыя вырабы, цацкі, кнігі, мэбля, посуд, шпалеры, а таксама бытавая тэхніка ад «Віцязя» і «Гарызонта». Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі запрашае мінчан і гасцей горада завітаць на гэтую выставу-продаж, якая будзе працаваць да 31 студзеня з 10 да 19 гадзін.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Пытальнік

«Мы не такія багатыя, каб праз два гады выкідваць мапед на звалку»

Прывітанне, паважаная рэдакцыя! Звяртаюся да вас з просьбай аб дапамозе. Справа ў тым, што ў кастрычніку 2006 года я набыў мапед В-154 вытворчасці Мінскага мотавелазавода. Добра было, пакуль дзейнічала гарантыя: мне мянялі ўсё бясплатна. Але вось летась у мяне «паляцеў» тармазны барабан. Я звярнуўся ў краму ад завода. Яго адміністрацыя запісала мяне ў чаргу. Прайшло ўжо тры месяцы, а вынік пакуль нулявы і невядома, ці будзе ён лепшым у далейшым. Калі тэлефаную ў краму, толькі і чую адзін адказ, маўляў, завод не працуе. А ездзіць туды за 160 кіламетраў немагчыма, занадта дорага. І вось я падумаў: магчыма, праз вас атрымаю станоўчы адказ? Бо ў краме яшчэ кажуць, што завод спыніў выпуск гэтых мапедаў. Але ж мы набылі гэтую тэхніку і я думаю, што запчасткі завод нейкі час павінен вырабляць. Не такія мы багатыя, каб праз два гады выкідваць на звалку паўтара мільёна рублёў.

Мікалай Фёдаравіч ЖУКОЎСКІ, *вёска Сіняўка Клецкага раёна*

Па каментар мы звярнуліся ў згаданую чытачом краму ад Мінскага мотавелазавода. Там нам пацвердзілі ўсё, што і без таго ведае чытач. Прадпрыемства ўжо некалькі месяцаў не працуе, адпаведна, запчасткі ў краму не пастаўляюцца. «Ды іх ужо ніхто і не замаўляў, відавочна, з-за апошніх фінансавых падзей». Хоць, запэўнілі нас, службовыя запіскі на атрыманне патрэбных запчастак рэгулярна складаюцца і падаюцца куды трэба, ды толькі безвынікова... Калі казаць пра заяўнікаў, дык усе іх просьбы фіксуюцца ў спецыяльнай кнізе замоваў. Ехаць самастойна ў краму па запчасткі не трэба (які сэнс, калі іх няма). Калі яны паступяць у гандлёвае прадпрыемства, заяўніку пра гэта абавязкова паведамяць. Вось тады сапраўды без падарожжа не абысціся, бо па пошце іх не адпраўляюць.

Дарэчы, пацвердзілі нам і інфармацыю, што мапед мадэлі В2.154 сапраўды знялі з вытворчасці. Паводле слоў сураз моўцы, ён аказаўся недапрацаваным, да таго ж фактычна збіраўся з пакупных дэталяў. Быццам бы збіраліся выканаць уласную распрацоўку. А вось наконт запчастак супрацоўнік магазіна памыляецца, а мае рацыю наш чытач Мікалай Фёдаравіч: нават калі гэты тавар здымаецца з вытворчасці, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў», запчасткі да яго павінны вырабляць яшчэ на працягу тэрміну службы тавару, а калі ён не вызначаны, дык на працягу 10 гадоў. Але ўжо гэтае пытанне, улічваючы сітуацыю з вытворчасцю на заводзе, напэўна, не да работнікаў крамы, ды і не да адміністрацыі завода...

Па той бок прылаўка

«Гарэлка цяпер — як ніколі запатрабаваны тавар»

Апошнім часам у мінскіх крамах не заўсёды стала магчымым набыць гарэлку вытворчасці РУП «Крышталь». Магчыма, на прадпрыемстве якая-небудзь прафілактыка і прадукцыя ў гандаль часова не пастаўляецца?

На самім заводзе ўсё патлумачылі проста. «Калі ў дзень, напрыклад, мы вырабляем 21 тысячу дэкалітраў гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў, дык у гандлёвую сетку горада з гэтай колькасці штодня ідзе ад 12 да 17 тысяч дэкалітраў. Іншымі словамі, попыт на нашу прадукцыю павялічваецца, у першую чаргу — менавіта на гарэлку. Ніякіх спыненняў вытворчасці цяпер няма».

Дарэчы, у сярэдзіне мінулага года мы прыводзілі словы іншага спецыяліста прадпрыемства, які тады таксама адзначаў рост попыту на прадукцыю завода з боку насельніцтва як у самой сталіцы, так і ў рэгіёнах. Праўда, на той момант суразмоўца заўважаў, што адноснае зацішша традыцыйна назіраецца толькі ў першым квартале года — са студзеня па сярэдзіну красавіка, потым попыт зноў пачынае павялічвацца...

Наша пытанне адносна магчымага змянення цаны на гарэлку засталося без адказу. «Па тэлефоне мы такую інфармацыю не даём. Калі ў вас ёсць пытанні, рыхтуйце афіцыйны пісьмовы запыт».

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАНДАРЫНЫ ШУКАЙЦЕ НА РЫНКУ, А КУРАНЯТАЎ — У ДЫСКАЎНТАРЫ!

— Жё нэ манж па сі жур, — вучыўся прасіць на ежу ў добрых людзей Кіса Вараб'янінаў у творы Ільфа і Пятрова з-за адсутнасці ў іх з Астапам Бэндэрам грошай. Ну а калі вы трохі яшчэ маеце ў запасе «зайчыкаў» і плануеце пайсці ў краму за больш таннымі харчамі, то спецыяльна для вас учора я праманіторыў цэны і магу трохі падказаць, дзе выгадна набыць прадукты.

Для параўнання былі выбраны чатыры пункты ў сталіцы: звычайная крама № 3 Заводскага райхарчгандлю, гіпермаркет «Гіпа», дыскаўнтар «На тыдзень» і Заходні рынак. Харчы стараўся выбіраць аднолькавыя паводле вытворцы, брэнду і іншых паказчыкаў. Дзе гэта не атрымалася зрабіць — браў для параўнання больш-менш падобныя па якасці і цэнавым сегменце.

Звычайны гастраном

Як правіла, такія крамы маюць пастаянных кліентаў з ліку грамадзян, якія жывуць непадалёк, ці ім проста зручна сюды заходзіць па дарозе з працы. Зразумела, калі ў чалавека ёсць машына, то ён можа паехаць на іншы канец горада ў гіпермаркет па эканомію пры купках на тыдзень. А астатнія ходзяць у «свае» крамы.

Існуе распаўсюджанае меркаванне, што ў такіх гандлёвых пунктах цэны вышэйшыя, чым на рынках і ў гіпермаркетах. Але мая імправізаваная праверка паказала, што эканоміць можна і тут. Напрыклад, яйкі і (увага!) чамусьці апельсіны можна набываць смела і не баяцца, што трохі пераплаціў. А калі вы ідзяце па цукар, то ведайце, што кілаграм цукру-пяску ва ўсіх гандлёвых пунктах складае 2100 рублёў.

Гіпермаркет

Мне пашанцавала, што гіпермаркет у мяне пад бокам, каля дома. Таму я прывык хадзіць туды проста, напрыклад, за адным пакетам малака. А наогул асноўная кліентура вялікіх крамаў — сем'і, што прыехалі на машыне закупіцца харчамі на ўвесь тыдзень, каб потым не марнаваць час на пошук дробязяў у звычайных крамах.

З самага пачатку стварэння гіпермаркетаў перад людзьмі маляваліся міф, што там усё значна танней. У прынцыпе, так яно і ёсць, калі параўноўваць з меншымі крамамі. А калі з рынкам — то гэта не факт. Дык вось, акрамя вялікага выбару тавараў, у гіпермаркеце вы можаце па больш нізкіх цэнах набыць муку, макаронныя вырабы, кілбасу, а таксама моркву і бульбу. Найбольш мяне ўразілі 2 апошнія пазіцыі, бо я ўвесь час лічыў, што гародніна самая танная на рынку. Тут альбо яны вельмі розняцца па якасці, альбо мне пашанцавала. Дарэчы, несумненная перавага рынку пры набыцці гародніны — гэта выбар. Калі ў краме, гіпермаркеце ці дыскаўнтары ляжыць морква толькі аднаго вытворцы, то на рынку можна выбіраць не толькі па краінах-вытворцах, але і па абласцях.

Дыскаўнтар

Дыскаўнтар — гэта яшчэ больш «крутая» крама нават за гіпермаркет. Галоўная іх фішка — нібыта нізкія цэны. Можа, дзе за мяжой і так, а ў нас, як можаце бачыць па цэнах з табліцы, — гэта той жа самы гіпермаркет. Хаця некаторыя групы харчовых тавараў больш танныя і тут — напрыклад, хлеб, бройлерныя кураняты, яйкі, смятана, творог і капуста. Але каб сказаць, што нашмат — ды, не: нешта на 20 рублёў, нешта на 110, нешта на 60. Так што мільёнаў не эканоміш. Ну мо хіба на праезд у грамадскім транспарце.

Рынак

На рынках асноўны кантынгент пакупнікоў — пенсіянеры. Таму натуральна, што на рынку і асартымент прадукцыі падбіраюць мэтанакіравана. Напрыклад, я шукаў на Заходнім рынку каўбасу Ваўкавыскага мясакамбіната, бо да гэтага паўсюль звяраў цэны па ёй, а прадавачка мне растлумачыла:

— Ой, у нас тут на ўсім рынку такой няма. Бачыце, у нас тут у асноўным пенсіянеры купляюць, таму мы кілбасы больш танныя прывозім. А Ваўкавыскай года паўтара не было.

Тое самае і з малочнымі вырабамі — найбольш дарагіх брэндаў тут не знайсці. Затое цэны атрымліваюцца на рынку ніжэйшымі. Напрыклад, сюды варта ісці па рыс, грэчку, алеей, сыр, малако, сметанковае масла, цыбулю, яблыкі і мандарыны. І яшчэ адзін плюс рынкаў — гэта прадаўцы. У дыскаўнтары з паліцай не вельмі паразмаўляеш, а на рынку кожны прадавец стараецца прывабіць пастаянную кліентуру, таму тут можна і паразмаўляць, што для адзінокіх пенсіянераў мае, напрыклад, вялікае значэнне.

Калі падсумаваць уражанні ад «шопінгу», то заўважу, што асабліва вялікай розніцы паміж тым, дзе выкупіце харчы — няма. У асноўным розніца — да 100 рублёў, з-за якіх ты можаш толькі палову дня змарнаваць у пошуках танных прадуктаў. Адзінае, што калі вам трэба менавіта мандарыны — то тут варта ехаць на рынак, бо разбежка паміж цэнамі тут па 800 і больш рублёў за кілаграм.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ПАРАЎНАЛЬНАЯ ТАБЛІЦА ЦЭНАЎ НА ХАРЧОВЫЯ ТАВАРЫ*:

Прадукт	Звычайны гастраном	Гіпермаркет	Дыскаўнтар	Рынак
Рыс (пачак 0,9 кг) Грэчка (пачак 0,9 кг) Мука (пачак 1 кг)	4080 2600 2030	4080 2600 1960	3890 2890 1990	3700 2500 -
Макаронныя вырабы (пачак 0,45 кг)	2510	1790	1940	2400
Цукар-пясок (пачак 1 кг)	2100	2100	2100	-
Алей сланечнікавы (1 літр)	3950-5380	3510-4960	4090-5290	3500-4000
Хлеб ("Майскі", 0,9 кг)	1460	1470	1440	-
Сыр цвёрды (1 кг)	13900	14420	13000-14000	12200
Кілбаса вараная (1 кг) Бройлер (1 кг)	11130 7500	10510 7470	11170 7390	10610 7540
Яйкі (1 дзясятак)	3090	3840	3090	3150
Малако (1 л, 3,5%)	1340	1320	1420	1300
Смятана (230 г, 25%)	1590	1590	1560	-
Масла сметанковае (200 г, 72,5%)	-	2670	2690	2460
Творог зерневы (400 г)	3150	3150	3090	-
Мандарыны (1 кг)	6800	6300	5990	4500-6000
Апельсіны (1 кг)	4460	5470	5590	5000
Яблыкі (1 кг)	3400	3510	3490	2800-8500
Морква (1 кг)	1300	1170	1990	1500
Цыбуля (1 кг)	1730	1530	2470	1500
Бульба (1 кг)	-	960	1990 (але памытая)	1200
Капуста белакачанная (1 кг)	-	1030	960	1000

** у некаторых выпадках прадукты параўноўваліся не аднолькавыя, а ідэнтычныя.*

Ну і ну!

Прэмія за адмову ад палення

У Вялікабрытаніі цяжарныя жанчыны, якія адмовіліся ад палення, змогуць атрымаць ваўчары для аплаты пакупак на суму да 100 фунтаў стэрлінгаў.

У эксперыментальным праекце, які праводзіць падраздзяленне Нацыянальнай службы аховы здароўя Вялікабрытаніі ў паўночна-ўсходнім Эсэксе, возьмуць удзел будучыя мамы з Колчэстара і Харвіча. «Прэміяльныя» ваўчары могуць быць выкарыстаныя пры аплаце прадуктаў харчавання ў любой краме сеткі Co-op на ўсходзе Англіі. Між тым, новы праект ужо быў раскрытыкаваны ў шэрагу брытанскіх СМІ. У прыватнасці, некаторыя ўрачы назвалі прэмію за адмову ад палення «кішэннымі грашыма за дрэнныя паводзіны».

А ў Германіі ўрачы папярэдзілі аб тым, што шырокае распаўсюджанне MP3-плэераў значна павышае частату парушэння слыху ў маладых людзей. У цяперашні час пашкоджанні ўнутранага вуха назіраюцца ў кожнага пятага немца ва ўзросце ад 16 да 20 гадоў.

АД ЦЫРУЛЬНІ ДА САЛОНА

Разбежка цэнаў у мінскіх цырульнях дасягае 19 разоў, паведаміў на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Іван Мычко.

Так, комплекс у жаночай зале (мыццё галавы, стрыжка і ўкладка) каштуе ад Br8,7 тыс. (у цырульнях ААТ «Усход») да Br165 тыс. (у салоне люкс «Жак Дэсанж»).

Менш адчувальная розніца ў кошце паслуг па рамонце абутку — да 2,6 раза. Так, набойкі з поліўрэтану (плошчай да 12 кв. см) абыдуцца ад Br3480 да Br8900 тыс. Разбежка ў цэнах на паслугі хімчысткі (чыстка пінжака) — у 2 разы (ад Br11 тыс. да Br22 тыс.), на мыццё метадам самаабслугоўвання (10 кг) — у 1,3 раза (ад Br13 тыс. да Br16780).

Іван Мычко патлумачыў, што ў адпаведнасці з дзейнымі нарматыўнымі дакументамі па цэнаўтварэнні ўсе суб'екты гаспадарання, незалежна ад формаў уласнасці і падначаленасці фарміруюць цэны на бытавыя паслугі самастойна, зыходзячы з затрат на іх аказанне, усіх падаткаў, непадатковых плацяжоў і ўзроўню рэнтабельнасці з улікам якасці паслуг і кан'юнктуры рынку (за выключэннем сацыяльна значных і паслуг прадпрыемстваў-манапалістаў).

Выходзячы з попыту і прапановы, без эканамічнага абгрунтавання цэны на паслугі фарміруюць індывідуальныя прадпрымальнікі, якія прымяняюць спрошчаную схему падаткаабкладання або плацяць адзіны падатак, а таксама юрыдычныя асобы, якія прымяняюць спрошчаную схему падаткаабкладання і вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і выдаткаў.

Разам з тым, улічваючы сацыяльную накіраванасць бытавых паслуг, у пэўнай меры дзяржава рэгулюе цэны на сацыяльна значныя паслугі: на паслугі цырульняў (акрамя салонаў і салонаў тыпу люкс), лазняў, пральных, хімчысткі, на рамонт абутку, на дакументальнае фота) — шляхам вызначэння гранічнага нарматыву рэнтабельнасці не больш за 30%, на рытуальныя паслугі (у межах мінімуму) — не больш за 25 %.

На думку начальніка галіновага ўпраўлення мэрыі, розніца ў цэнах па горадзе дазваляе спажыўцу выбраць выканаўцу паслугі, зыходзячы не толькі з месца размяшчэння аб'екта, але і якасці паслуг і ўзроўню цэнаў на іх.

Бытавыя паслугі ў Мінску аказваюць больш за 2,8 тыс. суб'ектаў гаспадарання, якія аб'ядноўваюць звыш 3,7 тыс. аб'ектаў.

Аксана ШЫКУЦЬ, БЕЛТА.

Гараскоп прычосак на люты

Па шматлікіх просьбах нашых чытачоў працягваем публікацыю гараскопу стрыжак на канец студзеня — люты 2009 года, складзены ў адпаведнасці з месяцавым календаром. Для ўдалай прычоскі ўлічваем некалькі параметраў: стан Месяца (які Месяц — расце ці спадае, новы ці поўны). Лепш стрыгчы валасы на Месяц, які расце (тады яны хутчэй адрастаюць) — гэта з 26 студзеня па 9 лютага (пачынаецца наступны Месяцавы месяц). Трэба ўлічваць і Месяцавыя падзеі. Стрыжкі выдатна атрымліваюцца ў поўню (уплыў поўні дзейнічае +/- адзін-два дні).

24 студзеня. Сённяшняя стрыжка прынясе вам не толькі задаволенасць уласнай знешнасцю, але і ўдачу.

25 студзеня. Сёння лепш устрымацца ад стрыжкі, інакш могуць узнікнуць праблемы ў розных сферах жыцця. Негатыўныя звычкі і хібы праявяцца ў поўнай меры, узрасце цяга да алкаголю, а магчымасць кантраляваць свае эмоцыі, наадварот, зменшыцца.

26 студзеня. Гэты дзень быццам бы створаны для візіту да цырульніка. Стрыжка, зробленая сёння, прыцягне паляпшэнне фінансавага стану і прыхільнасць кіраўніцтва.

27 студзеня. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, не застанецца непрыкмечанай. Вашым новым выглядам будуць зачараваныя ўсе навакольныя.

28 студзеня. Выдатны дзень для наведвання цырульні: новая стрыжка прыцягне ўдачу і дабрабыт.

29 студзеня. Стрыжка, зробленая сёння, узбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: вы станеце крыху багацейшымі.

30 студзеня. Сённяшняе наведванне цырульні прынясе радасць і адновіць душэўную раўнавагу. Гэта адаб'ецца і на валасах: пасля стрыжкі яны будуць гусцейшымі.

31 студзеня. Стрыжка валасоў у гэты дзень можа прыкметна пагоршыць ваша здароўе. Сёння лепш пазбягаць змены знешняга выгляду.

1 лютага. Стрыжка пойдзе на карысць не толькі знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмацніцца праніклівасць розуму.

2 лютага. Калі пастрыгчыся ў гэты дзень, то валасы будуць лепш расці, стануць густымі і пышнымі. Але памятайце, што сёння супрацьпаказана хімічнае ўздзеянне на валасы (фарбаванне, завіўка). А складаная ўкладка, зробленая ў гэты дзень, пратрымаецца нядоўга.

3 лютага. Пасля стрыжкі, зробленай у гэты дзень, валасы стануць больш тонкімі. Затое будуць марудна адрастаць, і форма, створаная цырульнікам, захаваецца надоўга. Магчыма, зменіцца і колер валасоў: яны стануць крыху цямнейшымі.

4 лютага. У гэты дзень спробы стварыць прычоску, якая ўпрыгожвае менавіта вас, будуць паспяховымі. Пасля сённяшняй стрыжкі валасы, магчыма, будуць завіваца буйнымі кудзерамі.

5 лютага. Стрыгчы валасы сёння непажадана: можна «адрэзаць» сваю ўдачу.

6 лютага. У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягнеце да сябе радасць і шчасце.

7 лютага. У гэты дзень стрыжка валасоў можа павялічыць вочны ціск, што прывядзе да пагаршэння зроку, запалення ці абвастрэння хваробаў вачэй. Калі ёсць магчымасць, то лепш адкласці наведванне цырульні на іншы дзень.

8 лютага. Сёння можаце смела ісці ў салон прыгажосці. Змена знешняга выгляду прыцягне прыгажосць і дабрабыт.

9 лютага. Згодна з усходнімі павер'ямі, стрыжка ў гэты дзень прыцягне да вас злых духаў, што ў сваю чаргу адаб'ецца на здароўі і дабрабыце. Таму мяняць знешні выгляд лепш у іншы дзень.

10 лютага. Лепш устрымацца ад стрыжкі, паколькі гэта можа прывесці да недамагання: павышэння ціску, галаўных боляў, з'яўлення пачуцця страху.

11 лютага. Цудоўны дзень для стрыжкі. Вынік працы цырульніка пераўзыдзе самыя смелыя чаканні, і навакольныя ацэняць ваша новае аблічча.

12 лютага. Добры дзень для наведвання цырульні. Стрыжка прыцягне прыгажосць і дабрабыт.

13 лютага. Сённяшняя стрыжка не толькі зробіць вас больш прывабнымі, але і прыцягне ўдачу.

14 лютага. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі вашай знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца праніклівасць розуму.

15 лютага. Зробленая сёння стрыжка зменіць у лепшы бок усё ваша жыццё. У найбліжэйшыя месяцы пачнуць адбывацца прыемныя змены ў асабістым жыцці, кар'еры і стане здароўя.

16 лютага. Сённяшні дзень выдатна падыходзіць для змены іміджу. Стрыжка ўзбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: фінансавы стан прыкметна палепшыцца.

17 лютага. Стрыжка ў гэты дзень можа пагоршыць ваша здароўе. Сёння лепш пазбягаць змен знешняга выгляду.

18 лютага. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі вашай знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца праніклівасць розуму.

19 лютага. Сёння можаце смела накіроўвацца да цырульніка. Зробленая сёння стрыжка зменіць у лепшы бок усё ваша жыццё. У найбліжэйшыя месяцы пачнуць адбывацца прыемныя змены ў асабістым жыцці, кар'еры, пачне паляпшацца здароўе.

20 лютага. Сённяшні дзень выдатна падыходзіць для змены іміджу. Стрыжка ўзбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: фінансавы стан прыкметна палепшыцца.

21 лютага. Сёння вельмі неспрыяльны дзень для наведвання цырульні. Стрыжка можа прыцягнуць да чалавека мноства праблем, хваробаў і няўдач.

22 лютага. У выніку стрыжкі ці стварэння прычоскі прыцягніце ў сваё жыццё ўдачу і радасць.

23 лютага. Вельмі дрэнны дзень для стрыжкі валасоў: могуць узнікнуць розныя хваробы. Калі хочаце пазбегнуць праблем са здароўем — устрымайцеся ад наведвання цырульніка.

24 лютага. Сённяшняя стрыжка прынясе вам не толькі задаволенасць уласнай знешнасцю, але і ўдачу.

25 лютага. Лепш устрымацца ад стрыжкі, інакш могуць узнікнуць праблемы ў розных сферах жыцця. Негатыўныя звычкі і хібы праявяцца ў поўнай меры, узрасце цяга да алкаголю, а магчымасць кантраляваць свае эмоцыі, наадварот, зменшацца.

26 лютага. Гэты дзень быццам бы створаны для візіту да цырульніка. Стрыжка, зробленая сёння, прыцягне паляпшэнне фінансавага стану і прыхільнасць кіраўніцтва.

27 лютага. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, не застанецца непрыкмечанай. Вашым новым выглядам будуць зачараваныя ўсе навакольныя.

28 лютага. Выдатны дзень для наведвання цырульні: новая стрыжка прыцягне ўдачу і дабрабыт.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

«Новы Кодэкс аб зямлі дапаможа эфектыўна выкарыстоўваць гэты абмежаваны рэсурс»

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Па-трэцяе, калі спадчыннікі атрымалі пасведчанне аб праве на спадчыну на зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці ці ў пажыццёвым спадчынным валоданні спадчынадаўцы, дык яны абавязаны звярнуцца ў рэгіструючы орган па дзяржаўную рэгістрацыю пераходу права на працягу 18 месяцаў з дня адкрыцця спадчыны (даты смерці спадчынадаўцы). У выпадку, калі спадчыннікі прапусцілі гэты тэрмін, дык яны павінны будуць звярнуцца ў суд з заявай аб падаўжэнні тэрміну для рэгістрацыі. Суд можа падоўжыць прапушчаны тэрмін, але не больш чым на 6 месяцаў пры наяўнасці ўважлівых прычын, якія перашкаджалі звярнуцца па дзяржаўную рэгістрацыю (хвароба, адсутнасць у Рэспубліцы Беларусь і інш.). Зроблена гэта з мэтай, каб нашчадкі, атрымаўшы спадчыну, але не зарэгістраваўшы яе належным чынам, не ўхіляліся ад выплаты падаткаў і выкарыстоўвалі зямлю, не перашкаджаючы гэта рабіць суўладальнікам.

Калі грамадзянін Рэспублікі Беларусь пастаянна ці часова пражывае на тэрыторыі іншай дзяржавы (скажам, у Расійскай Федэрацыі), гэта не перашкаджае яму мець права набыцця ў прыватную ўласнасць зямельнага ўчастка на тэрыторыі Беларусі.

Валодаеш участкам. Што з ім можна зрабіць?

Грамадзяне, у якіх зямельныя ўчасткі знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, могуць імі распараджацца на свой погляд: прадаваць, мяняць, дарыць, здаваць у арэнду, закладваць у забеспячэнне выкананне абавязацельстваў па банкаўскім крэдыце, але толькі з умовай захавання мэтавага прызначэння зямельных участкаў.

Зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, могуць адчужацца толькі разам з размешчанымі на іх капітальнымі пабудовамі (жылымі дамамі, дачамі, садовымі домікамі). Згодна з нормамі новага Кодэкса аб зямлі, пустыя зямельныя ўчасткі (без пабудоў), калі яны былі прызначаны для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання жылых дамоў, а таксама дачнага будаўніцтва, грамадзяне могуць адчужаць толькі мясцовым выканаўчым камітэтам.

Такія зямельныя ўчасткі могуць таксама быць падараны блізкім родным або прададзены, калі яны набыты на аўкцыёне па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць. Напрыклад, у грамадзяніна маецца зямельны ўчастак, які належыць яму на правах прыватнай уласнасці, і што прызначаны для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, на якім адсутнічае пабудова, а ён хоча падарыць яго пляменніку. Цяпер дзейны Кодэкс забараняе гэта зрабіць, паколькі такі зямельны ўчастак можа быць падараны толькі блізкім родным, а менавіта: бацькам, дзецям, усынавіцелям, усыноўленым (удачаром), родным братам і сёстрам, дзеду, бабцы, унукам, а таксама мужу (жонцы).

Пустыя зямельныя ўчасткі могуць адчужацца, калі яны прызначаны для вядзення калектыўнага садаводства ці для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Аднак трэба звярнуць увагу, што, у адпаведнасці з новым Кодэксам аб зямлі, зямельныя ўчасткі, выдзеленыя для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, могуць адчужацца грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, зарэгістраванаму ў сельскім населеным пункце (пасёлку гарадскога тыпу), на тэрыторыі якога размешчаны гэты зямельны ўчастак. Напрыклад, калі грамадзянін хоча падарыць зямельны ўчастак, які належыць яму на правах прыватнай уласнасці для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, свайму сыну, дык апошні павінен быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь і ў абавязковым парадку павінен быць зарэгістраваны ў тым населеным пункце, у якім размешчаны гэты зямельны ўчастак. Дарэчы, у сувязі з увядзеннем такіх абмежаванняў, у студзені 2009 года значна зменшылася колькасць здзелак з зямельнымі ўчасткамі, прызначанымі для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Першая Мінская абласная дзяржаўная натарыяльная кантора сведчыць — у ліку 6 натарыяльных кантор — здзелкі з зямельнымі ўчасткамі, размешчанымі на тэрыторыі Мінскага раёна. Апошні характарызуецца вялікай колькасцю прыватнай забудовы ўчасткаў, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзян. Так, за 2008 год у Мінскім раёне ўсімі шасцю канторамі быў афармлены 3181 дагавор адчужэння зямельных участкаў, з іх 1359 дагавораў зямельных участкаў з размешчанымі на іх пабудовамі (жылымі дамамі, садовымі домікамі, дачамі).

Наш культурны асяродак
Жыроандоля
Выпуск № 1 (47)

Прыгажосць

Пабачыць крылатага Апалона сярод зімы

Сёння а 17-й гадзіне ў Дзяржаўным літаратурным музеі імя Янкі Купалы адбудзецца прэзентацыя выставы-калекцыі самых прыгожых і знакамітых, як запэўніваюць арганізатары, матылькоў свету і насякомых.

У свеце налічваецца 16,5 тысячы відаў матылькоў. На выставе будуць паказаны дзённыя і начныя іх прадстаўнікі, жыхары трапічных лясоў і палярнай тундры, гіганты і карлікі, самыя вядомыя і тыя, што толькі нядаўна сталі вядомымі, атрутныя і падарожніцы, самыя рэдкія і самыя дарагія, матылькі-сімвалы і матылькі-талісманы.

Патрапіўшы на выставу, можна будзе «наведаць» усе кантыненты Зямлі, акрамя Антарктыды, паколькі матылькі сустракаюцца паўсюдна. Пры гэтым уявіць сябе, напрыклад, падарожнікам па джунглях Новай Гвінеі, у якіх сустракаюцца велізарныя матылькі-паруснікі. Або «апынуцца» ў трапічных лясах Амазоніі і ўбачыць шыкоўных, зззяючых металічным бляскам Марфо... Паўднёва-амерыканскія Каліга могуць «напужаць» вас малюнкам у выглядзе савінай галавы на ніжнім баку крылаў. А потым будзе «падарожжа» на астравы Паўднёва-Усходняй Азіі, «наведванне» ўмераных шыротаў. Насельнікі апошніх — Апалоны і Жаўтушкі азіяцкіх высакагор'еў — могуць уздымацца на вышыню 4,5 кіламетра... Пасля «вандроўкі» можна будзе ўбачыць своеасаблівую «кнігу рэкордаў», якая склалася з матылькоў-чэмпіёнаў: па памерах, хуткасці, яскравасці, далечыні палёту.

Будуць прадстаўлены на выставе і жукі. Гэта самы вялікі на Зямлі атрад насякомых. Некаторыя яго прадстаўнікі па колеры і бляску не саступаюць каштоўным камням. А яшчэ тут таксама будуць экспанавацца незвычайныя насякомыя: павук-птушкаед, гіганцкі скарпіён, саранча і інш.

Асобна будзе прадстаўлена група матылькоў і жукоў, якія сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лепельская майстрыха Святлана ЗАЛАТУХА (на фотаздымку) на аўтэнтычных кроснах працуе над калекцыяй касцюмаў для ансамбля «Песняры». Артысты славутага калектыву аддалі перавагу менавіта лепельскаму Цэнтру рамёстваў.

Кнігазбор абяцае быць цікавым

11—15 лютага ў НВЦ «БелЭКСПА» пройдзе XVI выстава-кірмаш «Кнігі Беларусі-2009».

Тут будзе выстаўлена літаратура розных выдавецтваў Беларусі і іншых краін па ўсіх тэматычных накірунках. Сярод кніжак, паказаных на выставе, будуць і тыя выданні, якія сёння не знойдзеш ні ў крамах, ні ў бібліятэках.

Заяўкі на ўдзел у выставе падалі Расія, Украіна, Германія, Польшча, Кітай, Ізраіль, Індыя, Куба, Арменія, Венесуэла, Таджыкістан, Францыя, Швецыя, Славакія, Венгрыя. Ганаровым госцем сёлета выступае Рэспубліка Казахстан. Яе экспазіцыя размесціцца на плошчы ў 50 квадратных метраў і прадэманструе сучаснае кнігавыданне краіны, госці рыхтуюць праграму, у якой — сустрэчы з казахскімі пісьменнікамі, прэзентацыі кніг.

Калектыўная экспазіцыя беларускіх выдавецтваў размесціцца на плошчы каля 200 квадратных метраў.

Адмысловым стэндам будуць прадстаўлены кнігі-лаўрэаты Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі-2008» і V міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі дзяржаў — удзельніц СНД».

У праграме выставы — прэзентацыі выданняў, сустрэчы з аўтарамі, мастакамі, выдаўцамі, семінары, «круглыя сталы», разнастайныя акцыі. Напрыклад, 14 лютага — на выставе «Дзень ведаў», калі наведвальнікі змогуць сустрэцца з выдаўцамі вучэбнай літаратуры. Запрашаюцца педагогі, вучні, студэнты і іншыя асобы. На працягу ўсяго дня будуць праходзіць прэзентацыі, гульні, віктарыны. У гэты ж час пройдзе «Дзіцячы дзень на нямецкім стэндзе», а 13-й гадзіне тут пачнецца гульня-віктарына на нямецкай мове.

Як заўважыў генеральны дырэктар ВКТАА «Макбел», выканаўчы дырэктар XVI Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу «Кнігі Беларусі-2009» Дзмітрый Макараў, эканамічны крызіс пакуль не паспеў значна адбіцца на кніжнай справе ў Беларусі, перад навагоднімі святамі нават выраслі продажы, магчыма, ажыятаж быў звязаны з імкненнем спажыўцоў набыць кніжкі, пакуль на іх не вырас кошт. Прынамсі на выданні, што выйшлі з друку летась, цэны высока ўзнімацца не будуць, а вось на навінках, што з'явяцца сёлета, зразумела, эканамічныя ўмовы адаб'юцца.

Ва ўсякім разе, на самой кніжнай выставе вы зможаце набыць кнігі па цане меншай, чым ў крамах. Акрамя таго, сёлета тут будзе адначасова працаваць і выстава-кірмаш «Канцылярская справа-2009». Дарэчы, уваход на выставу свабодны.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Падрабязнасці

ЗАЗІРНУЦЬ У МІНУЛАЕ?

Сёння гэта стала верагодна. Менавіта такой магчымасцю адразу скарысталася мая калега Даша Стрэльчанка *(фота)*. Старажытнае вялізнае люстэрка з кансоллю, якое датуецца канцом XVIII — пачаткам XIX стагоддзя, сёння — у экспазіцыі чырвонай гасцёўні Гомельскага палаца-паркавага ансамбля.

Гэты прадмет мастацтва быў набыты ў прыватнага калекцыянера, які пры ад'ездзе за мяжу распрадаваў свае скарбы. Дакладны лёс люстэрка невядомы, але спецыялісты Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, якія праводзілі экспертызу, сведчаць, што ўнікальная рэч была завезена ў Беларусь, хутчэй за ўсё, з Аўстрыі ці Германіі. З заключэння экспертаў пра новы экспанат: «Рама дубовая залочаная, выкананая ў эклектычным стылі з элементамі разьбы і ляпніны з гірляндаў з кветкамі, ліс цем і жамчужынамі».

Тут увогуле сабраны антыкварныя прадметы, якія маюць дачыненне да эпохі Паскевічаў. Вялізнае люстэрка ручной работы, прызначанае для палацаў, цудоўна ўпісалася ў інтэр'ер гасцёўні і стала добрым яго дапаўненнем. У чырвонай гасцёўні зараз ідзе паступовая рэканструкцыя абстаноўкі, якая была ўласцівая часу, калі тут жылі апошнія з князёў.

— Так, у Паскевіча маглі быць такія люстэркі. Сёння пры ўваходзе ў залу чалавек адразу бачыць сваё адлюстраванне, а значыць, адчувае сябе на фоне гэтага інтэр'еру, прыгадвае, колькі людзей глядзелася ў люстэрка. Гэта не толькі эстэтычны, але і эмацыянальны прадмет у экспазіцыі, — лічыць загадчык аддзела Гомельскага палаца-паркавага ансамбля Таццяна Літвінава.

Пры былых гаспадарах Гомельскага маёнтка ў залах знаходзіліся розныя люстэркі. Яны былі неад'емнай часткай палацавага ўбрання. Але, на жаль, люстэркаў той эпохі ў залах музея амаль не захавалася. Набыццё ўнікальнага экспаната вартасцю 18 тысяч долараў стала магчымым за кошт выдзялення сродкаў Гомельскім аблвыканкамам.

Прынамсі, далёка не ўсе экспанаты дастаюцца за вялікія грошы. Літаральна некалькі дзён таму гамяльчанка Алена Берасневіч падарыла Гомельскаму музею медную цукарніцу. Гэты прадмет, калі меркаваць па кляйму, быў выраблены ў Варшаве прыкладна ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Дарыльшчыца расказала, што рэч са старажытных часоў была ў іх сям'і. Зараз цукарніца накіравана на спецыяльную экспертызу, якая ўстановіць вытворцу, дату і месца вырабу. Пасля гэтай працэдуры, а таксама пасля рэстаўрацыі, прадмет можа ўвайсці ў экспазіцыю «Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Духоўнасць

Тыдзень малітваў за адзінства хрысціянаў

Сёлета, як і ў мінулым годзе, 24 студзеня — напярэдадні заканчэння Тыдня малітвы за адзінства хрысціянаў — у мінскім архікафедральным касцёле (пл. Свабоды, 9) адбудзецца экуменічная малітва. Распачнецца яна ў 18.30 набажэнствам, якое ўзначаліць Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архібіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

Пасля Эўхарыстыі запланавана экуменічная сустрэча, на якую запрошаны прадстаўнікі Грэка-каталіцкай, Праваслаўнай, Лютэранскай цэркваў і іншых хрысціянскіх канфесій. Завершыцца сустрэча музычным канцэртам, падчас якога прагучыць кантата «Таямніца веры» ў выкананні заслужанага калектыву акадэмічнага хору Нацыянальнай Белтэлерадыёкампаніі.

Галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік хору — Вольга Янум.

Аўтарам музычнага твора з'яўляецца парафіянін мінскай архікафедры, малады беларускі кампазітар Ігар Янкоўскі.

Тыдзень малітваў за адзінства хрысціянаў распачаўся 18 студзеня і праходзіць пад дэвізам «Каб усе былі адно». Апекуном Тыдня лічыцца святы Апостал Павел. Тыдзень малітваў за адзінства хрысціянаў пачалі адзначаць у 1908 г. Ён заўсёды пачынаецца з дня, на які некалі прыпадаў успамін святога Апостала Пятра (18 студзеня), і завяршаецца святам абарачэння святога Апостала Паўла (25 студзеня).

Узяць удзел у экуменічнай малітве запрашаюцца вернікі ўсіх хрысціянскіх канфесій Беларусі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ВІВАТ, СКАРЫНА!

У тых, хто далёкі ад літпрацэсу ў Беларусі, можа скласціся ўражанне, што кнігі ў нас зусім перасталі выходзіць. А між тым, усё наадварот — мастацкіх кніг выходзіць вельмі многа — і вядомых аўтараў, і пачаткоўцаў... Вырашыла назваць самыя цікавыя выданні мінулага 2008 года — раптам сустрэнеце ў кнігарні?

1. «Берлібры» А. Хадановіча.
2. «Шлях дробнай сволачы» Е. Вежнавец.
3. «Дзень Бубна» Ф. Сіўко.
4. «Convolutus» А. Глобуса.
5. «Анадыямена» Г. Дубянецкай.
6. «Ружоўніца» В. Аксак.
7. «Мільярд удараў» Ю. Станкевіча.
8. «Цмокі лятуць на нераст» М. Мартысевіч.
9. «90-я forever» С. Прылуцкага.
10. «Душпастырскія спатканні для дачнікаў» П. Касцюкевіча.

Дзённік бландзінкі

ПРА КАЧАК І БЕЛЫЯ БУЛКІ

Штодня бягу на працу і бачу, як пад акном дома на вуліцы Сурганава нехта накрашыў свежанькага батона для галубоў...

Птушак мне, безумоўна, шкада. Але... Цяжкую працу людзей, якія на гэтыя булкі гарбацяцца, таксама трэба паважаць! Таму, калі ласка, калі вы пойдзеце ў парк карміць бедных замерзлых качак, якія плёхаюцца ў нейкай хімічнай пене, не купляйце булак! Вазьміце тое, што не змаглі даесці... Гэта няпраўда, што качкі прывыклі да белай здобы — яны жаруць усё, што ім прыносяць.

ПРА ТЫГРУ ЛЬВОЎНУ

Забегла на Раство ў госці.

Сяджу за сталом, каву п'ю. Тут кот гаспадарскі заскоквае мне на калені, ставіць лапы мне вакол шыі і пачынае лізаць вусны. У мяне аж мову адняло, бо я чалавек гідлівы на рэдкасць. Гаспадыня таксама ў шоку, толькі з другой нагоды — у фотаапараце батарэйкі не жараджаныя, а ёй карціць гэтую карцінку «запечатлець»... Ката акуратненька асадзіла, ён улёгся ў мяне на каленках і праляжаў там, пакуль не сышла.

Гэта ўжо другая гісторыя, калі станаўлюся аб'ектам жывёльнай пяшчоты. Першы раз, праўда, гэта было больш падобна на сэксуальнае дамаганне і сыходзіла ад папугая. Папугай быў сваяцкі — маіх сясцёр. Умеў гаварыць і, наогул, добра выхаваны разумнік... Але як толькі я ўваходзіла ў іх кватэру, ён садзіўся мне на далоні, увесь распушваўся і пачынаў раскачвацца ўзад-уперад. І так кожны раз! Натуральна, з мяне ўсе смяяліся, пакуль яго, гарадскога інтэлектуала, кошка вясковая не з'ела.

Але я ведаю гісторыю і яшчэ больш забаўную. Неяк заўважыла, што мая суседка стала называць сваю дачку Тыгра Львоўна. Спачатку думала, што гэта проста з той прычыны, што ў дачкі шыкоўная грыва рудых валасоў. Але аказалася, што ўсё больш складана...

Дачка маёй сяброўкі на сваё пятнаццацігоддзе вырашыла з'ездзіць у горад Калінінград. Каб у дарозе яна не змерзла, суседка купіла ёй паліто беларускай фабрыкі «Элема». Пясочнага колеру, з капюшонам і рудой апушкай — вы напэўна бачылі мільён такіх гады чатыры таму. Дык вось прыехала яна ў горад Калінінград і пайшла ў заапарк — ну дзіця ж малое, хоць і пятнаццаць. Ходзіць паміж клеткамі, фатаграфуецца, аж пакуль не дайшла да клеткі з ільвом. Яна да льва — а леў, таксама такі ўвесь пясочны і з рудой грывай, да яе! Ледзь клетку не зламаў — прыціснуўся да прутоў, раве, непрыстойныя рухі робіць. А ўсе — тактоўныя людзі! — пальцам у дзяўчынку тыцкаюць, уголас высоўваюць версіі, што леў ад яе хоча... Карацей — паглядзела на жывую прыроду...

Гэта я да чаго?

Калі стварэнні абсалютна розных відаў выказваюць свае пачуцці, парушаючы ўсякую жыццёвую іерархію і логіку, то што дзівіцца, што людзі аднаго полу выклікаюць адзін у аднаго сімпатыю?..

ПЫТАННЕ

Вось я часта думаю — каб чалавек мог самастойна і лёгка, без болю, выбіраць — жыць яму ці не... Ці застаўся б хто на гэтай зямлі? Мне здаецца, што кожная асоба хоць раз за жыццё ды думае пра самагубства.

АТРАКЦЫЁН НЕЧУВАНАЙ СКВАПНАСЦІ

Зайшла сёння ў бібліятэку, хацела глянуць газету... Няма, кажуць, N. са ўчарашняга дня трымае. Газета мне трэба па працы, таму трохі раздражнёна пытаюся: «І што яна там так доўга чытае?». Адказ мяне крануў да глыбіні душы.

«А яна з яе заўсёды тэлепраграму на тыдзень перапісвае».

Габсэк адпачывае...

Ганна КІСЛІЦЫНА.

На конкурс апавяданняў

Анатоль БІГАЙДАРАЎ

ЗЯЛЁНЫЯ ТАПКІ

Анатоль Бігайдараў — журналіст з вялікім раённым стажам, добрым вокам і чулым сэрцам. І гэта адчуваецца, што б ён ні пісаў — нарыс у газету ці апавяданне ў «Звязду». Дарэчы, ён лаўрэат нашага конкурсу мінулых гадоў. І гэтым аповедзе застаецца сабе верным, свайму адметнаму стылю, почырку і жыццёвай праўдзе, якая ў яго добра спалучаецца з усмешкай.

Віктар КАЗЬКО.

Прывязлі неяк у Гомель, у вядомую на ўсю вобласць вялікую хімзаводскую бальніцу, сляпую бабку-нараўлянку. Маленькую, худзенькую, маркотную ў чорнай плісавай жакетцы з бліскучымі гузікамі. На галаве — квяцістая, кірмашовая, хустка, на нагах — наваксаваныя хромавыя боты, у руках — бярозавы кіёк-рагулька.

Было той паляшучцы гадкоў дзевяноста з гакам. Апошнія пяць — ужо і дня ад ночы не распазнавала. Натуральна, старая пакрысе пачала здаваць: неяк знікла, згорбілася, да ўсяго, нават вечарам, перастала выходзіць за брамку пагаманіць з суседкамі. Аднак смерць сваю не прыспешвала, толькі калі-нікалі ўздыхала: «Мусіць, і там, у Выраі, ідзець перастройка... Адсюль такая няўпраўка... А Божухна й шкадуе, не хоча, кеб ето я, сляпая, блукала тамка бесталаччу, замінала анёлкам...»

Так бы і соўкалася старая да скону дзён па сваім цяністым ад грушаў і яблынь двары, пужала б вераб'ёў і варон, бубукала б з курамі і качкамі, каб не чуллівая ферчалка-пенсіянерка Лёдзя Маркаўна: а падмагла-такі адзінаму сыну падгаварыць матку на аперацыю.

— Выкінь з галавы ты матчына «паслужу, сынок, Богу і сляпая» — ведаеш жа, старое што малое!.. — выгаворвала Лёдзя Маркаўна былому свайму аднакласніку. — А як прааперыруюць, то й сабе рукі развяжаш! Гэта ж ні ад'ехаць куды, ні табе ў лес які схадзіць... Прывязаны да матчынай спадніцы — унь, як той бедны Жучок да будкі. А ты і сваю сядзібу як забур'яніў... Як чарнобельская...

— Яно, Лёдзе, усё, канечне ж, так, — пагаджаўся Іван. — І павер, я не супроць лячэння... Але ж мамка ні мне, ні табе не роўня — ёй ужо пад сотню... Ці ведаеш, з самім Калініным у Крамлі ручкалася, калі той ёй ордэн за лён уручаў... А от возьме і памрэ, крый Божухна, на тым пірацыйным стале... Можа, хай сабе, так... без лішніх перажыванняў, хай у спакоі дажывае?.. Павер, мне не цяжка за ёй хадзіць, звыкся...

— Так, бабка Кацярына для якой нутраной, сур'ёзнай аперацыі задужа старая... Дык жа яна ніколі ніводнай таблеткі ў рот не паклала! Можна сказаць, звекавала без аптэк і дактароў. З лекаў прызнае хіба што валяр'янку — у чаёк, бачыла неяк, падлівае... Словам, Фёдаравіч, рашылі-пастанавілі: не пазней як праз два тыдні, пакажаш маці гомельскім афтальмолагам. От каб жа на прыём да Жураўскага, земляка, патрапіць! Геты справу сваю дабрэнна ведае, і не запанеў — шануе вяскоўца, простага чалавека... Добранька, Ваня, пабягу, загаманілася. Завітаю да Саламянчыхі... Сэрцам чую, без яе нам бабу Кацю не ўлягуніць.

...Трэба сказаць, што чалавека, больш аўтарытэтнага за васьмідзесяціпяцігадовую траўніцу і знахарку Саламянчыху, суседку Іванавай маткі, не было і ва ўсёй акрузе. Лекарка-ўніверсал ведала замовы, спальвала рожу, шаптала спуг, упраўляла кілы і звіхі, ставіла на месца пазванкі, да ўсяго, тлумачыла любыя страшныя ці дзіўныя, словам, незразумелыя сны. І сны тыя — слова ў слова! — спраўджваліся.

...Ніхто не ведае, пра што гутарылі апоўдні ферчалка са знахаркаю, толькі раніцай наступнага дня старая Саламянчыха бадзёра, шумліва пастукалася ў хату суседкі Кацярыны.

— То й добрачка, што заспела цябе!.. — павітаўшыся, пачала Саламянчыха.

— Гето ты, суседко?

— Я, я, Кацярынко. Не ўставай, ляжы, ляжы, сонейка пакуль-ка нізенька, на дварэ росна... Сякеру тваму Іванку прынясла, кеб гета падвастрыў... Бо, думаю, ка-а-лі вы з таго Гомеля павярнецеся!..

— З якога такога Гомля? І хто туды едзе?.. — прыўзняла сівую, як у балотнага луня, галоўку сляпая.

— Як хто? Не я ж, — ты з сынком. Стой, стой, не лапачы!.. Не гамонь, кажу табе, лепш слухай сюды... Гетай ночкаю сасніла я, а мая ты харошая, дзіўны сон... Век дажываю, аніколі нічога такога не сніла. Ня йначай — прарочы! У нас, быццам, вясна, цвіце ўся чыста зямля, пчолкі лётаюць, птахі наўкол спяваюць... А ты — свят, свят! — узяла і, быццам, ціха-мірна памерла... І ўжо памылі-прыбралі цябе, усё чын-чынаром, хо-ораша, і бацюшка (не наш, малады няўмечка, а той, сур'ёзны, як ты і наказвала, з аграгарадка) адспяваў усе малітвы, словам, час за крыж брацца, труну з хаты выносіць... І тут-ка раптам — шш-у-гель! — улятае праз расчыненую хвортку белы-белы голуб. Зрабіў кругаля над труною і сеў якраз табе на рукі. Свечка нат затухла! Прыглядзелася я, а ў ягонай дзюбцы — Каце, ты не паверыш! — маленькія залатыя... кулярчыкі. Быццам дзіцячыя. Шкельцы ў іх такія чыстыя-чыстыя, як роскі зіхаціць. Голуб кладзе іх курат побач са свечкай і... І тут я, як на тое зло, узяла і прачнулася! Ляжу, а я сама сабе думаю: і навошта сляпой нябожчыцы залатыя куляры, ды й такія маленькія?.. Во дзе загадка!

Саламянчыха, седзячы ў нагах суседкі, даказала свой сон, калі ў пакойчык зазірнуў Іван. Знахарка ўважыла просьбу занепакоенай суседкі — пераказала бачанае ў сне і яму. Затым няспешна, дэталёва патлумачыла містычную сімволіку: разгадала-такі!

Па ёй выходзіла: бабцы Кацярыне самім лёсам наканавана дажываць век відушчай.

* * *

— Чаму не паказалі мне хворую раней? — уважліва чытаючы накіраванне райбальніцы, запытаўся вядучы афтальмолаг Гомельскай хімзаводскай бальніцы Валерый Казіміравіч Жураўскі ў павадыра сляпой маткі.

— Дак жа... тутка... Я й хацеў... так бы мовіць, на скорым часе... А хіба яе перайначыш?.. Як на духу, доктарка... а нядужа й рвалася мамка да вас... Доўга ўгаворвалі... Ці не ўсім сялом... Дзякуй знахаркы з яе сном... От тыдзень, як, няўрокам кажучы, мамка дала рашыцельную згоду на ету пірацыю, хай ёй грэц...

— Што, няўжо хто з былых нашых пацыентаў так запалохаў?

— Не, доктарка... Наадварот. Нашы вас нахвальваюць. Ды й мамку цяжка напалохаць — не з пужлівых яна: калі палон нямецкі перажыла, то ўжо вашу бальнічку як-небудзь перажыве...

Строгі ўрач уважліва паглядзеў на Івана, на медсястру, шырока ўсміхнуўся, хехекнуў сабе пад нос, і падышоў да бабкі, якая ціха сапла на канапе.

— Выбачайце, калі няўрокам разбудзіў вас, шаноўная Кацярына Іванаўна, але калі ласка, — да апарата... Трымайцеся за маю руку і не хвалюйцеся...

...Праз паўгадзіны Валерый Казіміравіч разам з медсястрой дафармляў накіраванне на стацыянарнае лячэнне ў аддзяленні мікрахірургіі вока.

...Дзякуючы Жураўскаму, старую нараўлянку пасялілі ў невялікай палаце адну. Праўда, к вечару адсюль вынеслі тэлевізар і халадзільнік. Бабка ні паўслова!

— Во, нарэшце, дачакалася: паслаў-такі мне, міласэрны Божа, хоць адну нармальна-паказальную хворую. І ціхмень-цюхменню, і ніадзе днямі не сноўдае, падлогу бязмэтна не топча, не п'е і не кура, у туалеце, як тыя ў дзяржду ме, не засядае, сталоў-тумбачак ліпісінавымі няз'едкамі не захламечвае... Пабольш бы такіх і надаўжэй! — таўстаногая і таўстазадая санітарка-пенсіянерка Рэгіна паўтарала гэта, як дурань замову, на калідоры, у гардэробе і туалетах, у кожнай палаце, ардынатарскай, сястрынскай...

А сляпая баба Каця з раніцы да вечара моўчкі ляжала на койцы, тварам да халоднай сцяны, або насцярожана сядзела на белай табурэтцы, збоку ложка, і толькі разпораз рэзка паварочвала сваю маленькую сівенькую галоўку на кожны новы гук. Ну, ці не вераб'іны сычык падчас першага кастрычніцкага лісталёту?

Іван прыязджаў у бальніцу нячаста — раз на тыдні. І не таму, што стары, што далёка. Сын паслухаў матку, не прамотваў сваю і яе пенсіі. «Лепш, сынок, лішні мех ячменю падкупіш куркам і качкам... Ды й дравец на зіму не шкодзіла б завезці... Заўчора, пад капельніцаю ляжу і чую: да восені зноўку ўсё чыста ў магазінах падаражае... Так што не спі ў шапку, Ваня».

...Лечачы ўрач, хірургі, мядсёстры ні разу не пачулі ад сваёй самай старой пацыенткі скаргаў, просьбаў, скуголля. Ні да першай аперацыі, ні пасля трэцяй, апошняй.

— Ну-с, бабулька, заўтра здымем павязку, — будзённым голасам абвясціў навіну лечачы ўрач. — Спадзяюся, што да канца гэтага тыдня вас выпішам.

Калі ўрач пайшоў, баба Каця з палёгкай уздыхнула, устала з койкі, прайшлася да акна і паспрабавала яго расчыніць. Раз-другі... Ёй удалося гэта здзейсніць ці не з шостай спробы. Свежае паветра падалося старой паляшучцы такім п'янкім і смачным, якім яно было і бывае толькі ў дзяводцтве!

...У тую ноч яна не спала, як не спала і ў самую першую бальнічную ноч. Шоргала і шоргала тапкамі туды-сюды па палаце: ад ложка да акна, адтуль — да ложка. Хвалявалася! А хто б не хвалявaўся?

Ахвотнікаў паглядзець на незвычайную — амаль стагадовую! — пацыентку, учарашнюю сляпую, якой здымаюць павязку, сабралося многа — ці не ўвесь медперсанал аддзялення мікрахірургіі вока. Аднак у невялікую палату-персаналку ўціснуліся толькі самыя-самыя: група хірургаў, дзяжурны і лечачы ўрач, медсястра.

Побач з пацыенткай стаяў вясёлы, жартлівы доктар Жураўскі . Потны і збянтэжаны Іван з жоўтымі і белымі ружамі — дзяка дактарам — цёр мокры лоб, лысіну, вочы, юзаў-ёрзаў на табурэце, спераду тумбачкі. Ён адчуваў сябе так, быццам гэта не ягонай мамцы, а яму пашчасціла зноўку пабачыць і свет і святло.

...Самай спакойнай выглядзела баба Кацярына. Яна, як сляпы і велічны егіпецкі Сфінкс, хіба толькі вельмі паменшаны, паважна сядзела на краі ложка (ручкі на каленках!) і чакала. Моўчкі.

У поўнай цішы маладзенькая медсястра з пунсовым тварыкам акуратна змотвала бінт з галавы мінікопіі Сфінкса.

— Можаце расплюшчыць вочы! — прашаптаў старой на вуха доктар Жураўскі.

— Не расплюшчваюцца, — таксама шэптам адказала зямлячка. — Дохтурко, то мо яны папазаросталі?

Прысутныя стрымана хіхікнулі-гігікнулі.

Бабка, не зважаючы на паўнюткую палату людзей у белых і шэра-бірузовых халатах, прыўзнялася з ложка, кінула позірк на свае ногі, затым — на Жураўскага, і пранізлівым, як міліцэйскі свісток, голасам патрабавальна запытала:

— І дзе мае новые зелёные тапці?!! Гетые, пакеўзаные, сініе — не мое. Мое булі, як тые першые гурочкі. Зялёные. Ураз павертайце іх сюды!..

Не ўсе з прысутных і не адразу зразумелі, што да чаго. Іван, чырвоны, як спечаны рак, мусіў растлумачыць. Напярэдадні таго самага дня, як мамцы аслепнуць, прывёз ён ёй з Нароўлі новыя пакаёвыя тапкі, яе любімага зялёнага колеру. Вось якраз іх яна цяпер, відушчая, і патрабуе. Такога вясёлага і дружнага смеху, раз-пораз перарастаючага ў рогат, сцены бальніцы дасюль не чулі.

...Кажуць, што ў бровы выпіскі гаварлівай, бурклівай, трохі сварлівай, словам, жывой, існай паляшучцы медыкі паднеслі сем пар тапак — усіх колераў вясёлкі. Насіць не перанасіць!

г. Гомель.

Бяседныя песні

ПАДАЮЦЬ ЗОРЫ

Падаюць зоры — гэта да шчасця. Толькі трэба паспець загадаць жаданне, канкрэтызаваць яго.

Калі ж каханне азараецца шчасцем? У напружаныя хвіліны прызнання ці ў хмельным узнясенні ад першага пацалунку?! Ад смеласці ці ўзаемнасці?! У творчых сумесных дзеях — так сцвярджаецца ў песні «Падаюць зоры» Леаніда Захлеўнага і Алеся Бадака. Паэт пісаў тэкст да ўжо створанай музыкі і, акрылены рамантычнай мелодыяй, згадаў трапны мастацкі вобраз — знічкі, каб перадаць імклівасць кахання. А яно заўсёды поруч са шчасцем. Толькі варта своечасова прыкмеціць гэты з'яднаны хуткаплынны працэс, адчуць і зразумець яго. І не прапусціць шчаслівага часу! Трэба спяшацца, як і загадаць жаданне ў тыя мройныя імгненні, калі падаюць зоры.

Верш Алеся Бадака **Музыка Леаніда Захлеўнага**

Я твае пацалую далоні.
Мне так цяжка было без цябе,
Што баюся я нават сягоння
І на міг адпускаць ад сябе.

Прыпеў:
Падаюць зоры, падаюць зоры
Ціхай начною парой.
Падаюць зоры, падаюць зоры,
Светлаю стануць расой.
Я загадаю ў шчасці і горы
Не расставацца з табой.
Я загадаю ў шчасці і горы
Не расставацца з табой.

Гавары — буду слухаць да рання
І хмялець ад пагляду твайго.
Што мы зналі з табой
пра каханне
Да разлукі у некалькі год?!

Прыпеў.
Што было — назаўсёды пакіне
І растане у зорнай начы.
Мы ў мінулае дзверы зачынім
І далёка закінем ключы.

Прыпеў.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Сёння, дарагія нашы гаспадынькі і, безумоўна, паважаныя гаспадары, не будзем гатаваць нічога складанага, дадзім адпачыць рукам і жывоцікам.



СТРАВА Ў ФОЛЬЗЕ

Мая інстытуцкая сяброўка жыве ў Фінляндыі (ні слова па-фінску не ведае, працуе бухгалтарам і да гэтага часу сама здзіўляецца — як яе туды занесла). Дык вось, калега па працы прымала яе ў госці менавіта з гэтай стравай. Кажа, пальчыкі абліжаш!

Вазьміце: дробна парэзаную цыбулю, бульбу, грыбы, рыбу або курыцу, вяршкі, зеляніва, прыправы на смак.

Усё складваем порцыямі ў фольгу, згортваем канверцік, каб над прадуктамі было пустое месца, добра «зашчыкваем» фольгу, кладзём скруткі ў кацёл з гатаванай вадой, які стаіць на агні і трымаем прыкладна гадзіну. Падаём у гэтай жа фользе на талерцы.

АНТРЭКОТ З ЯБЛЫКАМІ

Нам спатрэбіцца: 1 кг мяса (у рэцэпце напісана ялавічына, але мне больш падабаецца са свінінай — больш сочна), 4 яблыкі, паўшклянкі смятаны, соль, перац і алей для смажання.

Мяса парэзаць і добра адбіць, пасыпаць соллю і перцам, пакінуць на паўгадзіны, затым крыху абсмажыць з двух бакоў. Яблыкі нарэзаць тонкімі кружкамі, пакласці іх на антрэкоты, заліць смятанай і запякаць у духоўцы 40 хвілін. Перад падачай на стол можна пасыпаць зяленівам і хрэнам.

ВОСТРАЯ САЛАТА З ФАСОЛЯЙ

Вазьміце: 1 шклянку чырвонай фасолі, 1 цыбуліну, 2 долькі часнаку, кетчуп, хмелі-сунелі, каляндру, зеляніва пятрушкі, воцат 9-працэнтны — 1—2 ст. лыжкі (на смак).

Фасолю замачыць на ноч у халоднай вадзе і раніцай адварыць да гатоўнасці, пасаліўшы незадоўга да заканчэння варкі. Адвар зліць у асобную каструльку, але не выліваць.

Цыбулю дробна парэзаць і абсмажыць да мяккасці. Часнок дробна парэзаць. Зяленіва дробна пасячы. Выкласці фасолю ў салатнік, дадаць смажаную цыбулю разам з алеем і часнок. Затым дадаць крыху кетчупу (нявострага), зеляніва, хмелі-сунелі, каляндру і воцат. Усё добра перамяшаць і даць настояцца некалькі гадзін.

САЛАТА З КАПУСТЫ З АПЕЛЬСІНАМІ

Вазьміце: 500 г капусты, 1 апельсін, 3 яблыкі, маянэз або смятану.

Капусту нашаткаваць і пацерці. Дадаць ачышчаныя ад плёнак і парэзаныя кубікамі долькі апельсіна і надзёртыя на буйной тарцы яблыкі (без лупіны). Перамяшаць і заправіць маянэзам.

ПУДЫНГ З ВАРАНЫМ МЯСАМ І СЫРАМ

Смачная і сытная хатняя страма. Калі яшчэ гарачая, то вельмі сочная. Пасля астывання сокі ўсмоктваюцца ў хлеб і страва становіцца маналітнай — яе можна рэзаць на кавалкі і яна не развальваецца, хоць застаецца мяккай і не сухой.

Нам спатрэбіцца: 3—4 скрылькі чорнага або белага хлеба, 150 г варанага мяса, 100 г цыбулі, 4 яйкі, 0,5 шклянкі малака або вяршкоў, 70 г сыру, 1/3 ч. лыжкі солі, перац, пры жаданні — 1 зубчык часнаку.

Форму добра змазаць алеем. З хлеба зрэзаць скарынкі і выкласці на дно формы. Хлеб парэзаць маленькімі кубікамі. Цыбулю нарэзаць буйнымі паўкольцамі і абсмажыць на алеі да мяккасці і лёгкага падрумяньвання. Цыбулю дастаць, а ў патэльню выкласці кубікі хлеба і крыху (прыкладна 1 хвіліну) іх абсмажыць. Мяса і цыбулю прапусціць праз мясарубку. Сыр дробна нарэзаць. Змяшаць фарш, сыр і кубікі хлеба. Усё выкласці ў форму. Яйкі ўзбіць з малаком або вяршкамі, пасаліць і паперчыць. Пры жаданні для водару і вастрыні можна пакласці зубчык часнаку, праціснуты праз прэс. Яечную масу раўнамерна выліць у форму. Паставіць запякацца пры тэмпературы 200—220°С на 25—30 хвілін. Калі ваша духоўка падпальвае верх — тады зацягніце форму фольгай.

Тэлесеткі

Віртуальны «кастынг» разумнікаў

«Вельмі хачу трапіць у лік удзельнікаў тэлевізійнай інтэлектуальнай гульні «Адзін супраць усіх» на АНТ. Як гэта можна зрабіць? Кажуць, адбор гульцоў праз СМС-адказы спынены...»

Алеся, 21 год, *г. Мінск.*

Падобнае пытанне даводзілася чуць неаднаразова і далёка не толькі ад мінчан. Папулярнасць гульні «Адзін супраць усіх», якая існуе ў беларускім эфіры другі сезон, не змяншаецца, як і колькасць ахвотных трапіць у студыю і пазмагацца за галоўны прыз — Br50 мільёнаў.

Як расказала «Звяздзе» прэс-сакратар тэлеканала АНТ Аліна Праваторава, цяпер адбор з дапамогай СМС сапраўды не вядзецца. Працэдура спрошчаная: ахвотным (грамадзянам РБ ва ўзросце больш як 18 гадоў) трэба зарэгістравацца на сайце АНТ — www.ont.by у раздзеле «Праекты» і прайсці адборачны тур — правільна адказаць на 12 пытанняў запар. Сярод іх традыцыйна як вельмі простыя і відавочныя (напрыклад, прапановы правільна закончыць вядомую прыказку), так і больш складаныя пытанні з розных сфераў. Нават калі адказаць на ўсе не атрымалася адразу, засмучацца рана: у дзень кожнаму даецца 10 спробаў, увогуле ж колькасць іх неабмежаваная. Прычым, адзначым, у адрозненне ад СМС-паведамленняў, адбор праз сайт — бясплатны.

Калі кандыдат у гульцы правільна адкажа на ўсе 12 пытанняў, яго імя заносіцца ў базу звестак «Адзін супраць усіх», а ўжо з яе камп'ютар метадам выпадковых лічбаў адбірае 50 удзельнікаў тэлевізійнага запісу.

Дарэчы, за час існавання гульні ў Беларусі галоўны прыз у ёй выйгравалі двойчы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Простыя рэчы

ВІДЭЛЕЦ

Ад некага чуў ці, магчыма, недзе чытаў пра адзін выпадак з першым касманаўтам зямлі Юрыем Гагарыным. Пасля свайго трыумфальнага палёту ён стаў адназначна самым вядомым чалавекам на зямлі, у тыя гады, гады пачатку асваення космасу. Вельмі шмат ездзіў па свеце, ва ўсіх краінах быў прадстаўніком не толькі СССР з яе касмічнымі дасягненнямі, але ж быў і своеасаблівым сімвалам дасягнення ўсяго чалавецтва. І вось у Англіі, на прыёме ў маладой тады яшчэ каралевы Лізаветы, апынуўся за парадна, па ўсіх правілах найстражэйшага брытанскага этыкету, накрытым сталом. А той этыкет прадугледжваў ля кожнага прыбора столькі відэльцаў, і відэльчыкаў, лыжак і лыжачак, што касманаўт разгубіўся. Ніхто не навучаў яго, рабочага хлопца, а потым ваеннага лётчыка, а потым і касманаўта першага набору, тонкасцям такога далікатнага стала. Гэта зразумела і каралева і тактычна адсунула ўсе гэтыя прыборы ўбок, нібыта сказала, што і сама ва ўсіх гэтым разбіраецца слаба...

Відэлец. Нараджаецца чалавек — і не адразу ў яго ўжытку з'яўляецца гэта прылада. Пасля матчынага цела пазнае ён соску, лыжачку, кубачак. І толькі тады ўжо, калі навучыцца добра абыходзіцца за сталом, калі ў дзіцячай пясочніцы прызвычаіцца да бясшкодных відэльцаў ды грабелькаў — даюцца яму сапраўдныя, але таксама яшчэ бясшкодныя відэльцы.

А адкуль яны з'явіліся, відэльцы? Яны былі першыя ці лыжка?

Лыжка з'явілася тады, калі з'явілася ў чалавека нейкае варыва — не жменяй жа яго чэрпаць і не з катла нагбом сёрбаць. А вось першымі відэльцамі служылі самыя разнастайныя прылады, тое, што траплялася найперш пад руку, на што можна было накалоць кавалак мяса і спячы яго на агні. Адам Міцкевіч у сваёй славутай паэме «Пан Тадэвуш» апісвае засценак беларускага шляхціца, у тым ліку і новае прызначэнне вайсковых рэчаў за іх непатрэбнасцю:

Даспехі і кальчуга нейкага жаўнера
Ужываюцца як жалабы
ці яслі ў стайні:
У іх буланаму
сам гаспадар звычайна
Закладвае на ноч ахапак канюшыны.
Рапіры служаць пожагам
для смажаніны
На кухні ў доме;
гарт сваёй булатнай сталі
Яны на векі вечныя адгартавалі.

Бачыце, рапіры, халодная зброя, выкарыстоўвалася і як прыбор для смажання мяса. З іх жа потым і елі.

Дарэчы, сёння так званыя шведскія сталы — нярэдкасць у час нейкіх мерапрыемстваў і ў правінцыі. Людзі да іх прызвычаіліся. Прызвычаіліся выпіваць і есці, стоячы ля такога стала, выбіраючы на ім патрэбнае. І бутэрброды, канапкі, як кажуць у нашай мясцовасці, як правіла, на такіх сталах праткнутыя драўлянымі шпажкамі — ямчэй браць. Вядома ж, яны і не напамінаюць рапіры, пра якія пісаў Міцкевіч, але ж... Нешта агульнае праглядаецца.

У мяне ж ёсць, магчыма, спрэчнае меркаванне. Відэлец прыйшоў у чалавечы побыт ад віл, якімі розныя гаспадарчыя работы выконвалі, ды і зброяй яны служылі таксама. З нейкага кінафільма пра старыя часы помніцца эпізод: палае камін, а ля яго сядзіць чалавек, трымаючы ў руках вілы. І на кожным з трох яго зубоў нанізаная тушка курыцы.

Дарэчы, у старой беларускай мове слову *відэлец*, у сталовым яго разуменні, адпавядалі — *грабкі, грабчыкі, грабок, вільцы*. Ёсць нейкая паралель з прыладай сялянскай працы.

Увогуле ж ёсць народы, якія ў развіцці сваёй побытавай культуры абышліся без відэльцаў. Славутыя палачкі, якімі ядуць у Кітаі, Японіі — ды ў шмат якіх краінах Азіі. Яны, безумоўна, не падобныя на відэльцы, але выконваюць тую ж функцыю: браць з талеркі кавалачкі ежы. Азіяцкая кухня сёння, міякуючы па колькасці такіх рэстаранаў у сталіцы і буйных гарадах, карыстаецца попытам. А вось палачкі — думаю, менш, бо тут спрыт патрэбен адпаведны. А мы ж у сваёй маладосці толькі пачыналі засвойваць азы правільнага карыстання нават відэльцам. Яго трымаюць у левай руцэ, а ножа ў правай. Хоць, здавалася б, ямчэй і хутчэй есці якраз наадварот. Ды і азы гэтыя прывівалі ся нам пакрысе, ці то ў школьнай сталоўцы, ці ў якім больш цывільным асяроддзі. А бацькі нашы прытрымліваліся меркавання, што відэлец існуе для таго, каб ямчэй узяць яго ў правую руку, у левай — добрая луста хлеба.

Ну, гэта простыя сяляне. А вось Уладзімір Караткевіч апісвае гулянку ў шляхецкім доме. Гэта з «Дзікага палявання караля Стаха». Люблю гэтага песняра нашай зямлі яшчэ і за яго дакладнае веданне побыту беларуса розных часоў. І вось на вечарынцы ў пана Дубатоўкі падаюць запозненаму госцю Беларэцкаму пачастунак:

«Хутка на маім блюдзе ляжала вялізная гусь з бруснічным варэннем, індыковая ножка з яблыкамі, салёныя грыбкі, дзесятак калдуноў, а з усіх бакоў толькі і чутно было:

— А вось пампушачкі з часнаком... А вось, пане, кавалачак шыначкі дзікага япрука...

— А гэта што? — спытаў я, торкаючы відэльцам у нешта цёмнае ў талерцы.

— Каханенькі ты мой, гэта ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце...»

Як бачым, сапраўды лукулаў стол, процьма разнастайнай ежы — і відэлец, звычайны відэлец для спажывання ўсяго гэтага.

Крыху ранейшы час апісвае расійскі пісьменнік Аляксей Талстой у рамане «Пётр I». У сталовай пабудове, дзе харчуецца і цар: «К столу присаживались офицеры, моряки, мастера, усталые, замазанные смолой, забрызганные грязью. Вытянув чарку огненно-крепкой водки из глиняного жбана, брали руками что попадется с блюд: жареное мясо, поросятину, говяжьи губы в уксусе.»

А вось царскі любімец Меншыкаў прыйшоў у госці да афіцэраў. «Алексей принес из сеней капусту и штоф. Александр Данилович, отставляя холеный мизинец с большим бриллиантовым перстнем, осторожно налил одному себе, захватил с тарелки щепоть капусты с ледком, прищурясь, вытянул из чарки и, раскрыв глаза, начал хрустко жевать капусту».

Так што і рукамі елі высакародныя. Няхай на гэтых руках каменне каштоўнае. Як простыя людзі. А ў простых людзей, у сялян-беларусаў шмат стагоддзяў таму з'явіліся на стале і відэльцы.

Маці і старэйшыя аднавяскоўцы ўспаміналі, што ў пасляваненны час — калі не хапала нічога: ад запалак і солі да адзення і абутку, а вось ежа нейкая вадзілася — дэфіцытам былі і відэльцы. Прыстасаваліся адліваць іх з алюмінію, якога ў тыя часы хапала — ад збітых самалётаў, ад іншага пашкоджанага ваеннага рыштунку. Выраблялі ў гліне форму, расплаўлялі метал, вылівалі не зусім прыгожыя, але прыдатныя для паўсядзённага карыстання прылады. Абы было іх у нешта ўваткнуць.

Адзін такі забыты самаробны відэлец знайшоў яшчэ школьнікам на гарышчы бацькоўскай хаты. Гнуўся ён вельмі лёгка, ды і зламаўся потым. У тыя часы на стале ўжо былі відэльцы таксама з алюмінію, але фабрычнай вытворчасці, больш цвёрдыя, з дабаўленнем нейкага металу. Потым прыйшлі часы металічнага посуду, нержавейкі. А ў сямідзясятыя гады гаспадыні ўжо стараліся, каб дзе-небудзь па знаёмстве знайсці мельхіёравыя лыжкі, нажы ды відэльцы. Гэта было піскам моды. Сёння ў багатых свая мода, свой посуд на стале. А разам з тым вельмі часта перавага аддаецца аднаразоваму посуду, дзе і відэлец — з пластмасы, служыць адзін раз.

У час вайсковай службы я, як і іншыя салдаты нашай часці, меў адносіны толькі з лыжкай, якая насілася за халявай бота. Відэльцы ні ў салдацкай сталовай, ні ў салдацкім рыштунку — кацялок, лыжка, кружка — прадугледжаныя не былі. Ды і есці імі не было чаго. Як правіла, на першае падавалася альбо капуста, альбо нейкі суп, а на другое — каша, да якой калі рыба, а калі кавалак мяса, дакладней, добра калі масёл, які можна было абгрызці, а то і проста кавалак варанага сала, якое елася толькі на пачатку службы і то з вялікай галадухі. Было гэта ў пачатку сямідзясятых, кармілі пяхоту слабавата, толькі на вучэннях мы вылоўлівалі ў кашы тушонку. Дастаткова сказаць, што за два гады службы мы з'ядалі дзве катлеціны — на 7 лістапада, дзень Вялікага Кастрычніка.

Відэлец можа стаць і халоднай зброяй. Як некалі казалі: «Два ўдары — восем дзюрак».

І на завяршэнне ўсміхнёмся. Помніце, класічны фільм «Вясёлыя рабяты»? Статак хатняй жывёлы прарываецца ў маёнтак, дзе сабраліся госці. Парсючок, пабаляваўшы на святочным стале, кладзецца на вялізную талерку. Заходзіць слепаваты госць. Налівае сабе чарачку, бачыць парсючка. Перчыць яму бачок, бярэ — па правілах — у правую руку нож, у левую відэлец. І ўтыкае яго ў парсючка...

Алесь КАСЦЕНЬ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.09	16.35	8.26
Віцебск —	8.04	16.19	8.15
Магілёў —	7.59	16.25	8.26
Гомель —	7.49	16.28	8.39
Гродна —	8.23	16.51	8.28
Брэст —	8.17	16.58	8.41

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра.*
К. *Мілены, Эрыкі, Фелікса, Францішка, Цімафея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+3..+5°С	КІЕЎ	+3..+5°С	РЫГА	-1..+1°С
ВІЛЬНЮС	0..+2°С	МАСКВА	+1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-2..0°С

Дзве даты

24 студзеня

1102 год — паводле звестак В. Тацішчава, полацкім князем Барысам Усяслававічам заснаваны горад Барысаў. У Іпацьеўскім летапісе горад упершыню згадваецца ў 1128 годзе. Археалагічныя даследаванні паказалі, што горад заснаваны на месцы пасёлка Стара-Барысаў (тут захавалася гарадзішча і селішча), пазней перанесены да месца зліцця рэк Схі і Бярэзіны — на месца сучаснага Барысава.

1924 год — у Шамані (Францыя) адкрыліся першыя зімовыя Алімпійскія гульні (МАК не прызнаваў іх такімі да 1925 года, таму афіцыйна яны называліся Зімовым спартыўным тыднем).

Цытата дня

«Людзі заўсёды схільныя верыць не таму, што даказальна, а таму, што ім больш па густу».

Блез Паскаль (1623—1662), французскі вучоны.

25 СТУДЗЕНЯ — ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ

Амаль што кожны дзень у беларускім народным календары меў уласнае імя. Гэта імёны тых хрысціянскіх святых, якія ўшаноўваюцца менавіта ў гэты дзень. Так, 25 студзеня сталі называць у гонар святой Таццяны. З цягам часу гістарычныя падзеі гэтага дня надалі яму новыя рысы.

● Справа ў тым, што менавіта ў гэты дзень (12 студзеня па ст.ст) 1755 г. імператрыца Расійскай дзяржавы Елізавета Пятроўна падпісала загад аб заснаванні Маскоўскага ўніверсітэта. У імя святой мучаніцы Таццяны быў асвечаны і ўніверсітэцкі храм. Так святая Таццяна стала заступніцай Маскоўскага ўніверсітэта, а з цягам часу святая Таццяна стала заступніцай усіх тых, хто вучыцца.

● У гэты дзень студэнцкая моладзь прыходзіла ў храм, каб паставіць свечкі за поспехі ў вучобе.

● Святая пакутніца Таццяна (226—235 г.г.) нарадзілася ў Рыме ў знатнай сям'і, калі хрысціянства не было прызнана афіцыйна і праследавалася ўладамі. Бацька, знатны саноўнік, і яго дачка тайна прынялі хрысціянства. Дасягнуўшы паўналецця, Таццяна не ўзяла шлюб, а ўсе сілы аддала Царкве. Яна была пастаўлена дыяканіхай у адным з рымскіх храмаў, выглядала за хворымі і дапамагала тым, хто жыве ў нястачы і галечы. Працаўнікамі Царквы Таццяна была схоплена і жорстка закатавана. Аднак цяжкія пакуты ці не наносілі ёй шкоды, ці за ноч сляды ад іх знікалі, ці самі пакутнікі цярпелі ад удараў, якія наносіла нябачная рука. Карнікі, здзіўленыя трывалаcцю Таццяны, самі звярталіся да Хрыста, прымалі хрысціянства, пераўтвараліся з карнікаў у хаўрыч. А Таццяну працягвалі жорстка катаваць: выкалалі ёй вочы, білі, аднойчы выпускалі на яе галоднага льва, але ён толькі пакорна лізаў ёй ногі. Таццяну вырашылі спаліць, але і полымя не пашкодзіла яе. Тады яе пазбавілі галавы. У той жа дзень забілі яе бацьку. Подзвіг пакутніцы звярнуў да веры шмат людзей.

● А яшчэ ў гэты дзень назіралі за станам надвор'я. Было заўважана: Снегапад на Таццяну — дажджлівае лета.

На Таццяну марозна і неба яснае — да ўраджаю.

Калі ў гэты дзень сонечна — рана прыляцяць птушкі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

У жонкі праграміста пытаюцца:

— А як ён да цябе заляцаўся?

Жонка, пасля хвіліннага роздуму:

— Ну-у, камп'ютар паказаў...

☺

Вы здолелі прымусіць сябе спыніцца грызці семачкі, калі іх яшчэ заставалася паўталеркі, — гераінавая залежнасць для вас не страшная.

☺

— А чаму пад градусам дзяўчаты здаюцца прыгажэйшымі?

— Арганізм думае, што яго атруцілі і спрабуе тэрмінова працягнуць свой род.

☺

Муж, у якога жонка адбірае зарплату — слабак, які аддае сам — сапраўдны мужчына.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізнятам — не паддавацца эмоцыям, а Шалям — добрасумленна папрацаваць

ВАЕН. У вас атрымаецца сур'ёзна дапамагчы сваякам. У чацвер верагодныя ўскладненні ва ўзаемаадносінах з кіраўніцтвам. Выкрываючы недахопы іншых людзей, памятайце і пра ўласную недасканаласць. Не варта таксама забываць і пра тое, што крытыка павінна быць канструктыўнай.

ЦЯЛЕЦ. Паспрабуйце вучыцца слухаць і чуць навакольных — так вы даведаецеся шмат цікавага і станеце мудрэйшымі. Магчыма паляпшэнне ў прафесійных справах. Спрыяльны час для дзелавых здзяйсненняў. Паспрабуйце па-філасофску паставіцца да ўнутранай напружанасці: яна будзе толькі пабочным эфектам сабранасці, якая спатрэбіцца вам для дасягнення мэтаў.

БЛІЗНЯТЫ. Можаце смела прыступаць да выканання новага праекта, асабліва калі ён абяцае добры прыбытак. Не варта, аднак, ні з кім дзяліцца сваімі планамі. На працы імкніцеся як мага менш трапляцца на вочы начальству, каб на вас не павесілі дадатковыя абавязкі. Не паддавайцеся эмоцыям: пачуцці могуць прымусіць пайсці на цалкам неапраўданую рызыку.

РАК. Рэзка палепшыцца настрой, паднімецца тонус, стане адчувальна больш сілаў, якія будуць патрабаваць выхаду, і ў вас з'явіцца мноства планаў і ідэй. Добры перыяд для новых спраў. Для пачатку засяродзьцеся на чымсьці адным — і вы не выпусціце поспех, які сам ідзе да вас у рукі. Давярайце інтуіцыі ў дзелавых і асабістых пытаннях, калі хочаце пазбегнуць пралікаў.

ЛЕЎ. Вашы поспехі і папулярнасць выклікаюць захапленне і зайздрасць нядобразычліўцаў. На гэтым тыдні верагодна камандзіроўка або далёкая паездка па асабістых справах. У чацвер, апынуўшыся ў цяжкім становішчы, паспрабуйце даверыцца голасу інтуіцыі, а не будаваць лагічныя выкладкі на спрэчнай падставе — так вы з большай верагоднасцю пазбегнеце памылак. Не варта хвалявацца з-за чыёйсьці пустой балбатні.

ДЗЕВА. Сітуацыя будзе складвацца самая спрыяльная — трэба толькі скарыстацца ёю. Смела прыступайце да выканання новага важнага задання і не сумнявайцеся ў поспеху. Тыдзень добра падыходзіць для знаёмстваў і спатканняў, можна рабіць невялікія пакупкі, асабліва — набываць падарункі. У сераду вас будзе чакаць прыемны сюрпрыз.

ШАЛІ. У першую палову тыдня давядзецца добрасумленна папрацаваць, выконваючы пастаўленыя перад сабой задачы. У аўторак шмат часу запатрабуе назапашаная работа. У гэты дзень зможаце завяршыць адразу некалькі важных спраў. Чацвер прысвяціце адпачынку і назапашванню сілаў. Пятніца можа пацешыць цікавымі і важнымі сустрэчамі.

СКАРПІЁН. Не варта занадта шмат расказваць пра сябе — гэтымі звесткамі могуць скарыстацца нядобразычліўцы. У панядзелак званкі, перамовы, лісты дадуць вам шмат інфармацыі, але і запатрабуюць выразнага і паслядоўнага плана дзеянняў — інакш наўрад ці зможаце правільна размеркаваць свае сілы і час паміж справамі. У сярэдзіне тыдня не варта крытыкаваць калегаў па працы або начальніка, а інакш рызыкуеце патрапіць у вельмі непрыемную сітуацыю.

СТРАЛЕЦ. Не зацыклівайцеся на мінулых дасягненнях — сабярыцеся з сіламі і рашуча пераадолейце новую мяжу. За выдатканыя намаганні будзеце ўзнагароджаныя спаўна. Пажадана трымацца далей ад усякіх авантур, звязаных з лёгкім узбагачэннем, а таксама не браць удзел у азартных гульнях. Цяпер у вас можа наступіць адказны перыяд кар'ернага росту і звязаных з ім службовых і матэрыяльных дасягненняў.

КАЗЯРОГ. На гэтым тыдні варта знайсці час для пашырэння сваіх прафесійных ведаў. Кожны новы навык, набыты цяпер, можа быць запатрабаваным у самай блізкай будучыні. Удалы тыдзень для кар'ернага росту, паездак і камандзіровак. Галоўнае — пазбягайце канфліктаў з начальствам. Вас можа падвесці недаверлівасць. У пачатку тыдня паспрабуйце знайсці крышку часу для блізкіх.

ВАДАЛЕЙ. Ініцыятыва і актыўнасць могуць стаць несвоечасовымі, асабліва ў пачатку тыдня. У сераду лепш не плануйце нічога сур'ёзнага. Калі ўзнікне пытанне аб звышвызначанай працы, пажадана не адмаўляцца. Аднак рэальна ацаніць свае магчымасці перш, чым даць згоду, таксама нялішне. Дбайна сачыце за развіццём сітуацыі на працы: не выключана, што вас могуць падставіць.

РЫБЫ. Надыходзіць спрыяльны ў творчым плане тыдзень, калі, вядома, не занадта ленавацца. Усё, што захочаце зрабіць, будзе атрымлівацца досыць лёгка — гэта можа вас нават здзівіць. Магчыма, варта пачаць нешта зусім новае. Не забывайцеся пра дзяцей, асабліва патурбуйцеся пра іх школьныя поспехі.

Віншуем з юбілеем ***Ніну Мікалаеўну КЛЯЦКО*** *з в. Любкаўшчына і з гэтай нагоды пажаданні добрага здароўя, узаемапаразумення, радасці і шчасця.*

Станкевічы.

Шчыра віншую з днём нараджэння ***Віктара ДУДЗІЧА*** *з г.п. Воранава.*

Зычу моцнага здароўя, любові, сямейнага шчасця, поспехаў і дабрабыту ў жыцці.

Цешча.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (20 студзеня). Па гарызанталі: Спадарожнік. Брыдж. Бокс. Дармаед. Кракі. Сцэна. Ганг. Цуг. Бра. Пчаляр. Ніка. Храпка. Пакута. Колі. Лат. Кізіл. Манака. Лава. Мяжа. Акр. Клапан. «Буран». Атака. Сук. Труба. Арала. Касманаўт. **Па вертыкалі:** Месяцаход. Габарыт. Догма. Кілер. Проза. Рыбак. Ліван. Асілак. Аса. Растр. Жарабец. Турак. Одэр. Акула. Індык. Бас. Скапа. Макака. Рада. Наган. НЛА. Калігула. Сіняк. Такса. Грамата. Накаўт.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыёме рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 393. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

У НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАРКУ «ПРЫПЯЦКІ» — НАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР

Вось ужо не думалі мы, што чарговая наша камандзіроўка на Палессе будзе звязана з... паляваннем на ваўкоў. Але як толькі прыехалі ў Нацыянальны парк «Прыпяцкі», генеральны дырэктар яго Сцяпан Бамбіза адразу сказаў: «Хочаце адчуць, хай сабе ў частковай меры, пульс жыцця нашай прыродаахоўнай установы — запрашаю на паляванне. Заўтра яно будзе. На ваўкоў.» Прызнацца шчыра, пра гэта мы нават не марылі. Але ж — прапанова. Ды якая! Пабыць у марозным зімовым лесе, палюбавацца чароўнай прыродай Нацыянальнага парку, сустрэцца (калі пашчасціць) з ляснымі насельнікамі, ды яшчэ ў засадзе на ваўкоў пасядзець — ці кожны месяц такое здараецца? Не, адмаўляцца ад такога запрашэння было б самым сапраўдным грахом. Таму мы згодна і з радасцю заківалі галовамі: едзем!

Пасля ўдалага палявання. Трэці злева генеральны дырэктар Сцяпан БАМБІЗА.

Сляды няпрошаных гасцей

Размова гэта адбывалася вечарам, калі наваколле пакрыла ўжо густая цемра, і Сцяпан Мікалаевіч патлумачыў: сустрэцца днём магчымасці не было. Ён знаходзіўся... на паляванні. Не трэба думаць толькі, што яно мела, скажам так, забаўляльнае адценне, бо заключала ў сабе неабходную патрэбнасць: у сафары (мы потым раскажам, што гэта такое) прабраліся два ваўкі, чаго ніхто не чакаў. Ды і як было чакаць, калі гэты паляўнічы вальер плошчай больш як у чатыры тысячы лясных гектараў абнесены двухметровай агароджай, а сетка-рабіца яшчэ і ў грунт закапаная. Але факт застаецца фактам: няма тых сутак, каб шэрыя разбойнікі не ўчынілі якую шкоду. То алянуху раздзяруць, то лань, то казулю, то дзіка.

Улетку гэта асабліва прыкметна не было. Вясной і восенню таксама: зеляніна дрэў, кустарнікі, зараснікі ды чарнатроп хавалі сляды і патаемныя месцы знаходжання драпежнікаў і рэшткі ахвяраў, а вось калі зямля апынулася пад белай снежнай коўдрай, усё стала навідавоку. Доўгі час у калектыве «Прыпяцкага» не маглі зразумець, як ваўкі здолелі пралезці ў вальер, бо не мелі магчымасці ні пракрасціся праз вароты, ні пераскочыць праз агароджу, ні падкапацца пад яе. Тым не менеў у 2007 годзе ў сафары было забіта два ваўкі. І вось яны зноў разбойнічаюць тут. Сталоўку добрую знайшлі, бо капытных жывёлін процьма. Як ім ад іх уратавацца? Надзея толькі на чалавека.

Таму, як толькі на снезе былі выяўлены сляды няпрошаных «агрэсараў» і косці загінулых ад іхніх клыкоў жывёлін, былі арганізаваны брыгады для адстрэлу ваўкоў. Тыя адразу сцямілі, што давядзецца згубіць скуру і напрасткі ірванулі ў тры месцы агароджы. Падкрэсліваем: не беглі па яе перыметры, а напрасткі ляцелі. І там адчайна ўгрызаліся ў сетку-рабіцу, дошкі і ў лёд. Вось тут, кажа Сцяпан Мікалаевіч, і разгадка знайшлася, у тых месцах праходзілі меліярацыйныя каналы, і сетка-рабіца не даходзіла да дна. Ваўкі (во дадумаліся!) паднырнулі пад агароджу — і ў «сталоўку». А тут цёскануліся маразы, пачаліся аблавы на шэрых, і драпежнікі, адчуўшы, што яны апынуліся ў замкнёнай прасторы, адкулі пралазаў няма, спадзяваліся на выратаванне праз тыя месцы, праз якія яны трапілі на тэрыторыю вальера.

Толькі ўсё дарэмна. Тады, добра падсілкаваўшыся падсвінкам ці казуляй, яны затойваліся ў якім гушчары ці балоце. І паспрабуй іх адтуль выгнаць, бо трэба ж перш-наперш выявіць месца знаходжання разбойнікаў. Паляўнічыя ведалі больш верагодныя тыя месцы і да нашага прыезду пяць дзён абкладвалі адзін квартал за другім. І што ж? Пакуль што безвынікова. То ваўкоў у іх не было, то, нібы маланка прамільгнуць яны паміж дрэў, то, як кажа Сцяпан Мікалаевіч, дым густы — абед пусты. Што азначае: нехта з паляўнічых прамазаў. Праўда, адзін раз зарад трапіў у ваўка. Аднак звяруга знік, пакінуўшы на снезе кроплі крыві.

— Так што будзьце заўтра гатовыя, — завяршыў свой аповед генеральны дырэктар.

— Заўжды гатовыя! — па-піянерску адказалі мы і аптымістычна, па-камсамольску, дадалі: — З намі пашанцуе, у нас нюх і вока — ого-го!

— Пабачым, — усміхнуўся Сцяпан Мікалаевіч.

Крыху гісторыі

Пра ваўкоў можна гаварыць доўга, цікава і, напэўна, без асаблівай радасці, хоць яны з'яўляюцца ляснымі санітарамі. Слоў няма, прырода адвяла ім сваё месца ў ёй, але вось кантраляваць іхнія дзеянні самой ёй не пад сілу. І крыважэрнасць гэтых звяроў такая, што яны могуць вынішчыць усё жывое.

Што датычыцца Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», дык гісторыя ўзнікнення яго наступная. У 1969 годзе, згодна з адпаведнай пастановай Савета Міністраў БССР быў створаны Прыпяцкі Дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік, які ўваходзіў у склад Міністэрства лясной гаспадаркі. Пасля яго перадавалі ў распараджэнне Дзяржаўнага камітэта па экалогіі рэспублікі, Кіраўніцтва справамі Савета Міністраў Беларусі. Калі адбыўся ў 1986 годзе выбух на Чарнобыльскай АЭС, барацьба з ваўкамі вялася доўгі час, як кажуць у народзе, цераз пень-калоду, і яны непамерна распладзіліся.

У 1994 годзе запаведнік плошчай 65 050 гектараў быў перададзены ў распараджэнне Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а ў наступным годзе пры ім была створана эксперыментальная лесапаляўнічая гаспадарка «Ляскавічы». Яшчэ праз год ён быў рэарганізаваны ў Нацыянальны парк «Прыпяцкі», у якім для жывёльнага свету былі створаны ўмовы, непараўнальныя з ранейшымі. Дык вось, сюды і зачасцілі ваўкі з чарнобыльскай зоны, іншых рэгіёнаў, нават з Украіны і Віцебшчыны, бо капытных тут значна пабольшала з-за добрай кармавой базы. Драпежнікам спрыялі і бясснежныя зімы на Палессі, таму шэрыя разбойнікі так расперазаліся, што колькасць безабароннай лясной жывёлы пачала скарачацца, і ў парку аб'явілі ваўкам вайну. Дастаткова сказаць, што на працягу пяці апошніх гадоў паляўнічыя здабывалі іх тут да трыццаці і болей. Сёння ж назіраюцца зграі драпежнікаў па 10—12 у кожнай. Летась у парку было адстрэлена 7 ваўкоў, а гэтай зімой — 3.

Сцяпан Мікалаевіч казаў, што ў адзін год было знішчана 25 ваўкоў, сярод якіх аказалася 19 мацёрых самак. Уяўляеце, якая б успышка магла здарыцца ў воўчых зграях пасля вяселляў шэрых разбойнікаў. Прыкмечана таксама, што калі пагалоўе ваўкоў змяншаецца, дык у тых зграях нараджаецца большая колькасць «дзяўчатак». Так што ваўчыны род, асабліва нашай лясістай мясцовасці, са свету, напэўна, не зжывеш. А сам ён сябе, вядома ж, не вынішчыць. А вось іншую жывёліну, калі чалавеку не зрабіць адпаведныя захады, цалкам магчыма.

Беларускае сафары

Назаўтра ўранку мы апрануліся ў выдзеленыя нам цёплыя куртки, гэткія ж валёнкі, якія абцягваліся гумавымі ботамі. Адзін з нас папрасіў для сябе дадаткова і штаны-ватоўку. Усё! Можна ў шлях-дарогу. Едзем. Сцяпан Мікалаевіч знаёміць нас з гісторыяй стварэння парку-сафары. Падобных у Беларусі, ды і не толькі ў ёй, няма.

Дык вось, названым словам «сафары» паўтара стагоддзя таму, а можа і раней, называліся экзатычныя падарожжы ў не менш экзатычныя (Афрыка і г.д.) краіны з паглыбленым вывучэннем фаўны і флоры, ды і наогул усёй прыроды, а таксама паляваннем на львоў, леапардаў, тыграў, іншых буйных драпежнікаў, слоноў і г.д. Ці ж параўноўваецца тая кенійская, скажам, ці танзанійская экзотыка з паляўнічай беларускай на зайца, лісу, ваўка, казулю, хоць і ў ёй у пэўнай ступені прысутнічае дух спаборніцтва і адрэналіну? З цяжкасцю параўноўваецца. Але ці можна паспрабаваць зрабіць так, каб тое паляванне стала прыцягальным не толькі для айчынных аматараў вострых адчуванняў, але і для іншаземцаў?

Вось такой ідэяй і загарэўся генеральны дырэктар «Прыпяцкага» Сцяпан Бамбіза. Ён ведаў, што ў асобных еўрапейскіх краінах меліся паляўнічыя вальеры. Напрыклад, у Аўстрыі яшчэ трыста гадоў таму пры каралеве Марыі-Тэрэзіі быў створаны звярынец, які і сёння мае высокую рэнтабельнасць на двухтысячнагектарнай плошчы. Ім доўгі час валодаў знакаміты род князёў Эстэрхазі, якія доступ у яго для іншаземцаў не адкрывалі. Сцяпану Мікалаевічу ўдалося трапіць туды дзякуючы даўняй дружбе з кіраўніком вальера, калі апошні прадстаўнік роду памёр.

Азнаёміўшыся з дзейнасцю вальера, і было вырашана пайсці ў «Прыпяцкім» па аўстрыйскім прынцыпе: сафары, начное сафары, фотасафары. Арганізацыя паляванне запазычана ў Італіі, а сумяшчэнне лесапаляўнічай гаспадаркі з прыродаахоўнай тэрыторыяй — у Амерыцы.

У гэтым напрамку ўжо многае зроблена. Пакуль што паляўнічых турыстаў туды не пускаюць, і сафары-парк будзе адкрыты ў сёлетнім турыстычным сезоне, калі «Прыпяцкі» будзе адзначаць 40-гадовы юбілей. Сёння тут даволі вялікая шчыльнасць звера: 15 волатаў-зубраў, больш за 20 ласёў, 400 аленяў, каля тысячы дзікоў, сотні казуль, да паўсотні ланяў і г.д. Яны былі паселены сюды для адаптацыі, і ўжо хто-ніхто з іх даў прыплод.

Мясцовасць размяшчэння паляўнічага вальера падабрана, можна сказаць, ідэальная. Там усе тыпы лясоў — ад верхавых да нізінных. 40 адсоткаў іх займаюць дубровы, і ў падросце шмат дубоў. Праз парк-сафары працякаюць тры рачулкі, ёсць балоты, невялікія азёрцы. Дзікім жывёлам тут рай, бо для іх маюцца кармавыя палі плошчай васемсот гектараў, дзе высяваюцца шматгадовыя травы, сумесь канюшыны і люцэрны для зубра, аленя, лася. Расце тапінамбур.

А паглядзіце, якая разгалінаваная сістэма падкормачных пляцовак, кажа Сцяпан Мікалаевіч. У патрэбных месцах — яслі з сенам, саланцы, бетонныя пліты з кукурузай, буракамі, бульбай і г.д. Падкормкай жывёлы займаюцца два чалавекі, якія сочаць і за яе фізічным станам. Два разы на год жывёла апрацоўваецца прэпаратамі ад гельмінтаў. Якім чынам? Праз кармы, бо вядома ж, напрыклад, што прыплод парасят напалову гіне ад глістоў.

У аснове поспеху — добры корм і селекцыйная работа. Агароджа парку-сафары цягнецца на сорак кіламетраў па перыметры. А ў ім яшчэ ёсць два вальеры. Яны патрэбны для таго, каб паляпшаць трафейныя якасці дзіка. Адзін з тых вальераў — матачнік, куды запускаюцца вылаўленыя ў дзікай прыродзе свінні і вепрукі-секачы. Праз год патомства іх аглядаецца і перамяшчаецца ў іншы вальер, дзе гадуецца і набіраецца росту. Секачы ж выпускаюцца ў агульны парк-сафары. Адначасова ідзе адстрэл аслабленай жывёлы. Кіраўніцтва Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» разумее, што чым болей будзе секачоў, тым большы будзе прыбытак, бо на Захадзе мяса іх вельмі дарагое. У нашай жа краіне культура спажывання яго знаходзіцца яшчэ на нізкім узроўні.

У прынцыпе ў будучыні кіраўніцтва парку «Прыпяцкі» мае намер наладзіць перапрацоўку мяса адстрэленых жывёлін. У задумах таксама — «сасватаць» дзікіх кабаноў з хатнімі свіннямі, чым дасягаецца не толькі хутчэйшы рост прыплоду, але і паляпшаецца якасць мяса. Ужо даўно прыкмечана, што палешукі спецыяльна выганялі свіней у дубровы «на жалуды», і там іх пакрывалі дзікі. У Петрыкаўскім раёне і дагэтуль так робяць жыхары Міхедавічаў, Судзбора, Снядзіна.

Першым, каго заўважылі, відаць, на трэцяй—чацвёртай хвіліне, быў лось. Сахаты за нейкіх семдзесят метраў ад нас выскубваў сена з ясляў і нават вухам не павёў, пазіраючы на людзей. Так і застаўся ён на тым месцы, высокі, прыгожы, з магутнымі рагамі, і, было бачна, добра ўкормлены. Праехалі крыху далей — і вось на табе: адразу ладнага росту тры дзікі ў хмызняку затаіліся. Пачулі нас, на імгненне ўзнялі галовы, а потым так ірванулі са сваёй лежні, толькі снежны пыл за імі закурыў.

Далей — болей: свінаматка з чатырма парасятамі пабегла. А потым метраў за трыццаць ад нас тры алені-рагачы (пышныя такія кароны на галовах) ласаваліся са стажка з сенам. Скубуць сабе і ўсё: здаецца, аніякай увагі да нас. І толькі калі Сцяпан Мікалаевіч выйшаў з аўтамашыны, каб узяць іх на фотакамеру, яны (адзін з іх пакульгваў) крокаў за сем адышлі і спакойна сабе сталі. Яшчэ адзін кабан. Ды які — пудоў на дванаццаць сякач. Пад паваленай асінай, вяршыня якой метры на тры вісела над зямлёй, хаваўся. Чорная шчотка-поўсць уздыбленая, нездавальнанне, відаць, ён выказвае гэтым: маўляў, што трэба? Без ахвоты паплёўся ў гушчар.

А вось некалькі лежняў кабаноў. У адным месцы нават пара ўзнімалася з зямлі ад таго лежбішча. Мы толькі паспелі заўважыць, як удалечыні прамільгнуў статак дзікоў, не перабольшваючы, галоў на 20—30. А адзін ладны такі кабан-адзіночка нават здзівіў нас. Стаяў ён метраў за 35 ад нас на бетоннай пліце так нерухома хвіліны тры, што мы падумалі: скульптура. Але вось варухнуўся, павярнуўся бокам: фатаграфуйце, маўляў. Калі ж нашы фотакарэспандэнтка выйшла з машыны з прыгатаванай апаратурай, дзік пасунуўся насустрач і стаў да яе ў анфас. Напэўна, хворы, сказалі мы ўголас. І толькі тады дзік сігануў прэч.

Едзем далей. Спыняемся каля крытага аўтамабіля. За адным дрэвам, нібы зліўся з ім, паляўнічы са стрэльбай у руках, далей, за лазовым плятнём, прытаіўся яшчэ адзін. Сцяпан Мікалаевіч тлумачыць нам, што «працэс» ужо ідзе. Брыгада пачала паляванне на ваўкоў метадам загону. Група людзей з вызначанага месца, падаючы голас або пастукваючы палкамі па ствалах дрэў, ідзе па лесе, а другая, у іншым ужо месцы, са стрэльбамі і карабінамі чакае выхаду звера.

Афіцыянт-бармен Ірына АСКЕРА.

Паляванне

Праз вароты, якія заўсёды знаходзяцца на замку, уязджаем у паляўнічы вальер. Дзянёк выдатны: сонечны, з 20-градусным марозам і амаль што бязветраны. Лес стаіць сцяною ў маўклівым задуменні. Скрозь у іскрыстых сняжынках, якія раз-пораз у вольным палёце падаюць з дрэў долу. Дзе-нідзе вывернутая з каранямі сасна, сагнутая ў дугу маладая бераставая бярозка, зараснікі стройнага чароту, вербалозны гушчар, прыціснуты гурамі снегу так, што здаецца, па ім просіцца прайсціся рука дрывасека. Ды толькі ніхто на гэта тут не адважыцца: у Нацыянальным парку павінна быць не штучная прыгажосць, а натуральная. Што стварыла прырода, тое няхай і застаецца. Экасістэма. І гэтым усё сказана.

Сядзім, назіраем. Вось недалёка ад нас прабегла ліса, на хвіліну спыніўшыся ў роздуме на дарозе, вось праскочыў невялікі дзік. І раптам заўважаем, як за метраў дзевяноста паміж дрэвамі і кустоўем агромністымі скачкамі прамчаў воўк. Мы бачылі яго менш за секунду. І чакалі стрэлу. Але не дачакаліся. Хітры звер ці то праскочыў паміж нумарамі (паляўнічымі), ці то павярнуў назад, адкуль ужо пайшлі загоншчыкі.

Прамашку далі, сабраўшы паляўнічых, зрабіў аналіз сітуацыі Сцяпан Мікалаевіч. Загоншчыкі гналі яго супраць ветру, сказаў ён, чаго не павінна было быць. Да таго ж і дыстанцыя паміж імі не захоўвалася. Ды належнага напору іхняга не было. Таму звер, першапачаткова выйшаўшы на нумары і ўнюхаўшы іх, пабег назад, дзе, мяркуючы па ўсім, і залёг.

Атрымаўшы інструкцыю, як дзейнічаць далей, брыгада рушыла ў іншы квартал. Адзін з нас таксама стаяў на нумары побач з галоўным інжынерам установы хвілін пяцьдзясят, а то і гадзіну. У балоце, якое падмерзла, але дзе-нідзе яшчэ прасочвалася вада. Варухнуцца нельга, перамоў ніякіх. І кашляноць небяспечна, бо ўся справа калектыву ў глум пайсці можа, калі воўк учуе цябе. Мароз працяснуўся ў рукавіцы, валёнкі, шчыпаў за твар. Ды нічога, вытрымалі. Аднак вынік і на гэты раз не парадаваў. Ваўка ў тым квартале не аказалася.

Не будзем апісваць наступныя захады паляўнічых, бо яны падобныя па сваёй тактыцы, але скажам, што адзін з іх нарэшце прынёс удачу. Звяруга, уцякаючы, прабягаў непадалёк ад Сцяпана Мікалаевіча і трапіў пад прыцэл яго карабіна. А ў тым загоне на яго выйшлі яшчэ два ласі, тры секачы, статак кабаноў у некалькі галоў і сем алянух. Каля іх не было ніводнага цяляці. Хутчэй за ўсё, яны сталі лёгкай здабычай драпежнікаў. Ды нічога, запэўніў Сцяпан Мікалаевіч, разбяромся з імі. Нікуды яны не падзенуцца. Забягаючы наперад скажам, што праз некалькі дзён быў адстрэлены і другі воўк.

Генеральны дырэктар. Дыялог

Сцяпан Бамбіза — мясцовы жыхар, з Ляскавічаў, што ў Петрыкаўскім раёне. Жыццё яго продкаў было звязана з лесам, Прыпяццю, паляваннем ды рыбалоўствам. Бацька, дзядзькі, дзед, прадзеды ішлі па лясной галіне. Адна з палян і цяпер называецца Бамбізавай. Сцяпана-школьніка ў лес вывела стрэльба. Ён памятае, як дзядуля, даўшы яму яе, толькі ўсміхнуўся, калі прыкладам стукала хлапчука па шчыкалатках, і прыгадвае, што калі вучні-старшакласнікі перавагу аддавалі розным гульням, дык ён разам са сваім сябрам Колем Найдзінавым (той цяпер егерам працуе) — лесу, што, аднак, не перашкаджала вучобе.

Таму, закончыўшы школу і адпрацаваўшы колькі часу ў мясцовых лясніцтвах і лесаўпарадкавальнай экспедыцыі, паступіў у Львоўскі лесатэхнічны інстытут. Шэсць гадоў працаваў ва Украіне і вярнуўся потым у родныя мясціны, на Гомельшчыну. Спачатку гэта быў Хойніцкі раён, затым свой, Петрыкаўскі. У лясной галіне ён прайшоў усе службовыя прыступкі. Быў дырэктарам-арганізатарам лесапаляўнічай гаспадаркі і вось ужо дзесяць гадоў узначальвае Нацыянальны парк «Прыпяцкі».

— Сцяпан Мікалаевіч, нам здаецца, што воўк невыпадкова выйшаў на вас. Бо правільна ў народзе кажуць, што на лаўца і звер бяжыць..

— Ды што вы *(смяецца)*. Тут не ўгадаеш, на каго ён выбегчы можа. Галоўнае ж, не прамазаць. Вунь і немец, што палюе ў Хлупінскай Будзе (гэта адзін з турыстычных комплексаў нашага Нацыянальнага парку) забіў ваўка. Праўда, яму было прасцей. Сядзеў ён на вышцы і чакаў дзіка, а тут — воўк. Радасць замежніка была такой, што цалаваў трафей.

— А ў Германіі, што, ваўкоў няма, калі прыязджаюць адтуль да нас на паляванне?

— Усякага звера, і не толькі ў Германіі, хапае, а вось ваўкоў няма. Таму яны і кажуць нам, што не трэба іх забіваць. А мы ім у адказ: «Давайце адловім іх разам і распладзіце іх у сябе столькі, колькі гэтых звяроў у нас». Ды не хочуць.

— Напэўна, не толькі немцы прыязджаюць да вас?

— Вядома ж. Справа ў тым, што Нацыянальны парк «Прыпяцкі» — ўнікальны па сваёй прыродзе, культуры і гістарычнай спадчыне. І гэта — галоўная прычына вялікага патоку сюды турыстаў з шэрагу краін — Расіі, Францыі, Англіі, Аўстрыі, Бельгіі, Галандыі, Прыбалтыкі і нават Амерыкі...

Парк, як вядома, размяшчаецца на тэрыторыі Петрыкаўскага, Лельчыцкага і Жыткавіцкага раёнаў і займае плошчу 189 850 гектараў, некаторыя іншаземныя тураператары лічаць, што аналагаў яму ў свеце няма. Нашы лясы ўнікальныя для ўсёй Усходне-Еўрапейскай раўніны і куды ў большай ступені захаваліся ў параўнанні з іншымі лясамі басейна Прыпяці і Дняпра. Дарэчы, лясы займаюць у парку 80 працэнтаў яго плошчы. А ўзяць пераходныя і верхавыя балоты, плошча якіх складае каля 30 тысяч гектараў. Гэта найбуйнейшы ў Еўропе масіў падобнага тыпу.

Фаўна — гэта 51 від звяроў, 7 — рэптылій, 11 — амфібій, 37 — рыбы, больш за 250 — птушак, 3300 — беспазванковых жывёлін, 46 з якіх уключаны ў Чырвоную кнігу. Дарэчы, у яе ж занесена і 74 віды пазванковых, такіх, скажам, як зубр, рысь, шэры журавель, чорны бусел, арэшнікавая соня і г.д.

А флору па сваёй разнастайнасці параўноўваюць з вядомым нацыянальным амерыканскім паркам «Everqlases». Яна прадстаўлена 929 відамі вышэйшых раслін, у тым ліку 22 — дрэў, 32 — кустоўя, 196 — моху, 184 — лішайнікаў і 321 — водарасцяў. 38 занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, бо з'яўляюцца рэліктавымі.

— Усё, напэўна, Сцяпан Мікалаевіч, і вабіць да вас турыстаў?

— Адны хочуць адпачыць на прыродзе, адгарадзіўшыся ад гарадскога тлуму, адчуць асалоду адзіноты на Прыпяці, дзе можна добра парыбачыць, другія — наведаць са стрэльбай ці карабінам лясны масіў і ўпаляваць звера, трэція — знаёміцца з жыццём палешукоў, гісторыяй краю і г.д. Мне часам даводзіцца гутарыць з іншаземцамі. І яны адзначаюць шчырасць нашых людзей, ізнюю добрыню. Адзін немец, напрыклад, сказаў, і я гэта добра запомніў, наступнае. Яго маці, калі хто прыходзіў да іх у госці, на стол не выстаўляла лепшыя стравы, а ў вас, беларусаў, усё наадварот. Прыемна было чуць такое.

— Нам, Сцяпан Мікалаевіч, давялося сустрэцца з трыма масквічамі: Вольгай, Паўлам Саенкам і Аляксандрам. Першыя двое адпачываюць у вашым турыстычным комплексе ўжо чацвёрты раз і загітавалі Аляксандра, які прыехаў другі раз. Дык яны ў захапленні і ад рыбалкі, і ад паляванння, і ад кухні, і ад многага іншага.

— Для нас у гэтым нічога дзіўнага няма. Мы робім усё, каб турыстам было камфортна, зручна. Да Новага года, напрыклад, усе турыстычныя комплексы былі цалкам запоўнены. А наогул Нацыянальны парк «Прыпяцкі» прапануе турыстам аднадзённыя і двухдзённыя туры з наведваннем музея прыроды, экалагічных сцежак, водныя туры на цеплаходах з арганізацыяй рыбалкі, пікнікоў на ўлонні прыроды з юшкай і шашлыкамі. Арганізоўваем і спецыяльныя туры да дзесяці дзён з гарантаваным паказам у вясенне-летні перыяд 120—140 відаў птушак, знаёмім турыстаў з гістарычнай і культурнай спадчынай, народнымі промысламі і традыцыямі Палесся. Запрашаем прыязджаць да нас у любую пару года. Ніхто не пашкадуе.

Матэрыял падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, Уладзімір ПЕРНІКАЎ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

Дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «ПРЫПЯЦКІ».
247946, Рэспубліка Беларусь, Гомельская вобласць, Петрыкаўскі раён, в. Ляскавічы.
www.npp.by. Тэл./факс: 8 (02350) 98 4 96, 8 (02350) 5 10 42.
Ліцэнзія на права ажыццяўлення турыстычнай дзейнасці; 02310/0277817, прадоўжана Міністэрствам спорту і турызму на падставе рашэння ад 27.03.2006 г. № 239 тэрмінам на 5 гадоў да 27.03.2011 г. УНП 400050258.

Намеснік генеральнага дырэктара Вольга ПРЫХОДЗЬКА.